Як жа іначай ішла ўборка сена на забалочаных месцах. Тут часта па калені ў вадзе стаяў касяр і касіў, а жанчыны граблямі выцягалі на сухое месца, накладвалі ў так званыя рэзкі і выносілі на плячах праз раку і тут складвалі на вялікую купу. Сена было мокрае, па плячах і спіне цякла ржавая вада. Калі хто меў чован, то карыстаўся ім. А некаторыя запрагалі каня, але то было рызыкоўна, бо конь дрэнна ходзіць па балоце. Я добра памятаю, як Габрэль Данілюк зарызыкаваў запрэгчы пярэстага як карова каня. Конь гэты хоць быў вялікі і моцны, ўграз і лёг у балота і пакуль адсупонілі хамут, каб выпрагчы, конь разы два штурхануў мордай у балота і тут жа ўтапіўся. Ужо нежывога перацягнулі праз раку на высокі бераг. Паляжаў нейкі час, пасля тут жа закапалі разам са скурай. Ніхто не хацеў здымаць шкуры, бо баяўся каб не празвалі гіцлем.

Цяжкая і няўдзячная была праца на забалочаных месцах. Немала паплакалі жанчыны над гэтым канём і горкай мужыцкай доляй. Конь сваім выглядам наводзіў нейкі сум на ўсіх прысутных.

Калісь, у міжваенны час я быў дэлегатам ад Гміны Пасынкі да Павятовага Сэйміку. Тут Стараста прозвішчам Бараноўскі запрапанаваў, каб зрабіць рэгуляцыю ракі Арлянкі. Я добра ведаў, якое значэнне магла мець асушка забалочаных сенакосаў і галасаваў за рэгуляцыю. Шмат меў непрыемнасці, бо некаторыя сяляне не разумелі справы і казалі – калі ўхваліў то ідзі і капай гэтую новую раку. Але лянівых змусілі да гэтай работы. Калі ўрэгулявалі Арлянку, то другая меншая рэчка Бялка, сама па сабе дзесь падзелася. Цяпер суха. Зусім іншае расце сена і не называюць працы як калісь пэклом.

Прыпамінаю яшчэ і такі прыклад. Як толькі савецкая армія прагнала



ў 1944 г. немцаў за Буг, я з Расіі прыехаў у сваю родную вёску Кнаразы, бо як кажуць: *свая хатка як родная матка.* Тут я спаткаў свайго старэйшага калегу Адольфа Прэсняка, які і цяпер жыве і працуе ў Падлясскіх Закладах Рашарнічых ў Бельску. У кароткай размове з ім я даведаўся, што немцы па магазынах каля таварнай станцыі Бельск мелі аграмадныя запасы штучных угнаенняў. Сам магазін быў разбіты, але навозы былі цэлыя. Я спытаў Прэсняка, да каго яны належаць і якім спосабам можна іх забраць. Ён сказаў, што пакуль яны безпанскія. Аб гэтым я расказаў кнаразоўцам і падгаварыў іх, каб ехалі і забіралі. Шмат разумнейшыя сяляне адразу паехалі і цэлыя фуры прывязлі раз, пасля другі раз, а нават трэці раз. Сенакосы на *Зарэччу* былі па дарозе з Бельска да Кнаразоў. Фуры з угнаеннямі заязджалі на сенакосы і кожны на сваю калёнію, не шкадуючы – сыпаў іх проста шуфляй.

Было гэта пад канец лета. Якое жа тады было здзіўленне, калі на другі год стала тут шпарка расці буйная трава, а на ненавожаных дзялянках, як адрэзана, трава была вельмі малая. Тут ужо людзі пераканаліся, што штучныя ўгнаенні даюць вялікую карысць і то не на адзін год. Сталі пасля араць кожны сваю частку і засяваць насеннем розных траў, такіх як купкоўка, канюшына, райграс ангельскі, тымафееўка ці іншыя. Трава цяпер расла так, што касілка не магла касіць. Трэба было касіць касою. Сталі накошваць сена па 8 і больш цэнтнераў з кожнага гектара.

Пасля зрабілі мост праз раку Арлянку. Парабілі вадзяныя запоры і калі трэба затрымліваюць ваду, каб не надта перасыхаў сенакос. А калісь былі і такія выпадкі, што скошанае сена вада забірала аж да ракі Нарвы, а далей разам з Бугам і Віслай да Балтыку.

Калі мова аб Зарэччы, трэба сказаць, што калісь на сенакосах вада была з нейкай ржаўчынай, а калі капалі новую раку, то пападаліся надта цвёрдыя, як скала кускі. Ці няма тут на значнай глыбіні так патрэбнай цяпер жалезнае руды?

Па другі бок ракі Арлянкі ёсць таксама сенакосы, які называюцца: *Мутвіця, Дубно, Багно, Пэльное, Загрудье, Болотэчко.* Усе гэтыя сенакосы таксама былі вельмі забалочаныя. Але калі ўрэгулявалі Арлянку і выкапалі ў некаторых месцах дадатковыя канавы, якімі лішняя вада сплывала да Арлянкі, то гэтыя ўсе сенакосы таксама асушыліся і цяпер усюды можна не толькі ехаць канём з возам, а смела ходзяць трактары і заворваюць застарэлую дарніну, а засяваецца культурнае насенне розных траў.

Калі стала больш пашы, людзі сталі трымаць больш кароў, авец, свіней і розных птушак. Больш было натуральнага хлеўнага навозу, каторы вывазіўся на палі. Палі сталі даваць лепшыя ўраджаі. Сталі засяваць больш карысныя новыя расліны, як на пясчаных палях – сэрадэлю, на мацнейшых – канюшыну, а нават люцэрну. Сталі сеяць лубін на зялёнае ўгнаенне і лубін салодкі на пашу. Сеюць многа цукровых і поўцукровых буракоў, морквы, бруквы, дыні і кукурузы. Каровы сталі даваць два разы больш малака. Ураджай настолькі падняўся, што напрыклад у 1965 г. толькі палавіну збожжа можна было памясціць у стадолах, у якіх калісь і да палавіны стадолы не было чым залажыць.

Цяпер вельмі многа сталі садзіць картофлі і карміць свіней для сябе, для дзяржавы па кантрактацыі. Шмат чаго больш можна было б зрабіць, каб яшчэ падняць ураджай з палёў. Маю тут на думцы ўжыванне торфу, якога ў Кнаразах ці Плёсках ёсць пад дастаткам. З яго можна рабіць кампосты ў мяшанцы з навозам натуральным, з фекальямі з адхожых месц

ці паліваць гнаёўкай. Вельмі добра было б даваць сухі парашкаваты торф проста да хлява на падсцілку, разам з невялікай доляй пацятай на 5-10 см саломы.

Мае ўспаміны

Чалавек заўсёды заняты думкамі, што і як будзе ў далейшай будучыні. Ці лёс яго жыцця будзе лепшы ці горшы, а яшчэ больш яго цікавіць, як было даўней? Як жылі людзі? Як выглядаў краявід? Якія былі вераванні? Як здабывалі сабе яду? Якія найбольшыя звяры жылі ў даўнейшы час у нашых лясах і г.д.

Людзей, якія апісваюць даўнейшае жыццё называюць гісторыкамі, а самую навуку – Гісторыяй. Першым летапісцам – гісторыкам славянскім быў Нестар. Працу яго наступныя пакаленні добра ацанілі, бо сапраўды добра было б ведаць як гэта было даўней, як жылі людзі ў прымітыўных умовах? Як паўстала вёска Кназазы? Якімі этапамі пасоўваліся да новай тэхнікі, да лепшага жыцця?

Імя маё таксама Нестар. Але не таму, што мне дадзена імя таго вялікага гісторыка, а проста таму, што нягледзячы на тры войны і вялікія завірухі, давялося мне дажыць да глыбокай старасці 81 гадоў. У сувязі з гэтым рашыў я апісаць усё, што засталося ад наймалодшых гадоў ў маёй памяці і што можа, ці то у большай, ці то ў меншай меры зацікавіць наступнае пакаленне людзей.

Калі я нарадзіўся гэтага запраўды не памятаю. Ведаю толькі са слоў маёй маці і з запісаў у метрыкальнай кніжцы, што я нарадзіўся 28 лютага 1887 года. Зіма тады была вельмі суровая, як кажуць, лютая. Людзі тады верылі, што калі нованароджанае дзіця памрэ без хрэсту, то яго не хавалі на агульных могілках, а так дзесь пад якім небудзь крыжам пры дарозе. Тут яно нібы плакала, нібы прыходзіла да сваёй маці і прасіла даць яму якое нібудзь імя і ўсё гэта наводзіла нейкі сум не толькі на бацькоў, але і на далейшых ці бліжэйшых суседзяў. Людзі тады цьвёрда верылі ў словы, якія гаварыў свяшчэннік у царкве і ня ґледзячы на снежныя заносы, празмерна сільны мароз і аграмадную завіруху-мяцеліцу, узялі кумоў Лукашыкаву Яўдакіму і Аўсенія Перавоя і першага марца, гэта значыць на другі дзень пасля нараджэння адправілі мяне да хрэсту да бацюшкі ў вёску Пасынкі, на адлегласці 7 вёрст ад Кназазоў. Як пасля расказывала мне мая маці, ўсе былі пераканаы, што мяне не прывязуць жывога, але лічылі, што лепш ахрысціць і пахараніць па хрысціянску на могілках, чым, не дай Божа, яно памерла бы не хрышчанае. Але я быў сынам найбяднейшых бацькоў. Перажыў першую завіруху-мяцеліцу. Вытрымаў, не замёрз і не памёр у дарозе.

На вялікае гора астаўся жывым і пражыў 81 гадоў. За гэты час шмат чаго засталося ў маёй памяці. Калі прывязлі мяне ад бацюшкі, вынялі з пялёнак і некалькіх кажухоў, пахухалі на мяне і палажылі каля маці, якая накарміла мяне груддзю. Пасля палажылі ў плецёную з лазы калыску і моцна калыхалі аж я заснуў. Можа выпілі пры гэтым па чарцы гарэлкі ад шынкара Носкі з карчмы, бо і кумы то памерзлі на такой сцюжы. А пасля, хаця і не памятаю, але ведаю, што спаў нейкі час. Калі прачнуўся, разглядаўся па старой, маленькай хатцы, шукаючы святла ў маленькім акенцы, ці святла ад лучынкі на камінку, ці каганца – маленькага газнічка. Калі чуць падрос, то поўзаў на глінянай падлозе па хаце ў доўгай сарочцы з самадзельнага льнянага палатна. А калі падрос яшчэ крыху, то летам выбягаў на панадворак і забаўляўся са сваімі аднагодкамі ў пясочку. Зімою бегаў у хаце па лаве і ўглядваўся ў вакно, якое

было зарысована прыгожымі марознымі сняжынкамі. Абутку не меў і на панадворак не хадзіў. Часта сядзеў са старшым братам Рыгорам на хлебавой печы. Якіх толькі казёлкаў тут не выраблялі. Але маці гразіла страпкамі ад фартуха, бо баялася, што старая печ можа разваліцца і тады дрыжы ад холаду ў хаце. Такіх прыгожых возікаў на двух ці чатырох калёсіках не было, як не было і розных забавак. Адзінай забаўкай быў буры кот на пячы замест цяперашняга міся, або дваровы сабака, калі ўдасца яму праслізнуцца паміж нагамі, калі хто йдзе са двара да хаты.

Незвычайнае здарэнне

Калі мне было тры з палавінаю гады, памятаю добра, як мая бабулька Зіноўя трымала на руках майго брата Хвэдося. Хвэдось быў молодшы ад мяне на тры гады. Памятаю, што твар у бабулькі быў моцна паморшчаны. На галаве замест хусткі быў з чырвонай. купнай матэрыі чапец з двома рожкамі з пераду, а ззаду нацягаўся аж да шыі як цяперашні берат. Апранута яна была толькі ў адной сарочцы з даўгімі рукавамі і ў андараку. Блюзак тады не насілі; калі трэба было выйсці да людзей, то ў залежнасці ад пагоды надзявалі лёгкую курту без ваты, або кароткую да стану ватоўку. У час марозаў надзявалі доўгі з хвалдамі, з не дубляных авечых скур кажух або таксама з хвалдамі самадзельную суконную чуйку з аксамітным чорным каўняром. Пасля навучыліся перафарбоўваць на колер чырвоны, бо белы быў надта яркі. Другою часткаю вопраткі, у залежнасці ад пары года – летам доўгі саматканы парцяк, а зімою таксама доўгі суконны саян. Абутак быў ў людзей толькі зімою. На штодзень самадзельныя суконныя ці лыковыя лапці і ваўняныя панчохі. Чаравікі або боты былі толькі ад парады да шлюбу, да споведзі ў царкве ці на кірмаш у чацвер да Бельска.

Бабулька мая была гарбатая. Высокага ўзросту, а можа мне так здавалася. Я быў тады вельмі малога ўзросту і каб пагля-дзець у твар бабулькі трэба было моцна задзіраць галаву ўверх. Не моцна я кахаў сваю бабульку, бо яна заўсёды трымала на руках майго малодшага брата Хвэдося, а мяне адпіхала і не хацела ўзяць на рукі, хаця я моцна туліўся да яе.

Добра памятаю нешчаслівы выпадак, калі бабулька раздмухвала выгарнутае з печы ў копку на прыпечку вугалле з жарам з дроў. Тады яшчэ ў вёсцы не ведалі каменнага вугаллю, а нават не ведалі. што ў пячы добра гарыць торф, якога ў Кнаразах вельмі многа. Паставіла яна на разжаранае вугалле чыгун з нейкай стравай, здаецца каплун варыла. Час ад часу падыходзіла да копкі і дзьмухала. Пасля яна ўзяла ўнука Хвэдося, які меў тады роўна поўгода і села на корточках, палажыла дзіця на запек і яшчэ раз падмухала ў вагонь. Вугалле пад чыгуном падтлела і чыгун хілібнуўся на запол бабульцы і на дзіця. Бабулька хутка ўстала і ёй не надта папарыла цела, а дзіця вельмі апарыла. Добра памятаю, як плакаў Хвэдось. Яшчэ лепш памятаю, як плакала бабулька і як плакаў я са старшым братам Рыгорам. Аж прыбеглі людзі. Бацькоў дома не было. Былі дзесьці на рабоце ў полі. Доўга яго лячылі хатнімі лякарствамі, і ён выздаравеў. На шыі і грудзях ўсё жыццё насіў сляды гэтага здарэння.

Выпадак гэты моцна адчула на сябе бабулька і можа ад таго нават хутка памерла. Але не ведаю чаму, самых хаўтураў не памятаю. Вечная памяць бабульцы, можа хутка пабачымся? Пішу аб гэтым здарэнні не таму, што яно можа кагось зацікавіць, хаця падобных выпадкаў і цяпер не мала. А таму, як усе кажуць – дзіця можа памятаць здарэнні толькі ад чатырохгадовага

ўзросту. Добра аднак ведаю, што мне тады было толькі тры гады і шэсць месяцаў.

Калі мне было пяць ці больш гадоў, бацькі пасылалі мяне пасці стадка гусей. Была тады шахаўніца ці т. зв. цераспалосіца палёў. У кожнай гаспадарцы трымалі большае ці меншае стадка гусей у залежнасці, як хто ўмеў хадзіць каля гэтай птушкі. Маці мая папрасіла суседак, дзяўчат ва ўзросце 14 – 15 гадоў, якія таксама паслі свае гусі, каб яны апекаваліся мною і дапамагалі мне пасці гусей. Трэба сказаць, што мае бацькі былі вельмі бедныя, а гэтыя дзяўчаты былі дочкамі багацейшых гаспадароў. Мне маці кожны дзень магла палажыць у маю торбачку толькі кавалак чорнага, жытняга хлеба і грудку таўканіцы з бульбы, ці бутэльку малака. А гэтыя дзяўчаты бралі з сабою яйкі, масла, сыр ці кавалак мяса і пшанічны, пытлёвы белы пірог. Добра памятаю, як гэтыя дзяўчаты, адна перад другою, мною апекаваліся. Дзяліліся са мною больш лакомымі кавалкамі са сваёй торбачкі, забаўляліся са мною, бралі на рукі, клалі на калені, а часам нават моцна прыціскалі да сябе як ляльку, а нават цалавалі. А быў я, як на свой век вельмі малога ўзросту, прыгожым як казалі і гаварлівым хлапчуком. Маці мне часта прыказвала быць прыхільным для ўсіх. Ні з кім не біцца, не ўжываць непрыгожых слоў. Я заўсёды слухаўся маці, а тым больш баяўся бацькі.

Памятаю добра, калі я яшчэ пас гусей, бацька мой паехаў на кірмаш у чацвер да Бельска. дзесьці дастаў шчэнюка, шэрую лысую сучку і прывёз да хаты. Было гэта летам. Угор быў на *Подзубуўлі*. Ніякай шкоды на полі не было. Я пакінуў гусей і прыйшоў да хаты, нібы на абед. Назбіраў старых цвікоў. Узяў малаток, пілачку-нажоўку, сякіх-такіх урэзкаў дошчак, якія знайшоў пад сталярскім варстатам бацькі і давай збіваць буду для гэтай сучкі. Так захапляўся гэтай працай, што хутка ўжо стала заходзіць сонца. Я пайшоў па гусі. каб прыгнаць дамоў і застыў. Заставіў іх каля крыніцы, дзе стаяла карыта і дзе з крыніцы вядром чарпалі і налівалі воду для гусей. Я не накрыў крыніцы, а было надта горача. Гусяняты былі яшчэ не абросшыя пер'ем, паўлазілі ў самую крыніцу і тут аж шэсць штук утапілася на смерць. З плачам я прыйшоў дахаты і прыгнаў гусей. Хацелася як небудзь салгаць, каб выкруціцца ад гэтай бяды. Але бацька не паверыў і добра адлупцаваў мяне па мягкім месцы раменным паскам. Не памятаю, ці вельмі балела, але і да гэтага часу памятаю, што мяне пабіў бацька. Не меў я жалю, бо я быў вінаваты. Цэлае жыццё бацька быў добры для нас усіх. Усялякімі спосабамі стараўся як найбольш зарабіць грашэй на жыццё. Не прыйшлося мне спытаць бацьку, дзе ён вучыўся. Але ведаю, што ўмеў чытаць і пісаць па расійску, бо пасля часта да мяне ўласнаручна спрацаванаю рукою пісаў лісты. Зімою рабіў бацька каменныя крыжы-памятнікі. Рабіў ручныя і на кольбу жорны. Ставіў хаты і іншыя гаспадарчыя будынкі. Часам нават выстружа цэбар ці вядро. Умеў рабіць розныя забаўкі.

Першы грамафон у Пасынках

24 чэрвеня 1896 года ў царкве ў Пасынках бельскага павета адбываўся вялікі отпуст. Гэта было свята Іаана Прадцечы. На свята гэтае прыязджаюць па запрашэнням усе свяшчэннікі з матушкамі з суседніх і з далейшых парафій, а было іх каля 10, а можа і больш. Спачатку маліліся, а пасля абедалі ў плебаніі, спявалі і забаўляліся. Па іх прыкладу ўсе парафіяне сваёй парафіі і людзі з суседніх парафій масава прыходзілі і прыязджалі фурманкамі (бо тады яшчэ не было Пэкаэсаў, матацыкляў ці веласіпедаў), каб памаліцца, хаця

ў царкве не хапала месца, а пасля пайсці да сваякоў, ці проста да знаёмых адведаць іх, пагутарыць аб усялякіх справах і як належыць пабываць у гасцях, выпіць ці закусіць па святочнаму.

У канцы чэрвеня пагода бывае лагодная. Найчасцей сена ўжо выкошана і звезяно, а жніво яшчэ не пачалося. Статак дамовы пасецца ў полі на траве. Значыцца самы час на адпачынак перад жнівамі, бо сярпамі жаць гэта цяжкая праца. Жняярак тады яшчэ не было, як не было і ў модзе касіць збожжа косамі. Крыху быў тут на перашкодзе так званы прадновак, але то не перашкаджае, як кажуць: хоць гол ды сакол. Хто мае каго з родных у горадзе, то на свята гэтае запрашае. Хаця і без запрашэння быў і я тут і без ліку многа моладзі. Асабліва дзяўчат, якія хацелі выйсці замуж, ну бо трэба ж паказацца, ці хлопцаў – кандыдатаў да ажэнкі.

Тут вялікі выбар featureрознага тавару. На гэты фэст прыязджае шмат гандляроў, цукернікаў і розных ашустаў. Тут прыехаў, здаецца з Варшавы, неякі Рэвель, брат селяніна з Пасынкаў Аляксея Тарасюка. Прывёз ён з сабою грамафон з вялікаю трубою. Жыў Тарасюк блізка каля царквы. Як толькі закончылася заутрэння Рэвэль вынёс грамафон і паставіў на стале перад домам. Тут было шмат зеляні і кветак і ўсё гэта выглядала вельмі прыгожа і ўрачыста. Рэвель павярнуў трубу ўбок людзей, пакруціў пружыну і пусціў свой грамафон. Спачатку зайграў ён вядомую ўсім песню "Разлука ты разлука, чужая сторона", пасля нейкая гарластая баба сварылася з мужыком, які прапіў грошы, а пасля нейкі артыст спяваў прыгожым тэнарам "Чудны месяц плыве над ракою", пасля музыка танэчная і г.д. Колькі было радасці і здзіўлення. Гэта быў першы грамафон, які я бачыў тады. Мне гэта моцна ўрэзалася ў памяць. Памру, а не забуду гэтага дня. Хачу яшчэ сказаць, што тады не было радыё, мікрафонаў, адаптараў ці тэлевізараў. Гэты грамафон быў вялікім цудам – атракцыёнам у сяле. Цяпер такі грамафон не меў бы столькі слухачоў.

Як бачыце, за гэтых 70 гадоў, як жа вялікія перамены прайшлі на нашай зямлі. Цяпер лётаем на самалётах хутчэй за буслоў. Слухаем радыё, глядзім у тэлевізар, ляцім у космас і як бы не заўважаем усіх тых пермен за апошнія гады.

Трэба ганарыцца, што нашае пакаленне адкрыла не цуда, а проста розумам дайшло да ўсяго новага.

Мая першая навука

Быў у мяне старэйшы на тры гады брат Рыгор. Мне было ўсяго чатыры гады. Рыгор хадзіў у школу. Настаўнікам тады быў самавук Данільчык Ваўрэнюк, родны брат Сыльвестра. Данільчык пасля ўсё жыццё быў пашталіёнам у Варшаве. Там і памёр. Быў ён надта малога ўзросту, шчуплы. На галаве меў чорную чупрыну. Будынку школьнага ў Кнаразах тады яшчэ не было. Вучыліся па чарзе ў тых хатах, дзе быў вучань ці вучаніца. Не было тады ніякага прымусу да навукі. Вучыліся пераважна толькі хлопцы, а то таму, што лепш было ў войску тым салдатам, якія хаця крыху былі пісьменнымі. Дзяўчат да войска не бралі, а падчас шлюбу за іх падпісваліся так званыя сведкі, або проста сам дзячок. Як памятаю, у школу хадзіла са мною толькі дачка Аляксандра Вязоўскага Аксенія і дачка Карпа Хвэдося Сідарук.

Малых дзяцей не пускалі да хаты, дзе адбывалася школьная навука. Настаўнік заўсёды меў пры сабе доўгую лінейку і калі які хлопец паказаўся ў хаце, то ён хватаўся за лінейку і трэба было ўцякаць. Не было ў гэтай школе школьнай дошкі да пісання. Былі толькі малыя-аспідныя,



іх называлі яшчэ грыфельныя, бо на іх вучні грыфелем пісалі, пальцам сціралі, ізноў пісалі, ізноў сціралі. Сшыткі былі ў Бельску ў Капланскага, але на іх не хапала ў бацькоў грошай. Не было тут і спецыяльных школьных лавак. Прыносілі ад суседа другі стол, бо адзін заўсёды быў свой у хаце і бралі шырокую дошку. Клалі яе адным канцом на край аднаго стала, а другім на край другога. Гэтаксама дошкі да сядзення. Вучні сядалі з аднаго боку дошкі і на супраць з другога і так вучыліся. Кніжкі былі толькі рускія. Буквары, азбукі, часам які задачнік.

Настаўнік хадзіў па хаце і глядзеў, які вучань як піша. Калі напісаў дрэнна, то настаўнік біў яго лінейкай па „лапе", а калі і гэта не памагала, то ставіў на калені, а часам яшчэ і на гарох, або астаўляў без абеда. Ніякіх перапынкаў не было, толькі дзеці беглі сярод дня без кніжак да хаты на абед, ізноў прыходзілі, і да вечара вучыліся з арыфметыкі. Найбольш вучыліся Закону Божаму і малітвы. Навука чытання пачыналася ад вывучэння на памяць усіх літараў, гэта значыць трэба было спачатку навучыцца цэлай азбукі. На гэта ішла амаль цэлая зіма, бо летам не вучыліся, а паслі каровы. На другую зіму паўтаралі азбуку; вучыліся складаць спачатку толькі дзве літары на прыклад ба, ва, га, да, жа, за, ла, на і г.д. Яшчэ пазней вучыліся складаць тры літары: бар, вар, гар, дар, жар і г.д. І толькі пад канец другой зімы uaглі прачытаць або напісаць кароткія словы, як мама, та-та, ка-па, кара, рака, рука, мука, сава і г.д. Такой методыкі навучання, як цяпер тады не было. Цяпер вучань знае толькі дзве літары, як А, С, і ўжо можа прачытаць клічку сабакі.

Другім настаўнікам у рухомай (передвіжной) школе быў нейкі Вінцэнты Ваўрэнюк. Чамусьці яго звалі Савіцкім. Гэта быў надта стары чалавек. Сам не ведаю дзе і ад каго ён навучыўся чытаць і пісаць. Думаю, што ён служыў у царскім войску 25 гадоў. Але Данільчык выехаў да Варшавы, а трэба было кагосці паставіць. Савіцкі не насіў з сабою лінейкі, а насіў выструганую з дрэва ўказку з вушком, як у іголцы і са шнурочкам, за які ён трымаў гэту ўказку. Таксама не мала даставалася вучням ад яго. Але ані за часоў Данільчыка, ані за Савіцкага я яшчэ да школы не хадзіў, толькі сядзеў на печы за дудою і назіраў як ішла праца ў школе. Першым маім настаўнікам быў Сямён Панкратавіч з вёскі Пілікі. Быў і другі настаўнік з Пілік, але прозвішча яго не памятаю.

У 1897 годзе пабудавалі прыхадскую школу ў Кнаразах

Тады пабудавалі школу і ў Зубаве ды Агародніках. Лічылася яна ўжо казённай школай. Настаўнікаў назначаў інспектар. Казна плаціла настаўніку грошы. Наглядчыкам быў нехта з Бельска. Першым настаўнікам у новай школе быў нейкі чалавек прозвішчам Пытэль з вёскі Перліева, цяперашняга семятыцкага павету. Нічым надзвычайным ён не вылучаўся. У школе меў два пакоі з кухняй. Меў казённае ўмэбляванне, вялікую настольную нафтавую лямпу з прыгожым абажурам, а ў школе было каля 50 розных кніжак-падручнікаў, як „Первая пчолка", некалькі буквароў і правапісаў, а найбольш Начаткаў Старога і Новага Запаветаў. Былі тут Жытія святых, Евангелле, Псалтыр, Часаслоў ды малітвеннікі, а найбольшая кніжка гэта Класны Журнал. Сюды настаўнік запісваў усіх вучняў і штадзённа рабіў пераклічку ды запісваў, калі якая лекцыя адбылася. Тут жа запісвалася, хто і калі візітаваў школу.

У класе была вялікая чорная дошка. На ёй настаўнік выпісваў крэйдай вялікія літары, а вучні называлі іх і перапісвалі да сшыткаў, а хто не меў, то пісаў грыфелем

на аспіднай дошцы. Была тут невялікая шафа, якая замыкалася на ключ і каля 20 школьных лавак рознага памеру. На сярэдзіне стаяў стол для настаўніка і адно крэсла. На сцяне развешаны карты полушарыя і асобна вялікая карта Расіі. Тут жа вісеў вялікі партрэт цара Мікалая II, а ў кутку вялікі абраз Хрыста Спасіцеля. Пад столлю вісела вялікая газавая лямпа. У цэлай школе не было гліняных падлог, а ўсюды драўляныя. Ні ў адной вясковай хаце не было такіх вялікіх вокнаў, як ў школе. Было тут два ўваходы. Адзін з ганку парадны, толькі для настаўніка і прыезжых гасцей і рэвізараў, а другі для вучняў, стоража і бацькоў, калі хто меў які інтарэс да настаўніка ці да школы. У параўнанні з калісьняй рухомай школай, новая школа зусім інакш выглядала. Настаўнік адначасова вучыў аж тры класы. Вынікі такой навукі не былі добрыя, але ўжо ў першы год да новай школы дзеці хадзілі масава, бо солтысы мелі наказ пільнаваць гэтай справы. Але не ведаю ці то з віны настаўніка, ці з якой іншай прычыны, бацькі пазбягалі школы і не прыходзілі сюды.

Праўдзівы настаўнік Рушкоўскі

На другі год быў назначаны новы настаўнік прозвішчам Рушкоўскі Антон з Нурца Семятыцкага павета. Быў гэта надзвычай добры настаўнік. Быў ён з натуры прыгожы, вясёлы і надта прыхільны для дзяцей і для людзей старэйшага ўзросту. Не трымаў вучняў цэлы дзень у школе. Сцісла прытрымоўваўся вызначаных гадзін, а як толькі адпусціў вучняў дамоў, адразу плянаваў урокі на наступны дзень, папраўляў сшыткі, чытаў кніжкі. Таксама іграў прыгожа на скрыпцы, вельмі прыгожа спяваў, а як толькі вечарэла, ішоў на вёску, адшукваў, дзе збіраліся кудзельніцы дзяўчаты. А там, дзе былі кудзельніцы былі і хлопцы. Настаўнік найперш засядаў пайграць з хлопцамі у карты не на грошы, а так проста ў казла. А на дзяўчат ён якбы не звяртаў увагі. Сам быў надта прыгожы. Дзяўчаты, каб паказацца, што яны ўмеюць спяваць розныя песні, спачатку ня смелаціха, а пасля пускаліся на ўсю грудзь.

Настаўнік быў вельмі добрым спеваком. Ён скончыў семінарыю і быў рэгентам. Добра ведаў царкоўную службу і спевы. Калі заўважыў, якая з дзяўчат мае найлепшы голас, падсядаў да яе, жартаваў і прасіў, каб яго навучыла спяваць, бо яму нібы вельмі спадабалася гэтая песня. Асмеленыя такім чынам дзяўчаты ахвотна паўтаралі, а настаўнік яшчэ звяртаўся да хлопцаў, каб і яны дапамагалі дзяўчатам і тут ён лавіў патрэбныя яму галасы хлопцаў. Кожны дзень вечарам ён быў у іншай хаце і таксама запісваў сабе імя ці прозвішча дзяўчат ці хлопцаў з найлепшымі галасамі. Пасля вышукваў некалькі мужчынскіх галасоў-басаў ці барытонаў, а таксама выбіраў патрэбныя паміж сваіх старэйшых вучняў. Калі ўжо добра падрыхтаваўся, то ў суботу ці нядзелю ўсіх асабіста запрашаў у школу і тут адбывалася праўдзівая навука спеву. Але не толькі спеву. Ён даваў тэкст якой небудзь новай, прыгожай песні і тут жа ў школе прасіў перапісаць. Гэта крыху сароміла некаторых, але настаўнік быў цярплівы і настойлівы ды не адну дзяўчыну ці хлопца навучыў пісаць і чытаць. Ён арганізаваў вельмі добры, як на тыя часы хор, які славіўся на ўсю ваколіцу, а моладзь з'яднаў у адну групу.


Калі ён дакончыў першую сваю справу, то стараўся прыдумаць, як адцягнуць ад карчмы і прыцягнуць да школы старэйшых сялян. Праз вучняў перадаваў сваю просьбу, каб бацька ці маці кожнага вучня абавязкова прыйшлі ў школу. Тут з кожным асобна і з ўсімі разам размаўляў на тэму навукі і яе значэння ў жыцці чалавека. Тут я добра памятаю, як пад канец

ён прыгожа прадэклямаваў верш на рускай мове „Сиротка”. Далей ён сам, ці хто са старэйшых вучняў дэклямаваў верш „Утопленник” ці які іншы. Пасля чыталі „Жытія Святых” або хор спяваў набожныя ці народныя песні. Мэтай настаўніка Рушкоўскага было адцягнуць ад карчмы, п’янства, ад безкарнага пераліванння з пустога ў парожняе і з’яднаць у школе, дзе ўжо не было вульгарных слоў. Гэта быў пачатак што-раз лепшага, культурнага жыцця.

Рушкоўскі быў праўдзівым настаўнікам. Ён не толькі добра вучыў дзяцей, вядучы адначасова аж тры класы. Ён быў праўдзівым культурным працаўніком, які ўмеў з’яднаць моладзь і ўцягнуць да школьнага жыцця дарослых мужчын і жанчын. Слава аб Рушкоўскім пайшла па наваколлі, але на другі год яго ўзялі да іншай школы, туды дзе цяжка было развярнуцца, каб уцягнуць насельніцтва да лепшага жыцця. Я быў найстарэйшым і найлепшым вучнем у школе. Калі паехалі на экзамены да школы ў Агародніках, то я найлепш здаў і атрымаў ва ўзнагароду прыгожую кніжку.

Сяргей Манаховіч і ягоны сад

Новым настаўнікам у кнаразоўскай школе пасля Рушкоўскага быў Сяргей Манаховіч з вёскі Пасынкі. Ён не меў так вялікіх здольнасцей да спеву, але быў таксама добрым настаўнікам. Асабліва добрай памяткай пасля сябе ён пакінуў прыгожы сад на прышкольным палетку. Расплянтаваў ён плошчу пры дапамозе старэйшых вучняў і моладзі, якія выкапалі ямы і пасадзілі 50 штук яблынь, груш і сліў найлепшых сартоў. Абгарадзіў гэты сад і праз некалькі гадоў падчас працы ў школе ў Кнаразах добра даглядаў яго. Заслуга яго ў тым, што яблыкі і грушы былі выпісаны і прывезены з Семінарыі (царкоўна-настаўніцкай-рэд.) Такіх сартоў дагэтуль не было ў Кнаразах. Ён навучыў вучняў старэйшага класа зашчэпліваць дрэўцы і такім чынам распаўсюджваў добрыя сарты па цэлай вёсцы, а нават па ваколіцы. Сад пры школе і цяпер яшчэ жыве, хаця мае ён ужо больш за 50 гадоў.


С. В. Монаховичъ.
ОЧЕРКИ ЗАПАДНАГО КРАЯ.
(Гродненская губ. и Бѣловѣжская пуща въ предѣлахъ Западнаго края).
Цѣна 5 коп.
Изд. Кн-ва „СОТРУДНИКЪ НОВОЙ ШКОЛЫ”.
С.-ПЕТЕРБУРГЪ, 1913 г.

Тытульная старонка школьнай чытанкі, напісанай Сяргеем Манаховічам

Сяргей Манаховіч быў вельмі рэлігійным настаўнікам і адначасова папулярным чалавекам. У размовах з людзьмі ён заўсёды з пагардай адносіўся да тых, хто ўжываў безцэнзурныя словы, вёў сябе безкультурна і страшна не любіў п’янства. Пасля ён быў свяшчэннікам у праваслаўнай царкве ў вёсцы Малешы каля Браньска. Конікам яго было дапамагаць людзям у сельскагаспадарчай тэхніцы на палях і сенажацях.



Школа ў Пасынках і першае каханне

На другі год пасля экзамена ў школе ў Агародніках, Манаховіч дапамог мне пачаць вучобу ў Міністэрыяльнай Школе ў Пасынках. Жыў я ў цёткі Мар'янкі. Праграма навукі была значна шырэйшая, чым у школе ў Кнаразах. Лепшая была школьная дысцыпліна. Тут ужо не толькі вучылі агульнаадукацыйных прадметаў, але таксама навучалі методыцы: як вучыць дзяцей або як дапамагаць старэйшым вучыцца чытаць ці пісаць. Пайшоў я ў гэтую школу з нейкім спазненнем. Спачатку было мне цяжка вучыцца. Але настаўнік пасадзіў мяне на адзінае вольнае месца ў лаўцы каля адной дзяўчыны прозвішчам Марыся Маркевіч. Я аж плакаў, так мне не хацелася сядзець каля яе, бо ўсе вучні смяяліся. Але мусіў паслухаць настаўніка. Дзяўчына ад пачатку вучылася ў гэтай школе. Была ў навуцы мацнейшая за мяне, пасля вельмі многа мне дапамагала. Жыла яна блізка ад маёй цёткі. Цётка прасіла яе, каб прыходзіла разам рыхтаваць заданыя ўрокі. Вельмі яна мне спадабалася, але жыццё раскінула нас на адлегласці.

Праца ў падляшскіх школах і Варшава

Мяне па вольнаму найму вёска Ольшаніца ўзяла за настаўніка ў такой рухомай школе, якая была калісь у Кнаразах. На другі год іншая, ўжо большая вёска Сакі ўзяла за большую гадавую заплату. І так я вучыў іншых. А і сам вучыўся. Найбольш дапамагаў мне ў далейшай навуцы мой былы настаўнік Сяргей Манаховіч. Кожнае лета я штадзённа хадзіў пехатою з Кнаразоў да Пасынкаў. Манаховіч па дзве гадзіны вучыў мяне. Даваў мне свае семінарскія падручнікі. Тлумачыў і задаваў урокі на наступны дзень.

Пасля пры яго і прыхадскога свяшчэнніка а. Васілія Кастыцэвіча дапамозе, я быў назначаны ў парафіяльную школу ў вёсцы Сілівонкі каля Межырэчча, Радзыньскага павету, Люблінскай губерні. Вёска гэтая была вуніяцкая. Бацькі прасілі мяне, каб вучыць дзяцей не толькі па-руску, але і па польску. Гэта было забаронена, але я не ў школе, а вечарамі хадзіў да хаты і тут разам і сам вучыўся, бо не вельмі ведаў польскую навуку, вучыўшы дзяцей. Бацькі былі вельмі задаволены і трымалі ў вялікім сакрэце гэтую маю працу.

У летнія канікулы, а пачыналіся яны з пачаткам вясны, я яшчэ больш падрыхтаваўся і паехаў у Варшаву. Тут, пры Епархіяльным вучылішчы спецыяльная камісія дапусціла мяне да экзамену на званне настаўніка пачатковай школы. Экзамен здаў і паступіў у другую рускую Гімназію, як падручны хлопец бібліятэкаршы. Быў тут на пасылках, дапамагаў бібліятэкаршы дастаць той ці іншы нумар кніжкі. Калі трэба было, ставіў на месца ўжо прачытаную кніжку. Бібліятэкарша, пані Караткевіч, была вельмі добрая жанчына. Я меў шмат вольнага часу. Яна дапамагала мне падбіраць для чытання адпаведную літаратуру. А калі даведалася, што я маю права быць настаўнікам пачатковай школы, то дапамагла мне паступіць на пасаду малодшага настаўніка пры школе ў *Николаевском Приюте* (прытулку) для салдацкіх дзяцей у Варшаве пры вуліцы Нававейскай нр 5. Гэта дало мне магчымасць жыць самастойна. Я тут меў безплатны прыгожы пакой. Таксама безплатнае харчаванне, а нават пасцельныя прылады.

Адсюль у 1908 годзе я пайшоў у вайсковую царскую службу, але не трымаў карабіна ў руцэ, бо працаваў як пісар старэйшага разрада ў Штабе Варшаўскага Ваеннага Округа каля Саксонскага Саду г.зн. тут дзе цяпер *Гроб Незнанэго Жолнежа.*

Тут таксама ў вольных гадзінах прадаўжаў навуку, але цяжка было прабіваць сабе дарогу ў жыццё самавукам.

Вяселле

Як сказана ў Старым Запавеце- першымі людзьмі былі Адам і яго жонка Ева. Было ў іх двое сыноў: Каін і Авель. Адсюль пачынаецца жыццё радзіны, г.зн. мужа і жонкі. У Дзевятай Запаведзі таго ж Запавету гаворыцца: „ Не пажадай жонкі бліжняга твайго". Гэта значыць, што кожны муж павінен мець толькі адну жонку. Але калі добра ўнікнуць у гэтую справу, то даведаемся, што ў жыцці здараюцца адхіленні ад Запаведзі Божай, бо ў некаторых народаў - не ведаю, паводле якога права – адзін муж мае да сваёй дыспазыцыі многа жон – гэта тзв. „многажонне". Можа калісь было і так, але цяпер гэтая Запаведзь не спаўняецца і ва ўсіх іншых народаў. Часта бываюць з гэтай прычыны спрэчкі, бойкі, забойствы, суды, перасуды, разводы, аліменты. Адсюль пераважная колькасць людзей - ці то на падставе Запавету, ці з рацыі узаемнага кахання пары маладых, ці з розных матэрыяльных патрэб і поглядаў - падпарадкоўваецца закону і абмяжоўваецца *пасяданнем* адной толькі жонкі, а сам абрад набыцця сабе жонкі называецца шлюбам або вяселлем.

Неаднолькавы быў і ёсць парадак абрадаў шлюбу. Усюды звязана гэта з пэўнымі традыцыямі. Тут я хачу апісаць, на колькі сягае мая памяць, як адбываліся ў даўніх часах шлюбы ў Кнаразах.

Сватанне

Перад усім кандыдат да ажэнку мыслямі выбіраў сабе асобу, якая ў яго паняцці магла б быць добрай гаспадыняй, каханай жонкай і мілай маткай дзяцей на ўсё жыццё. Йшоў ён да каго-небудзь са старэйшых жанатых мужчын і прасіў яго быць маршалкам. Функцыю гэтую кожны ахвотна прымаў, бо на вяселлі маршалак быў важнай асобай і пахла тут гарэлкай, сытым пачастункам, а нават прыгожым ручнікам ад маладухі. Маршалкам мусіў быць чалавек, які ўмеў спрытна і з добрай снароўкай гаварыць і таргавацца за пасаг. План дзялання укладалі ўсе разам. У дамоўлены дзень, пераважна ў суботу, нядзелю ці чацвер маршалак прыходзіў да хаты маладога і тут адбывалася даўжэйшая нарада з маладым, яго бацькамі, калі яны яшчэ ў жывых, або з бліжэйшымі родственнікамі. У рахубу бралі ўсе магчымасці: пойдзе за яго маладая ці не, а калі так, то які пасаг можна атрымаць. Калі не пойдзе, то які напрамак яшчэ таго ж дня прымаць да другой, ігд. Прычым у першую чаргу бралася пад увагу справа пасагу.

У вызначаны дзень абавязкова вечарам і якбы ў таямніцы ад суседзяў малады запрагаў свайго каня ў як найпрыгажэй засланы каляровай плахтай воз ці сані і ехаў на чужую вёску, а калі гэта было ў сваёй вёсцы, то ішоў пехатой. Як толькі ўваходзіў у хату маладой, то, прывітаўшыся, сядаў як мага бліжэй парога. Маршалак коратка тлумачыў бацькам маладой мэту і прычыну іх прыезду. Не абыходзілася тут без розных пагаворак, прыказак, тыпу: *Чулі мы, што ў Вас е вэльмі гожа тэлушка на продаж і хочэм іе купіті. А я прывюў доброго загранічного купця.* Калі бацькі уважалі, што жаніх чагосьці варт, то запрашалі да стала, але без пачастунку. Тут маршалак паказваў свае здольнасці. Хваліў жаніха як найлепшага купца і найпрыгажэйшага багатага кавалера. Выхваляў будучае жыццё маладых, а калі вычуў, што ўдалося пераканаць бацькоў, а тым больш маладуху, то дыпламатычна падыходзіў да пытання пра пасаг. Маладыя спачатку гаварылі нясмела, тады маршалак вымаў з кішэні бутэльку, а маці

ставіла закуску. Тут пачынаўся сапраўдны гандаль. Маці кажа, што дачка яшчэ маладая, хай шчэ пажыве ў сваёй роднай хаце. А дачка на гэта папракае маці, што яна ў такія ж гады бацьку пакахала. Выпіваюць, закусваюць і як мага дакладней устанаўліваюць цану пасагу ў грошах, каня, карову, свінню, авечку, палоску зямлі або сенажаці. Калі ўсё гэта адбываецца ў роднай вёсцы, то запрашаюць і бацькоў жаніха, каб супольна абгаварыць усе пытанні. Тады пасылаюць да мясцовага свяшчэнніка так званае *Оглашэние*, якое чытаецца падчас царкоўнай службы. Момант гэты называецца *Заручыны*. Калі людзі пачуюць першае ці другое аглашэнне, то пачынаюцца ва ўсім прыходзе размовы на тэму шлюбу. Бывае, што за іх справай і разладзіцца вяселле.

Падрыхтоўка да вяселля

У хаце маладухі пачынаецца падрыхтоўка да вяселля. Яна запрашае дружак, г.зн. сваіх сяброваак ці сваячак і цэлымі тыднямі разам з імі шые, вяжа карункі, вышывае рушнікі, пляце вянкі і ўвесь час спявае розныя сатырычныя прыпеўкі. За тыдзень да шлюбу, ў нядзелю, маладыя ідуць да споведзі. У апошні перадшлюбны чацвер малады атрымлівае ад будучага цесця залічку пасагу. Маладуха са старшай дружкай і малады са сваім дружбанам едуць ў Бельск. Тут робяць апошнія закупы для вяселля. Купляюць сундук ці інакш-скрыню і які небудзь падарунак для маладухі. Пасля ідуць да карчмы, выпіваюць кварту гарэлкі, закусваюць як след і едуць дахаты.

У пятніцу вечарам, а нават ноччу маладуха са старшай дружкай, прыстроеныя ў брынджы, пацеркі і куснікі абыходзяць кожную хату ва ўсёй вёсцы. Калі гаспадары спяць, дык іх будзяць і нават малому дзіцяці маладуха кланяецца, цалуецца і запрашае ўсіх на вяселле.

Ўжо тады маладуха мае падрыхтаваную для прышлага мужа вышытую як найпрыгажэй льняную шлюбную кашулю. Тады яшчэ не зналі белых, накрахмаленых кашуляў з крамы. У суботу запрашаюць каравайніц, якія месяць цеста, спяваюць і пякуць у печы пірагі і гускі. Хлопцы падросткі тымчасам спрытна выцягваюць гускі з печы. Не аднаму даставалася папрушкай па плечах, але за такую пакражу не было граха ці суда. Гэта быў звычай. Таго ж вечара малады з маршалкам і старшым сватам-дружбаном прыязджаюць па кашулю і вянок, які тут ужо падрыхтаваны. Але на самой справе пачынаецца ўжо самае вяселле. Гэты вечар у маладой прадаўжаецца да позняй ночы.

Выезд да шлюбу

На другі дзень адбываецца царкоўны шлюб. Перад выездам да шлюбу ўсе засядаюць за стол. Гаспадар частуе невялікай порцыяй гарэлкі і закускі. Маладуха і малады зусім нічога не п’е і не есць, бо быў такі звычай, што дадзенае ў час вянчання віно маладыя павінны былі выпіць начча. Калі ўсе ўселіся на запрэжаныя вазы і верхавыя селі на коні, бацька або заступаючы яго хтосьці са старэйшых, набірае ў маленькі горчык аўса, абыходзіць тры разы навокал цэлага аршака і жменяй абсыпае коні ды людзей аўсом. Пасля гэты горчык з рэштай аўса ставіць перад коньмі на зямлі. Трэба было, паводле забабонаў, каб конь перакінуў горчык і высыпаў авёс. Не ведаю, якое то магло мець значэнне. Да шлюбу малады едзе побач двух дружбанаў, вярхом на канях. Ззаду, на некалькіх прыбраных зеленню фурманках едзе ўсё вяселле. Маршалак звычайна паганяе каня і пільнуе парадку. Музыкант ўсю дарогу грае на скрыпцы ці гармоніі,



На вяселлі ў Кнаразах, 1965 г.; са збораў Мікалая Ніколаюка

а ўсе разам спяваюць вясельныя песні.

Калі пад'язджаюць бліжэй царквы, дык зусім не спяваюць. Сціхае музыка, прыціхаюць і галасы вясельных. Тут ствараецца пабожны настрой. Падчас шлюбу маладыя становяцца на малы коўрык сярод царквы. Дружбаны трымаюць над галовамі вянцы. Выходзіць свяшчэннік з дзячком, а калі хто заплаціць, дык і ўвесь хор пеўчых. Адбываецца вянчанне.

Выгляд маладых і гасцей

Малады на самой сярэдзіне шапкі мае прышыты вянок, а дружбаны з правага боку на шапцы вянок з каляровага паперу і як найбольш блішчачкі. Такія ж вянкі каля шапкі мелі і ўсе дружбакі маладухі. Апрача таго ўсе яны былі падпаясаны белымі, чыстымі, льнянымі ручнікамі.

Дружкі, сванькі і сама маладуха мелі на галавах надта прыгожыя, асаблівыя вянкі на ўсю галаву брынджы. У адрозненні аднак ад першых, у маладухі былі распушчаны валасы, а на самой сярэдзіне галавы быў малы вяночак, так як ў маладога. Жанчыны ўсе ў пацерках. На іх таксама было як найбольш разнакаляровых куснікаў, распушчаных на плячах прыблізна на паўметровую даўжыню. Дзяўчаты жа ўсе былі напудраваны і разфарбаваны.

Вяселле ў хаце маладой

Пасля шлюбу ў царкве, усе садалі і ехалі ўжо цэлым вяселлем да маладухі, а калі малады ішоў у прыступы, то да ягонай хаты. У час дарогі малады са сваёй жонкай сядзелі на адным возе, прычым жонка заўсёды з левага боку. Як прыедуць, то пачынаецца папойка гарэлкі. Хвалілі бацьку, калі гарэлкі было пад дастаткам. Закусвалі пераважна толькі караваем і мясам. Відэльцаў не было. Старшы сват рэзаў печонку на кавалкі і ўсе бралі закуску проста рукамі. Калі хто ставіў вялікую міску

худок, то елі драўлянымі лыжкамі. Падчас гэтага пачастунку збіралася поўная хата няпрошаных жанчын, якія спявалі вясельныя песні. Паводле звычаю, выпрасіць з хаты гэтых жанчын было нельга. Бо кожная маці павінна навучыцца, як адбываецца вяселле, дык жа яна мае таксама дачку ці дзве для выдання.

Маладуха некаторым з іх падавала праз стол кусок каравая. Было вялікім гонарам атрымаць такую лусту каравая. Жанчына толькі крышку ўшчыпне пірага, пакаштуе, а рэшту схавае за пазуху і нясе дахаты пахваліцца, што атрымала ды частуе ўсіх.

Вяселле пераязджае ў хату маладога

Сярод ночы маладыя і большая частка вяселля ехалі дахаты (маладога). Заставаўся толькі старшы сват-дружбан, які на другі дзень каля 12 гадзіны дня ехаў з *перазвой* на скрыні.

Як толькі малады прывозіў да сваёй хаты маладую жонку, то жанчыны спявалі жартаўлівую песню: *Вынось маті діежку, прывюоз сын нэвіестку. Ні скрыні, ні пэрыны, ані з еі господыні.* Маці выносіла пустую, накрытую векам дзежку і ставіла яе каля воза, на якім сядзела нявестка. Нявестка зыходзячы з воза, ступала адной нагою на дзежку, тут жа віталася са звякрухай і тэсцем ці бацькам мужа ды з ўсімі хатнімі. Калі ўвайшла ў хату, развешвала свае доўгія, як найпрыгажэйшыя ручнікі, раскладала абрусак на стол і дарыла маці, бацьку і ўсіх дамашніх рознымі падарункамі. Пасля музыкант укладаў з музыкай маладых да сну. Калі гэта было летам, то спалі ў стадоле, а калі зімою, то ў каморы. Музыкант са скрыпкай будзіў іх са сну. Граў на дзень добры і за гэта атрымліваў некалькі грашэй, якія апускаліся ў дзірку ў скрыпцы.

Каля поўдня ехала пэрэзва. Старшы сват, седзячы на скрыні, ў руцэ трымаў развешаную на высокай тычцы чырвоную хустку. Цар не забараняў, а за часоў Санацыі Жонд Польскі забараніў ехаць з чырвонаю хусткаю, бо то нібы быў бальшавіцкі сцяг.

Калі ехала *пэрэзва*, то хлопцы-падросткі круцілі з саломы доўгія перэвяслы і перагароджвалі дарогу ўпоперак вуліцы, патрабуючы выкупу. Часта атрымлівалі пачастунак ў выглядзе жмені цукеркаў. Часам вясельныя разганялі падросткаў, пры гэтым аднак наражаліся на розныя псоты ў хаце ці ў іншых будынках падчас вяселля, якое працягвалася часта да позняй ночы. За падарункі для бацькоў, за ручнікі і за добры пачастунак на вяселлі ўсё вяселле ў пэўным часе пэрэпівала на карысць маладухі на Вспомагане. Маршалак мусіў ведаць усіх паімённа. Канчуком на козінай ножцы стукаў тры разы па бальку над сталом і голасна ды выразна крычаў: *А дэ е наша пані матка або ойцец пана молодого, просім на вспомагане і на кілішок".* Словы і ўдары па бальку паўтараліся да цётак сясцёр і па чарзе ўсіх вясельных. Тут маладуха ці малады ўласнаручна налівалі поўны кілішак гарэлкі і той, хто падыходзіў выпіваў і клаў па магчымасці, як найбольшую суму грошай.

Пэрэпіванне і дзяленне грошай

Вельмі часта маці маладухі амаль ўсё сваё жыццё збірае грошы, каб пасля *пэрэпіті* іх для сваёй дачкі на вспомагане. Перапівалі ўсе вясельныя. Выпіўка адбывалася ў прысутнасці цэлага вяселля, а нават шмат тут бывала няпрошаных гасцей. Кожны, як на паказ, з гонарам кідаў на плыткую талерку пэўную суму. Маладуха дзякавала, падбірала сабе і лічыла гэта сваёй уласнасцю. Але падлічванне адбывалася пры ўсіх. Значыцца і муж, і бацькі ведалі, якую прыблізна суму маг-

ла назбіраць. У гаспадарцы, вядома, шмат якіх ёсць выдаткаў і расходаў.

Спачатку нібы бацька просіць пазычыць грошы на падатак ці на які пільны выдатак. Калі аддасць, а калі і так астанецца і грошы гэтыя хутка, як кажуць, раскоцяцца. Тады пачынаюцца розныя хлопаты, парахункі, разрахункі, папрокі, спрэчкі і г.д. Адсюль паўстала пагаворка, што на новым месцы датуль добра пакуль не з'ядуць вясельнага хлеба-каравая. Рэдка дзе бываець так, што ў згодзе дажывуць да канца. Часта маладыя аддзяляюцца ад бацькоў. Будуюць сабе асобную хату, а асабліва там, дзе дрэнныя ўмовы жыцця, напрыклад адна толькі хата, а ў ёй некалькі дарослых асоб. Нездарма вялікі беларускі пісьменнік Якуб Колас ў паэме "Новая Зямля" пісаў: Міхась, як толькі ажаніўся, адразу ад бацькі аддзяліўся. Бацькі гэта добра ведаюць і для таго шукаюць розных прычын, каб як найдалей адцягнуць ажэнку сына. Бацькі дзяўчыны імкнуцца аддаць дачку як найхутчэй, бо калі прапусціць нагоду выйсці замуж, то пасля кажуць старая панна, ганьбуюць і гэтая дзяўчына, калі і выйдзе замуж, то за якога непрыгожага, як кажуць, не любага мужчыну, удаўца, ці пьяніцу, абібока. Адсюль пагаворка: *Хоть і за вола, абы дома нэ была.* Тут ужо не шкадуюць пасагу, абы толькі выпхнуць з хаты.

Цяжкі лёс сустркае тых дзяўчат, якія застаюцца старымі паннамі і дажываюць да старасці ў характары вечнага парабка, пры жанатым браце, ці нават яго дзецях. Часта тут бяруць тах званых свах, якія за невялікі пачастунак вышукваюць адпаведных жаніхоў да выбракаваных па старасці дзяўчат. Свахі гэтыя маюць пэўны спрыт і снароўку. Красамоўна папісваюцца сваімі здольнасцямі і аўтарытэтам і часта даводзяць да ажэнкі.

Як я ўжо зазначыў, галоўным пачастункам на вяселлі была гарэлка. А вядома, што напітак гэты вельмі дорага каштуе. Часта бацькі набіраюць на прыклад сорак літраў на пазычаныя грошы. Часта прадаюць пад вяселле апошнюю карову ці каня. Цэлая гаспадарка падупадаець, а карысці ніякай, акрамя хваробы ці забойства па п'янаму, бо і так бываець, а пасля суды, цюрмы, праклёны.

Паважны стан жанчыны

Па рознаму называюць жанчыну, якая хутка мае нарадзіць дзіцё. Дзе, гавораць, цяжарная, дзе бярэмяная, дзе ў паважным стане, а дзе проста кажуць *Груба*. Як бы дзе не называлі, але заўсёды такая жанчына карыстаецца асаблівай увагай і пашанай. Ёй даецца права атрымаць без чаргі які бы то ні было тавар у склепе. Ёй даецца месца ў трамваі, вагоне ці рэстаране. Карыстаецца яна трохмесячным платным урлёпам мацярынскім і гадовым бязплатным урлёпам пасля родаў. Не выпаўняе яна тады цяжкіх прафесійных прац. Калі б хто чым небудзь яе скрыўдзіў, то суд вельмі строга судзіць віноўнага. Да яе і суседкі адносяцца з пашанай, ці то таму, што кожная хацела б быць кумою, ці толькі таму, абы была аказыя выпіць кілішак на хрысцінах.

Як толькі абродзіцца, то суседкі спяшаюцца з якім небудзь пачастункам і пааздраўляюць з нованароджаным. Момант гэты называюць *адведзінамі* ці *адведкамі*. Праз нейкі час выбіраюць кумоў і адпраўляюць дзіцё да царквы да хрысту. На гэты час гаспадар з гаспадыняю падрыхтоўваюць як найбольш гарэлкі, аранжады, віна ці піва, а таксама шмат усякай стравы. Склікаюць як на вяселле ўсіх добрых суседак і сваякоў ды частуюць.

Пасля вызначаюць умоўны дзень і збіраюцца на зборы, але не на кошт гаспадара, а кожная пара, гэта значыць



Кнаразоўскія хлопчыкі: Генік Ніколаюк і Ваня Хоманюк, 1970 г.; са сбора Мікалая Нікалаюка

муж і жонка, прыходзяць да хаты *родзелі*. Муж прыносіць у кішэні бутэльку гарэлкі і дэманстратыўна, каб усе бачылі, ставіць на стале, а жонка завязвае ў хустку разнародную закуску. Пры гэтым кожная пара не хоча быць горшай і адна перад другой стараецца прынясці і многа, і як найлепш падрыхтаванай стравы. Тут ужо пачынаецца праўдзівы баль. Дзіця ўжо падрасло і пахарашэла. Маці не ляжыць у пасцелі, а ўвіхаецца, каб угадзіць гасцям і бацька задаволены, што ўсё адбылося добра, з прыемнасцю пацягне заздраўны кілішак. Тут яшчэ кума ці бабка ставіць на стале ўпрыгожаную кветкамі міску з кашай і ўсе кідаюць грошы на *вспомаганне*.

Калі ўжо ўсю водку вып'юць і пад'ядуць як след, то пачынаюцца спевы спецыяльных жартаўлівых хрысцінных песень. Танцуюць найчасцей пад музыку на скрыпцы ці гармоніі, а пасля запрагаюць каня ў воз ці сані. Сядаюць як найбольш і едуць куліка туды і сюды вуліцай. Часам вазніца патрапіць спрытна вываліць сані ў снег і тут можна пацешыцца, як кумы вылазяць з-пад п'яных кумоў, смяюцца і атрасаюць снег. Пераважна тады спяваюць: *Сэлом еду, сэлом еду, корчмы нэ мінаю. Ой, хоць мінаю, хоць нэ мінаю, то й грошэй нэ маю*... Калі ёсць у сяле карчма, то заязджаюць і тут квасам *полошчут зубы*. Цэлая гэта імпрэза называецца хрэстбіны.

У старыну гэта была можа адзіная разрыўка пасля цяжкай працы на раллі, свайго роду тэатр ці кіно, а цяпер хутка хрэстбіны прымуць іншы характар. Жанчыны родзяць дзяцей не дома, а ў шпіталях. Тут непатрэбныя бабкі. Роды адбываюцца пад апекай акушэрак і дахтароў. Сюды не пускаюць нікога ў адведзіны. Не ўсе ўжо вязуць дзяцей да хрэсту да царквы ці касцёла, а толькі ва *Ужэндзе Стану Цывільнага* запісваюць дзіця і тут жа самі вызначаюць яму імя.

Вялікую ролю пачынаюць адыгрываць арганізацыі Свядомага Мацярынства, якія не толькі апекуюцца цяжарнымі жанчынамі, але і вядуць шырокую прапаганду па рэгуляцыі непажаданай цяжарнасці пры прымяненні глабулек З ці якіх іншых антыконцэпцыйных сродкаў. Тут можна сказаць, змяняюцца ўмовы жыцця жанчын і дзяцей, а таму можна думаць што зменяцца і звычаі ці абрады святкавання хрысцін.

Можа калі хто з прыемнасцю пачытае, як было гэта даўней.

Буслы

У садочку пры дарозе
З даўніх часоў на бярозе
Буслы завяліся.

Вельмі было дарагое
Ім гняздо свае радное

На век з ім зжыліся.

Але людзі захацелі
Каб то буслы праселі
На другі бок саду.

Для таго слуп укапалі
Барану прымацавалі
Розную прыладу.

Тыя ж буслы больш цанілі
Гняздо, што дзяды зрабілі
З ім не рассталіся.

Вельмі было дарагое
Ім гняздо свае старое
На век з ім зжыліся.

Семьдзесят гадоў таму назад на забалочаных зялёных абшарах вёскі Кнаразы шмат вадзілася буслоў. Свае гнёзды яны рабілі на падрыхтаваных для іх баранах ці колах ад старога воза на клунях, хатах ці проста на разгалінах старых дубоў. Галоўным харчаваннем буслоў былі жабы, жукі і слімакі на незмеліяраваных сенажацях, мышы і пэндракі на пашнях, а рыбы і ракі ў невялікіх рэчках Арлянцы і Бялцы. Не пакінуць буслы і ядавітых вужоў у лясах. Вельмі смела яны сваімі доўгімі крыллямі дразняць змяю, а калі яна выпусціць на пер'е свой яд, тады буслы бяруць змяю за галаву і нясуць на гняздо для сваіх буслянят. Сяляне вельмі паважаюць і шануюць гэтую вельмі карысную птушку. Носяцца пагаворкі, што нібы буслы прыносяць у калыску маленькіх дзяцей, ці то праўда?

25 марца (старога стылю) падчас свята Благавешчання гаспадыні пякуць пірагі і спецыяльна зробленую для дзяцей буславу лапу, бо гэта якраз тая пара, калі прылятаюць з выраю буслы і сваім вясёлым клекатаннем абвяшчаюць прыход вясны



Кнаразоўскія дзяўчаты: Марыя Федорук, Валя Федорук, Ніна Семенюк, к. 1955 г.; са збораў Ольгі Федорук

і цёплай пары года. Ёсць яшчэ адна прыкмета, якая датычыць дадатніх валёраў бусла, а менавіта: шуляк або варона ніколі не ўкрадуць маленькіх цыплянят з панадворка, бо буслы думаюць, што гэтыя шкоднікі хочуць узяць яйкі ці бусляняты. Як толькі буслы пабачаць іх, то зрываюцца з гнязда, ляцяць на спатканне і адганяюць іх ад загроды.

Хачу апісаць адну прыгоду, якая была з буслам на маім панадворку. Блізка каля маёй хаты ёсць сенажаць. Падчас сенакосаў напалавіну падсушанае сена складаецца ў высокія копны на выпадак дажджу. Каля адной копны, наеўшыся жабаў, сядзеў і драмаў бусел. Мой сусед – малады хлапчук Жоржык Ваўранюк, асцярожна падпоўз і з-за капіцы раптоўна накінуўся



на бусла, які не паспеў узмахнуць крыллямі і папаўся ў рукі гэтага хлопца. Доўга бусел мужна бараніўся, кляваўся дзюбай і тармазіўся, але хлапец асіліў яго і прынёс да маёй хаты. Тут было шмат маладзёжы. Зблізка аглядалі яго. Дзюба, якая здалёк здаецца малою, у самай рэчы вельмі доўгая і рагаватая, так што цяжка жабе, мышы ці вужакові вызваліцца. Па кароткай нарадзе маладзёж пастанавіла нашыць для бусла на шыю моцную чорную ленту шырынёю каля 4 см і выпусціць. Бусел паляцеў, але не на гняздо, а на сенажаць. Пасля пpыляцеў у сваё гняздо. Быў гэта бусел, а не бусліха. Праз тры гады кожную вясну гэты бусел са сваёй жонкай прыляталі раней і рамантавалі гняздо, а на другі ці на трэці дзень прыляталі буслы, якія ў мінулае лета былі бусьлянятамі. Лічылі яны, што тут нарадзіліся і маюць права заняць гняздо па наследству як спадкаберцы. Старыя лічылі гняздо сваім і не пускалі іх. Тут завязвалася такая бойка, што нераз аж пакоцяцца з гнязда па стрэсе і ўпадуць на панадворак. У рэзультаце заўсёды старыя аставаліся, а маладыя мусілі шукаць сабе новае месца і рабіць гняздо.

Падчас другой сусветнай вайны, ў канцы ліпеня, гітлераўскія немцы вывезлі з Белавежскай Пушчы ўсіх жыхароў дваццаці васьмі вёсак, у тым ліку і я быў вывезены з сям'ёй, а цэлая гаспадарка знішчожана. На маёй клуні было гняздо, а ў гняздзе 5 буслянят ужо гатовых да палёту, але яшчэ не зляталі з гнязда. Усе будынкі былі спалены, каб савецкія партызаны не мелі прыстанішча і дапамогі мясцовых жыхароў. Згарэла і мая клуня разам з гняздом. Цікава, ці бусляняты паляцелі, ці згарэлі ў гняздзе? Гэтага не прыйшлося пабачыць.

Былі выпадкі, што прыляцяць буслы ранавата, а выпадзе снег і няма ніякай спажывы. Калі я даваў на дварэ ў карыце пашу для курэй, напрыклад вараную бульбу з асыпкай то буслы елі разам з курамі, а дзеці кідалі ім адпады мяса з кухні. Буслы хутка і добра пазнавалі гаспадара і сям'ю і зблізка можна было іх аглядаць.

Калі асушылі забалочаныя сенажаці і ўрэгулявалі раку Арлянку, як прыток Нарвы, буслы ўжо не мелі столькі жаб ці іншага харчавання. Цяпер буслоў у ваколіцы вёскі Кнаразы штораз менш, а можа настане такі час, што іх зусім не будзе? Птушка гэта прыгожая. Ніякай шкоды не робіць, а знішчажае шкоднікаў. Трэба гэтай птушкай апекавацца і рабіць прылады, як гаворыцца ў вершы, дзе бы буслы маглі зрабіць сваё ўласнае новае гняздо. Буслы - гэта вельмі разумная птушка. Перад тым, як распачаць будоўлю гнязда бусел, як найлепшы інжынер, усебакова аглядае зробленную прыладу і калі пераканаецца, што моцная канструкцыя, то прыступае да працы.

Вельмі шкада, што яшчэ ёсць хлапчукі, пераважна школьнага ўзросту, якія нераз кідаюць каменнямі ў бусла, які сядзіць у гняздзе або ходзіць за плугам па раллі і ловіць мышэй.

Форма будоўлі

Даўнімі часамі людзі не ўмелі рэзаць пілою дрэва на дошкі. Хаты і іншыя будоўлі ставілі з калотых ці абцесаных тапаром дылёў або з круглых бровен. Не было дошак і не рабілі аблямоўкі вокан. Звычайна ў тым месцы, дзе хацелі зрабіць вакно, пакідалі дзірку на вышыню і шырыню дыля. Не рабілі рамы, а ўстаўлялі цэлае шкло і гэта было акно прыблізна 35 х 35 см. Пасля рабілі ваконныя рамы з так званымі коцікамі. Але заўсёды вокны былі надта малых памераў, а было іх ў хаце толькі тры. У хлявах вокан зусім не рабілі. Самыя будынкі ставілі фронтам да вуліцы,



Кнарозоўскія дзеці на фоне гаспадарчай забудовы вёскі, 1955 г.; са збораў Ольгі Федорук

а клуні на сена і збожжа стаялі далёка ад жылых памяшканняў на адлегласці каля 3 метраў ад Загараднай дарогі.

Прысценак

Ад вуліцы стаяў прысценак. Тут, па магчымасці, утрымлівалася цяпло. Замест печкі зімою ставілі 5-10 штук авец, якія цяплом свайго цела абагравалі прысценак. Каб было цяплей, некалі ўсю хату на зіму абкладвалі снапамі саломы. У прысценку бліжэй вясны несліся гусі ды выседжвалі гусянят. Тут стаялі горчкі з квашанай капустай, буракамі, а часам з агуркамі. Калі ў каго была вялікая сям'я, тут рабілі нарыложак і пераважна начавалі тут маладыя.

Хата і печка

Наступным памяшканнем побач з прысценкам была самая *хата*. Па магчымасці была гэта вялікая ізба. Як толькі ўвойдзеш з сеняў у хату, дык у правым вугле каля ўваходу стаяла вялікая глінабітная руская хлебная печка, якая сваімі зевамі і заслонкай глядзела ў вакно. Яго заўсёды тут выцінялі, каб было відна ў пячы. Жалезных шыбраў тады не было. Тую дзірку, кудою выходзіў дым з хаты на двор праз дымнік, затыкалі жмутом з розных ануч і называлі проста заткалом. Калі хто каму засланяў святло ад вакна або лямпы, то казалі: *Одступіся ты, заткало!* На пячы было цёпла. Звычайна зімою спалі тут дзеці ці зусім старэнькія бабулі і дзядулі. Пад столлю над печкай вісела цыбуля дымка вязаная ў вянкі. Каля печы быў прыпечак. Печак-сцяновак тады не было.

Месцы для малітвы, яды і адпачынку

Ад хлебнай печы і да сцяны прысценка быў *запічак* – некалькі дошак, адным канцом паложаны на прыпечку, другім жа на лаве каля сцяны прысценка. На запічку звычайна пад адным *радном* спалі гаспадар з гаспадыняй, а часам нават маленькае грудное дзіцё, хаця па цяперашніх поглядах гэта было не здорава. Самую пасцель складаў шырокі на цэлы запічак сеннік набіты не сенам а саломай, доўгая - амаль на метр - падушка і шырокае радно або росцілка. На дзень складвалася на адну кучу і прыкрывалася як найпрыгажэйшай плахтай. Другая лава стаяла пры сцяне ад панадворка. За гэтай лавай заўсёды тарчала сякера, адсюль і прымаўка: *знайшоў сякерку за лаўкай.* Там, дзе спатыкаліся дзве лавы стаяў стол, а на сцяне пад самай столлю вісела часта з дзесяць рэлігійных абразоў. За абразамі хавалі розныя дробныя рэчы, нпр.: кніжку за ўпакой ці за здароў'е, бумажнік на грошы ці махорку, каб дзеці не дасталі, і ўсё, што трэба было хаваць ад дзяцей.

Калі ўвойдзеш ў хату, а ўваход быў такі нізкі, што трэба было схіляць галаву, каб не набіць гуза, адразу кідаюцца

ў вочы кругом лавы, стол, каля стала малы ўслончык, на якім падчас яды сядзела гаспадыня з малым дзіцём на руках, а за сталом на самым важным месцы сядзеў гаспадар. Тут ён кавальскім нажом краяў і дзяліў кожнаму лусту чорнага хлеба. Гаспадыня ставіла на стале вялікую міску з ежай, кожны меў сваю пазначаную драўляную грушовую ложку, якую мусіў пасля кожнай яды дакладна аблізаць. Талеркі, відэльцы, сталовыя нажы ці шклянкі тады не былі ў модзе.

Чорны хлеб заўсёды ляжаў на стале, прыкрытым абрускам. У багатых гаспадароў тут быў і пірог. Ні ў адной хаце не было шафы, крэслаў ці іншай мэблі. Каля запічка на градцы вісела плеценая з ракіты калыска для наймалодшага дзіцяці. На сярэдзіне хаты, пад столлю была шырокая трама, прымацаваная цьвікамі да бэлькаў. На траме ляжала нейкая бялізна, кніжкі, калі былі наогул у хаце, шапкі, рукавіцы, башлык і іншыя дробныя рэчы. Ва ўсіх хатах падлога была з гліны. Час ад часу пасыпалася чыстым жоўтым пяском. Пад запічкам быў запас бульбы на цэлую зіму. Пад печкай у некаторых гаспадынь зімою сядзелі куры, а певень спяваў кукарэку. Гэты певень замяняў цяперашні гадзіннік. Ён будзіў гаспадароў ад сну.

Сені

У сенях было ажно чатыры дзьверы. Адны, якія вялі на панадворак суседа, называліся тыльні дзверы. Другія служылі як уваход у камору, уваход у хату і ўваход ад свайго панадворка. Вокан тут не было. У кутку стаялі жорны, у якіх малолі збожжа на муку. Каля жорнаў стаяла драўляная ступа і тут жа аднаручны або двуручны таўкач. У ступе таўклі куццю і розныя кашы. Каля сцяны стаяў саламяны кубэль з зернам для кур, тут жа церніца для апрацоўкі льнянага валакна і канопляў, калаўротак і іншыя прадметы. Часам можна было тут пабачыць цэбар для свіней. На лавах стаялі мяшкі са збожжам. Тут жа драбіна, па якой гаспадыня ўлазіла на гару, каб развесіць бялізну.

У каморы стаялі куфры з палатном, хусткамі, бялізнай і рознай вопраткай. За каморай хлявы, калодзеж з журавам, а далей асобна клуня. Нідзе нельга было знайсці маленькай будкі – убікацыі.

Няўзгоды ў сям'і

Як свет стаіць, у некаторых сем'ях бываюць розныя непаладкі, сваркі, а нават пабоі. Тут заўсёды перамагае закон сільнейшага. Часта становяцца прычынай сваркі эканамічныя недаразуменні. На валовай шкуры не спісаць усіх тых непаладкаў.

На прыклад, калі прыходзіць дахаты прыступа, то тут найчасцей папрокі, што ён мала ўлажыў у гаспадарку грошай, адзежы, ці ў постаці іншага пасагу, як то карова, авечка ці парася. Пасаг недзе называюць вено. Тут яму заўсёды кажуць, што у гаспадарцы яго ўласнасці ніякай няма. Што калі б быў хто іншы, то было б значна лепш і г.д.

Усе няўзгоды і сваркі ні да чаго добрага не даводзяць. Чалавек перажывае ўнутраныя расстройствы. У яго адпадаець ахвота да працы. Ён ходзіць як сам не свой, а чужы, нікому не патрэбны. У яго работа не спорыцца. Аб гаспадарцы менш дбае. Не праяўляе ніякай карыснай ініцыятывы. Гаспадарка падупадае, марнее. З нуды пачынае празмерна многа піць, а нават п'е гарэлку. Становіцца лянівым і незарадным. Яму брыдне жыццё і адыходзяць сымпатыі ці сямейныя пачуцці да жонкі ці дзяцей.

Тое самае можна сказаць і аб нявестцы, якая прыходзіць як бы ў чужы дом. Калі ў тым доме ёсць толькі муж, або яшчэ

хто нібудзь, як называюць свекар, ці сама ўжо старэйшая свякруха, то сваркі тут ўжо альбо няма, альбо бываюць вельмі рэдка. Часцей зноў такія сваркі бываюць, калі жывуць яшчэ абое бацькі, адна ці больш яшчэ незамужніх дзяўчат ці наогул, калі вялікая, а дрэнна сарганізаваная сям'я. Праца нявесткі не дацэньваецца. Яна якбы непатрэбная ў гаспадарцы. Найчасцей прычынай сваркі бывае дрэнна выхаваная маці мужа, ці як кажуць свякруха. Ёй перад ўсім не падабаецца тое, што яе сын да шлюбу быў вельмі добрым сынам, а калі ажаніўся і прыйшла нявестка, то ўсе свае пачуцці аддае ён сваёй жонцы. Пры сварцы і спрэчках усплываюць розныя праклёны і прытычкі. Па некалькі дзён не адзываюцца адна да другой, фыркаюць узаемна. Часта робяць на злосць усякія пакасці. Розныя непатрэбныя скаргі і жалі перад суседкамі, а нават перад судом на нявестку, ці нявестка на свякруху. Тут ужо не жыццё, а чыстае гора. А гэта усё ад таго, што нявестку, якая была да вяселля чужым чалавекам лічаць далей чужым.

Старэйшыя бацькі калісь таксама пераживалі такія ж няўзгоды і ніяк не могуць упрытомніць, што гэта нядобра. Тут можна было б сказаць пагаворкай: *Забыла карова, як была цялём.* Бо з таго моманту, калі пасля шлюбу прыходзіць у дом новы член сям'і то яго трэба цаніць, шанаваць, паважаць як свайго ці то зяця, ці нявестку. Там, дзе сям'я згодная, добра арганізаваная ў працы, у жыцці і ўзаемных адносінах, там на дробныя рэчы не звяртаецца ўвагі. Там праца спорыцца, там час ляціць хутка і прыемна. Найлепш не пачынаць ніякай сваркі, бо жывем ў эпоху вялікіх перамен. У першую чаргу трэба было б зразумець шкоду ад векавых непаладкаў і ўсякімі спосабамі імкнуцца да іх ліквідацыі. Толькі ў згодных сем'ях ёсць праўдзівае жыццярадаснае жыццё.

Старыя панны

Калі дзіця народзіцца, а будзе яно жаночага роду, то кажуць: прыгожая дзяўчынка або лялька. Пасля кажуць – прыгожая панна, а калі пераваліць векам за 25 год ці болей, то кажуць – старая дзяўчына або старая панна. Дзяўчаты вельмі не любяць гэтакіх непрыемных назваў.

У кожнай дзяўчыны ад наймалодшых гадоў найлепшай і найпрыгажэйшай забаўкай з'яўляецца лялька і не толькі абы якая, а канечне мусіць быць як найбольшая і такая, каб мела прыгожыя валасы, вочы і твар, і каб яшчэ гаварыла: *мама.* Тады дзяўчына дае ёй якое небудзь імя як Кася, Бася ці Зося, носіць яе на руках, але не так, каб узяць недбала за руку, нагу ці галаву, а абавязкова так, як мамы носяць сваіх праўдзівых жывых лялек, усё роўна дзяўчынак ці хлопчыкаў. Мала таго, дзяўчынкі надта дбаюць, каб лялька мела прыгожую, што раз новую сукенку. Калі маці не мае часу забаўляцца з лялькамі, то дзяўчынкі самі вышукваюць ёй шматак, зрэзкаў і шыюць новыя сукенкі. Апранаюць паліто, укутваюць у якуюсь хустку, шаль ці малы коцык, каб нібы было цёпла ляльцы і г.д. Празмерна многа часу затрачваюць на калыханне ў люльцы, калысцы ці ў возіку. Усё гэта гаворыць, што ў кожнай дзяўчынкі ўжо ад нараджэння, ці ад наймалодшага ўзросту развіваецца што раз больш інстынкт быць мамай. Любяць з лялькамі спаць у адным ложку. Але з гадамі перастаюць забаўляцца лялькамі, а імкнуцца да замужняга, сямейнага жыцця.

Нараджаюцца вялікія пачуцці да хлопцаў. Часта нараджаецца так званае дзяцiннае закаханне, якое пасля пераходзіць ў праўдзівае і шчырае каханне. Нездарма і не без падставы вялікі рускі паэт і пісьменнік Аляксандр Сяргеевіч Пушкін казаў: *Любви все возрасты покорны.*

Хлопцы жа ад наймалодшых гадоў любяць забаўляцца ў *жалнежы*. Абы якога кавалак кія знойдзе, завяжа па двух канцах нейкі шнурочак, перакіне праз плячо і выабражае з сябе салдата, а калі падрасце і стане праўдзівым жалнерам, тады менш дбае аб стрэльбе ці вайсковай іншай прыладзе, а ахвотней забаўляецца з як найпрыгажэйшымі лялькамі – дзяўчатамі і самую найпрыгажэйшую выбірае сабе за жонку. Адсюль выснова, што калі дзяўчына з уроды, ўзросту, характару, культуры, захавання мае як найлепшыя валёры, ды яшчэ багатая, то ёй не цяжка знайсці сабе жаніха, выйсці замуж і быць праўдзівай мамай ужо не для лялек, а для жывых, здаровых і вясёлых дзяцей. А калі гэтых дадатніх валёраў няма, то астаецца старой паннай, дзеўкай.

Вельмі часта цяжкі лёс спатыкае гэтых жанчын. Таму ўсе дзяўчаты імкнуцца абавязкова выйсці замуж. Бо калі яны яшчэ ў сілах жывуць пры браце, мачысе ці пры іншых родных з'яўляюцца яны тым парубкам, пастухом, ці проста папіхачом да ўсіх найцяжэйшых і найбруднейшых прац у сельскай гаспадарцы. А калі з гадамі ды пад цяжарам найгоршага жыцця страціць сілы і здароўе, то тут спатыкае яе найгоршае гора, якое толькі можам сабе ўпрытомніць. Не мае яна дзяцей, няма і нікога блізкага з кім бы можна было пагаварыць і выліць ўсё гора адзіноцтва, паскардзіцца ці параіцца. Для ўсіх яна чужая.

Маю тут на ўвазе некалькі старых паннаў з вёскі Кнаразы, а ёсць іх не мала ва ўсім свеце, якія перажывалі найгоршыя этапы нешчаслівага жыцця, а менавіта:

Першая: Была ў Езыфата Кірылюка родная сястра яго жонкі ці як кажуць швагерка, называлі яе Яўдоленька. Самае цяжкае было яе жыццё. Яе выганялі з хаты, не давалі есці, білі, а мэтай тут было тое, каб пазбыцца яе. Зусім не мела яна ніякай адзежы ці абуўкі. Сярод зімы хадзіла па снегу босая, а ўстыдлівыя часткі яе цела былі не прыкрытыя, што было прычынай збыткаў тадышняй моладзі над беднай, няшчаснай жанчынай. Прыходзіла яна да якой чужой хаты і прасіла хоць што – небудзь з'есці. Была надта галодная. Ела многа. Некаторыя больш зычлівыя дапамагалі ёй і кармілі. Не ведаю чаму, але не было каму наладзіць ёй іншае жыццё. Езыфат быў приступа і па праву яна магла б адсудзіць палавіну гаспадаркі, якая належыла толькі для яе і я замужняй сястры. Пад канец жыцця яна мела псыхічныя расстройствы, аслабла і памерла з голаду.

Другая была Ульяна Крышпінюк. Мела яна бацьку і аж чатырох братоў. Пашла за служанку да пані Дамброўскай да маёнтку Беляноўшчына. Цэлае жыццё яна тут з ўсіх сіл працавала. Выхоўвала ўнукаў Дамброўскай: Генрыха, Людвіка і Эўгеніюша, а калі пастарэла і не магла ўжо цяжка працаваць, то нават не далі ёй якога кутка ў хаце і з голаду памерла. Людзі гэтыя і цяпер жывуць і не ведаю, ці не мучыць іх сумленне, або ці не спаткае іх лёс той няшчаснай жанчыны.

Трэцяя была дачкою Івана Крышпінюка. Звалі яе Кульгавая Тэкля. Бацька яе жыў багата, быў вельмі паважаным чалавекам. Але хутка памёр. Тэкля жыла пры жанатым браце Андрэю. Памагала яму ў працы і ў выхаванні дзяцей, не мела ад яго ніякай крыўды. Не выйшла яна замуж толькі таму, што мела адну нагу можа на два сантыметры карацейшую і чуць, чуць пакульгвала. Але была вельмі вясёлая, спрытная, прыгожая і тая кульгавасць не перашкаджала ёй у працы. Была здольная да спеву і ніадна з дзяўчат не магла так спрытна і прыгожа танцаваць або так хутка бегаць як яна. Але звалі яе кульгавай і з той прычыны не выйшла замуж. Пемерла ў Андрэя першая жонка.



Ажаніўся другі раз і ўзяў Семёнаву Марысю, а сам хутка памёр. Тэклі пад старасць прыйшлося дажываць пры Марысі. Вялікае гора яе тут спаткала. Ёй не хапіла месца ў бацькоўскай хаце. У найсільнейшыя маразы яна спала на гарышчы. Ад надмерна цяжкай працы ў дзень і ад спання ў скуляным палажэнні ад марозу ў ночы яна пад старасць не магла выпраставацца і нармальна хадзіць. Хадзіла яна з кароценькім кійком, зусім прыгнутая да зямлі, а часам проста хадзіла, як кажуць, на чацвярых. Моцна пахудзела з голаду і холаду. Марыся не толькі не дапамагала ёй, але не дапускала, каб хто-небудзь з літасці накарміў ці дапамог ёй. Памерла ці проста змерзла падчас сну на гары і не вядома колькі дзён яна там ляжала.

Шмат іншых старых паннаў і цяпер жыве ў Кнаразах. Але сёння над абяздоленымі жанчынамі ці мужчынамі старцамі, калекамі ці сіротамі разцягнута апека спалэчна, якая ў меру магчымасці дапамагае грашыма, адзежай, абуўкай ці правізыяй і ў выпадку патрэбы судовым парадкам змушае да аліментаў або вызначае рэнту за пераданыя дзяржаве гаспадаркі.

Але так ці інакш, лёс старых паннаў дрэнны хаця б таму, што яны не маюць усё жыццё таго сямейнага шчасця, якое маюць іншыя жанчыны.

Святочныя дні

Падчас паншчыны нелёгка жылося працоўным людзям. Паны не плацілі за працу, а лічылі, што падданы хлоп дарма павінен працаваць на пана. Таму людзі любілі святочныя дні. А было іх нямала, бо аж 90 дзён у годзе, ці карацей можна сказаць, што святкавалі кожны чацвёрты дзень. Калі палічыць дакладней - то ў годзе 52 нядзелі, 12 дзён двунадзесятых святаў, а на Раждаство, Крэшчэнне, Пасху і Тройцу па тры дні, то разам 12 дзён. Далей св. Міколы, Юрыя, Ануфрыя, Ганны, Тэклі, Івана, Кузьмы і Дзямяна, Яна і іншых, а разам 90 дзён.

Кожнае свята мела свае звычаі і традыцыі.

Дзень перад Новым Годам называлі „Га(га)тухай”. Хадзілі пад вокны га(га)таць, спявалі адпаведныя жартоўныя песні і віншавалі гаспадара з гаспадыняй, а за гэта атрымлівалі кавалак кішкі, кашанкі ці што падобнае. На Новы Год служба ў царкве адбывалася ўночы. Моладзь піла водку, часам хлопцы разам з дзяўчатамі ладзілі патанцоўкі.

На Крэшчэнне хадзілі з крэсным ходам на раку, хаця б нават і быў найбольшы мароз. Тут сбяшчэннік пагружаў крыж у ваду, а хор спяваў „Во Иордане крещающагося”. Былі такія, што ў гэты момант ўскоквалі голымі проста ў раку.

Грамніцы святкавалі другога лютага. На свята бацька або маці падсмальвалі з чатырох бакоў на крыж валасы сваім дзецям і сажай ад васковай свечкі выпісвалі крыж на бэльках у хаце і на ўшаку ўваходных узвярэй.

На Благавешчанне пяклі буслову лапу і абавязкова пасцілі.

На Юрыя першы раз выганялі святою лазою ў поле жывіну на пашу.

На Вербніцу неслі да царквы лазы, якія свяцілі, а потым імі хлопцы білі дзяўчат.

На Вялікдзень дарылі кумы сваім хроснікам па пары крашаных яек, а нарачоная свайму хлопцу цэлую паўкапу сырых ці крашаных – так званага *Валачэбнага*. Свята Пасхі святкавалі вельмі ўрачыста. Некаторыя *жыльнікавалі*, гэта значыць ад чацьверга да нядзелі нічога не пілі і не елі. Пад Пасху пяклі цэлую капаньку пшанічных пірагоў, варылі цэлую капу яек, каўбасы, сыр, масла, соль, куньпу і ўсё гэта выносілі на агульны пляц на вуліцы


Сям'я: Маісей і Анна Онішчукі (сядзяць у цэнтры), за імі Тэкля Федорук, 1943 г.; са збораў Ольгі Федорук

і ўстаўлялі ў адно месца некалькі гаспадароў. Тут падыходзіў свяшчэннік і свяціў ўсё гэта. За тое атрымліваў ад кожнага гаспадара па 2 пары сырых яек і маленькую зумысля прыгожа спечаную пасачку (так каля 1/2 кг). Апрача таго за гэты труд кожны гаспадар мусіў даць для свяшчэнніка ў час жніва аднаго жанца з сярпом ці косара з касою на цэлы дзень.

На Ушэсце – гэта саракавы дзень пасля Пасхі, які прыпадае заўсёды ў чацвер, ехалі масава на кірмаш да Бельска.

На Тройцу аж тры дні святкавалі і найчасцей тады адбываліся шлюбы маладых і вясельныя забавы.

На Яна, 24 чэрвеня, ў пасынкоўскай і некаторых іншых цэрквах адбываўся фэст ці отпуст.

На Пятра і Паўла, 29 чэрвеня, ўсе пастухі лічылі, што ўжо прапаслі статак паўгода. Складаліся, што маці дала ў торбачку, напр.: сыр, яйкі ці кусок каўбасы і некалькі грашэй на квас (па 5 г за кварту) і так супольна выпівалі і ўгашчаліся на так званым *Тэраме* каля *Гаёў*.

На Ліяша 20 ліпеня асабліва шчыра маліліся ў Грыневічах, бо верылі, што святы Ілья ў калясцы ездзіць па небе і адтуль пасылае гром і маланку на неверных ці грэшных людзей.

Да Спаса 6 жніўня не можна было абрываць яблыкі ці грушы. У гэты дзень у царкве свяцілі плады. Але дзеці не надта трымаліся звычаю і не баяліся граху, бо арганізм патрабаваў гэтых складнікаў вітаміновых.

На Усекнавенне Галавы св. Яна Прадцечы шчыры пост.

На Воздвіжанне Крыжа не можна нічога браць з зямлі.

На Пакрову казалі: *Пакрова ўсё з поля похова* – значыць – да гэтага дня трэба ўсё з поля пазбіраць. Нам трэба памятаць аб гэтым.

Ад Увядзення ў Храм – 21 лістапада спяваюць калядныя набожныя песні з Богогласніка і проста глупцом назвалі б таго, хто б заспяваў каляды раней хоць бы толькі на адзін дзень.

Шостага снежня Свята Міколы (імяніны цара Мікалая II), тады казалі: *На Міколу ні сані ні колы*, Значыць найгоршыя дарогі, што ні прайсці ні праехаць, а шосаў тады зусім не было. Цяпер усюды шосы асфальтовыя.

Асабліва ўрачыста абходзілі каляднае свята. Тут зазвычай на некалькі дзён школы распускалі на канікулы ўсіх школьнікаў. Настаўнікі раз'язджаліся да сваіх бацькоў. Сяляне мелі шмат працы, каб падрыхтаваць для хатняй жывіны пашы на два тыдні, а жанчыны рабілі парадкі ў хаце, падрыхтоўвалі як найбольш і найлепшую ежу для ўсіх дамаўнікоў і для гасцей на ўсё свята. У сачэльнік прыносілі вязку мяккага пахучага сена і яго на лаве, за сталом

падкладалі пад абрусак. Таксама прыносілі кветку са збожжа, ці, як некаторыя называлі, *Дзеда* і ставілі яго ў кутку за сталом пад абразамі і ён стаяў тут аж да *Трох Кроляў*. А тады зрэзвалі каласы і аддавалі жывёле разам з сенам, а саломай абвязвалі ў садзе яблыні ці грушы. Старэйшыя людзі нічога ў Сачэльнік не елі аж да *Зары*. Тут было падрыхтавана шмат блюдаў, як: рыба свежая, следзі, калядны постны боршч з грыбамі, варэнікі з макам, аўсяны кісель, пастарнак, вараныя грушы, пампушкі на алею льняным і г.д. Набажэнства ў царкве адбывалася ноччу, тут казалі: *Ну, едэм на Ўсюночню до цэркві!* Пад Каляды кожны гаспадар, калі меў, то забіваў вяпрука. Елі тады многа мяса, пілі гарэлку, весяліліся, а часам пабіліся па п'янаму.

Хлапчукі і некаторыя дзяўчаты на другі дзень каляд з гвяздою ці без гвязды хадзілі да кожнай хаты і спявалі калядныя песні, віншуючы гаспадара з гаспадыняй. За гэта кожная гаспадыня давала ўкрушак хлеба, грошы, а калі мела дачку да выдання замуж, то і каўбасу. Калі б каторая гаспадыня адмовіла калядпікам, то тады пачула б вельмі непрыемныя рэплікі па яе адрасу, а значыць Хвала Хрысту часта канчалася хуліганскімі выбрыкамі.

Усе гавораць і ўпэўнены ў тым, што на Каляды хатняя жывёла размаўляе людскім голасам. Ёлак з цацкамі і падарункамі як цяпер у кожным доме калісь зусім не было, а тым больш спецыяльных камплетаў электрычных лямпачак. Агульны святочны настрой быў добры. Людзі, якія цэлае лета цяжка працавалі на паноў на маёнтках, ці на ўласных гаспадарках, цяпер мелі больш вольнага часу. У гэты час маглі з'есці з акрасаю і мясам абед ці вячэру, а самая кандыцыя людзей выглядала іначай. Уся моладзь з нецярпеннем чакала калядных святочных дзён. У час гэтых свят грэхам вялікім лічылася хоць што небудзь шыць, нават прышыць гузік да вопраткі, бо ў гэтым доме абявязкова магло нарадзіцца дзіцё, цялё, жэраб'е ці парасё з зашытым заднім адбытовым праходам. А калі што абавязкова трэба было пашыць, то ішлі да той найбяднейшай хаты, дзе зусім не было ніякай хатняй жывёлы. На знак гэтага ў Сачэльнік зашывалі на градцы ў хаце шырокую белую шматку, каторую скідалі толькі пасля свят. Быў яшчэ звычай, што падчас калядных святочных дзён на працягу двох тыдняў нічога не можна было рабіць. Былі гэта *Богаты вэчорыє*. Нудзілася гэта жанчынам, бо яны любілі па вечарах прасці кудзелю.

Дажынкі

Калі добра заканчвалася якая-небудзь работа, то часта адзначалася пэўным пачастункам. Тут пілі гарэлку, елі лепшыя стравы і жадалі гаспадару як найлепшага здароў'я і шчасця ў жыцці. Так напрыклад, калі пачыналі якую-небудзь будоўлю, то пілі *Вінковое*. Пры пакупцы ці продажы якой-небудзь большай штукі ў гаспадарцы: каня, каровы, вяпрука ці палоскі зямлі, заўсёды пілі *Літкуп* або *Барыш*. Часта пры такім літкупе ўпіваліся да таго, што прапівалі ўсе атрыманныя грошы за штуку і дахаты вярталіся без тавару і без граша.

Асабліва былі распаўсюджаны дажынкі пры жнівах жыта. Адбываліся яны па рознаму. Калі гаспадар з цэлай працаздольнай пры жнівах сям'ёю шчасліва закончваў іх, то апошняй жмені збожжа не зрэзвалі нізка, а толькі зжыналі каласы, а салому упрыгожвалі рознымі кветкамі. Называлі гэта *Пэрэпэліцёю*, якая заўсёды была як бы напаказ пры дарозе. *Пэрэпэліцю* ўбіралі кветкамі пераважна дзяўчаты. Тут спявалі адпаведныя, жніўныя песні, напрыклад *Ой, жніся, жніся.* Пасля сядалі каля. Гаспадыня даставала з таболкі як най-

лепш падрыхтаваны абед. Абедалі, крыху адпачывалі і тут заканчвалася ўрачыстасць. У вясёлым настрою ішлі дахаты і ў руках няслі сярпы. Іначай абходзіліся дажынкі ў тых гаспадароў, якія мелі шмат зямлі і жніва, а мала сваіх жанцоў. Склікалі яны так званую *Талоку*. Сюды прыходзілі на дажынкі толькі за пачастунак. Тут заўзята жалі. Таксама ўбіралі *Пэрэпэліцю* і спявалі, але адразу ўсе разам 10-20 асобаў ідуць проста дахаты гаспадара. Гасціна часта з музыкантам працягваецца да позняй ночы. А калі б гаспадар недастаткова пачаставаў, то на другі раз не пайшлі бы на дажынкі.

Мала было ў звычаю дапамагаць пры жнівах у той найбяднейшай удавы ці сіраты, якая не мела магчымасці даць пачастунку з гарэлкаю. Дапамагалі ёй толькі найбліжэйшыя, праўдзівыя, сардэчныя, добрыя суседкі, ці хто са сваякоў. Яны таксама рабілі *Пэрэпэліцю* і таксама ўбіралі кветкамі. Але па заканчэнні крыху адпачывалі, пагаварылі, можа нават паплакалі на сваю сірочую нядолю, а пасля на развітанне ў знак падзякі моцна пацалаваліся і разыйшліся. З гэтай прычыны вялікі рускі паэт Аляксандр Сяргеевіч Пушкін ў вершы казаў:

Позняя осень, грачы прылетелі,
Лес обнажился, поля опустели,
Только не сжата полоска одна,
Грустную думу наводит она.

Зжатыя снапы жыта, пшаніцы, аўса, ячменя ці іншага збожжа заўсёды стройнымі радамі стаўлялі дзеля прасушкі. Па-рознаму іх называлі. Калі ставілі дзевяць снапоў, а трыма накрывалі, то называлі *ляшкамі*. Калі ставілі 9 снапоў, а дзесятым накрывалі, то называлі *шапкамі*, або *лялькамі*, а часам *дэсяткамі*. Калі ставілі на прыклад авёс ці ячмень па чатыры снапы, а пятым накрывалі, то казалі што гэта *пятакі*.

Лён

Калісь у Бельску не было рашарні. Лён сеялі мужчыны, а жанчыны палолі, рвалі, малацілі прачамі, мачылі ці слалі, сушылі, пераціралі на драўляных церніцах, трапалі, часалі на самадзельных шчотках, сартавалі, пралі на верацёнах і калаўротках і ткалі. З найгоршага прадзіва ткалі так званыя посцілкі ці як іначай радна. З асмыкаў ткалі каляровыя матэрыялы на нагавіцы і спадніцы, а з найлепшага ільну ткалі тонкае палатно на кашулі.

Калісь не ведалі штучных угнаенняў, без якіх цяжка было вырасціць добры ураджай. Драўлянаю сахою ці таксама драўлянаю бараною не маглі адпаведна падрыхтаваць поле пад лён. Не было і добрага насення. Ураджаі былі слабыя. Калі хто даў больш натуральнага гною, то лён вылягаў і без ліку было многа пустазелля. Самы дарагі час улетку жанчыны сядзелі ў льне і палолі яго. Была гэта марудная і не ўдзячная праца. Калі не даць натуральнага гною, то лён часта зусім слаба рос. Неўраджайны лён то для жанчыны як бы кара Божая.

Тут былі некаторыя забабоны. Напрыклад, насенне ільну для пасева не клалі на фуру, а жанчына нясла яго на плячах, а перад ад'ездам для ратая пякла яечню. Барані Божа, каб хто перайшоў дарогу ды яшчэ з пустым вядром, калі ехалі з дому на поле. Некаторыя ва ільне завязвалі мазалі і гэта лічылася, што хтосьці з найгоршых ворагаў гэтае зрабіў. Тут не шкадавалі горкіх слоў: *Коб рукі, ногі покрутіло*. Калі лён удаваўся, то для гаспадыні гэта была вялікая радасць. Усю зіму яна прала дома ў дзень, а па вечарам магла хадзіць з кудзеляй да суседак і тут да 24 гадзіны пралі і папісваліся спевам, жартамі і рознымі апавяданнямі. Некалі прыходзілі і мужчыны, каб паслухаць спеваў, а часам і падцягнуць баском.

Якія няшчасці прынясла Кнаразам Першая сусветная вайна 1914 года

Вёска Кнаразы знаходзіцца ў такім стратэгічным палажэнні, што тутака ў кожную вайну сходзіліся ўсе шляхі аперацыйных пазіцый. З аднаго боку рака Арлянка і некалькі даволі высокіх пагоркаў, а з другога боку густыя загайнікі хвойных лясоў і далей вялікая рака Нарва. Не без значэння і той факт, што на адлегласці толькі 8 кіламетраў знаходзіцца вузлавая жалезнадарожная станцыя Бельск-Падляшскі, дзе заўсёды адбываліся заўзятыя баі. На ўпамянутых узгорках яшчэ і цяпер часта выкопваюцца людскія косці. Сведчыць гэта аб тым, што яшчэ да першай вайны было тут немала крывавых пабоішч і змаганняў. Без сумнення не абмінула Кнаразоў шведская, турэцкая, мангольская ці напалеонаўская войны.

Але войны гэтыя былі даўно. Мы іх не бачылі і не перажывалі. Нам цяпер здаецца, што іх зусім не было. Але Першую сусветную вайну ўсе мы добра памятаем. Рэзультаты яе былі самыя страшныя. Калі падлічыць толькі ахвяры ў людзях, то напэўна іх было з Кнаразоў не менш як 100 чалавек. Для лепшай ілюстрацыі пералічым некалькі прозвішчаў асоб, якія забіты на самай вайне: Андрэй Перавой сын Аўсенія, Андрэй Ляшук сын Мар'янкі, Іван Янэчкаў Кананюк, Хведар Андрэюк, Дміцер Гродзінскі, Іван Артэмюк, сын Даніла, Тыхонь Іванюк сын Піліпа, Даніла і Себасцьян Андрэюкі, Кірыла Корнілюк, Клемент і Мінь Перавой і шмат іншых.

Усе добра ведаюць такі факт, калі адбываўся паміж рускімі і нямецкімі войскамі бой за вёску Кнаразы. Адзін са старэйшых жыхароў, менавіта Міхалко Гродзінскі, выйшаў на ўзгорак, каб пабачыць як далёка яшчэ фронт вайны. Тут з адлегласці больш за два кіламетры, з боку вёскі Грыневічы Малыя нямецкая куля трапіла ў сэрца і ён быў забіты.

Не толькі непасрэдна на вайне, але значна больш загінула ўсякага ўзросту мужчын, жанчын і дзяцей у час бежанства. Магіламі і крыжамі ўсыпаны ўсе шляхі бежанцаў, аж да найдалейшых пунктаў Урала, Сібіры ці Каўказа. Колькі ж няшчасця і ахвяр панеслі Кнаразы, калі ўсе да аднаго мусілі выехаць і пакінуць свае хаты, свае вякамі навітыя гнёзды, свае цяжкім трудом нажытыя гаспадаркі, жывіну і сельскагаспадарчыя прылады, свае агароды, сады, засеяныя збожжам палі. Немцы ўсё гэта забралі сабе. Забралі яны на шашу Бельск-Беласток усё каменне, якім была выбрукавана вуліца. Вырубалі што лепшы лес у *Свічкові* і адправілі да Берліна. На працягу некалькі год бежанцы пражывалі ў чужых хатах. Хаця і не мелі яны ніякай крыўды ад новых гаспадароў, бо рускі народ наогул выдзяляецца сваёй надзвычайнай дабратою і з поўным зразуменнем спагадаў гэтаму няшчасцю. Але прыродныя пачуцці да роднага краю і хаты цягнулі бежанцаў да павароту на свае месцы.

Калі каму і прыйшлося вярнуцца, то знаходзілі зусім пустую хату, часта без вакон і без дзвярэй, без ніякага запасу харчавання, без семян, без прыладаў да працы на раллі. Толькі ў некаторых хатах ластаўкі звілі сабе гнёзды, каб сустрэць гаспадароў сваім вясёлым шчабятаннем. Тут часта людзі галадалі ці харчаваліся шчавухом, лебядой, пладамі з садоў, а найчасцей працавалі на адзін кілаграм збожжа цэлы дзень працы ў тых гаспадароў, якія нікуды не выязджалі.

Ці толькі ў вёсцы Кнаразы былі ўсе гэтыя няшчасці? Не. Гэты ж самы лёс спаткаў жыхароў некалькіх беларускіх паветаў, так званай Заходняй Беларусі. Цяжка было б падлічыць цыфрамі ўсе страты людскія



Тэкля Іванюк (злевай) у час бежанства ў Расіі, 1918 г.; са збораў Ольгі Федорук

і матэрыяльныя. А каму гэта вайна была патрэбна? Толькі немцам. Яны меркавалі забраць Польшчу, Беларусь, Літву ці Украіну, і тут на гэтых абшарах развярнуць сваё панаванне, а насельніцтва спаўняла бы ролю рабочага вала пад нямецкай кольбай. З другога боку засілле немцаў у правяшчых кругах справакавала цара Мікалая ІІ да вайны. У выніку па некалькі мілёнаў найздальнейшых да працы і найбольш патрабуючых жыццярадаснага, творчага жыцця людзей, як з аднаго, так і з другога боку загінула на вайне. Засталіся толькі калекі, старыкі мужчыны, жанчыны – ўдовы, сіраты і спустошаны край Расіі і Германіі.

Ці выйгралі што ў гэтай вайне заможныя клясы Германіі або Расіі? Таксама абсалютна нічога, бо ў выніку рэвалюцыі ўсе прамысловыя аб'екты, банкі, абшарніцкія маёнткі былі нацыяналізаваны. Улада перайшла да працоўных, а сам цар са сваёю сям'ёю быў таксама забіты. Кайзэр Вільгельм ІІ быў сасланы на вольнае пасяленне на выспу і там хутка памёр. Ці гэта можна было зрабіць іначай? Каб цар Мікалай ІІ і кайзэр Вільгельм ІІ ведалі, што дасць кожнаму з іх вайна, то напэўна ні ў якім выпадку не пачыналі бы ваяваць. Лепш было б і для іх, і для нас, каб мірна ўладзілі спорныя справы. Але неўгамонныя немцы і пасля няўдачы не імкнуліся да добрасуседскага жыцця. Знайшлі яны Гітлера, які як Напалеон хацеў заваяваць цэлы свет, але сам ён невядома дзе падзеўся і цяпер просяць – дайце хоць тое, што мелі да 1937 года.

Аб грамадзе і грамадоўцах

У 1922-1929 гадах я ня мог атрымаць пасаду настаўніка і таму трэба было працаваць у радзімай вёсцы Кнаразы, Бельскага павета ў сельскай гаспадарцы. Жыццё за часоў санацыі было цяжкае. Было тады вялікае безрабоцце ў гарадах, а на раллі вялікае перапаўненне сілы рабочай. Уся лепшая зямля была ў руках памешчыкаў. У сялян адчуваўся зямельны голад. Нічога дзіўнага, што калі паўстала Беларуская сялянска-работніцкая Грамада, то сяляне ахвотна запісваліся ў члены гэтай арганізацыі, і ў хуткім часе дайшла яна да размераў 100 000 чалавек. У вёсцы Кнаразы была невялікая частка грамадоўцаў, бо і тыя члены, якія былі, падвяргаліся розным шыканам, следствам і арыштам. У Кнаразах членамі былі грамадзяне Андрэй Іванавіч Крышпінюк, Рыгор Іванавіч Андрэюк і я, гэта значыць Нестар Нестаравіч Перавой. Андрэй Крышпінюк ужо даўно памёр і пахаваны на могілках у Кнаразах, на так званай Плоскай Гары,

Іосифу Леонтьевичу Дыло

Согласно постановленію 1-го Бѣлорусскаго Съѣзда, состоявшагося въ Москвѣ 24—27 сентября т. г. Бѣлорусская Народная Громада настоящимъ имѣетъ честь довести до Вашего свѣдѣнія, что 19—21 ноября с. г. созывается въ Москвѣ 2-й Бѣлорусскій Съѣздъ, имѣющій своей задачей:

1) Составленіе наказа депутатамъ въ Учредительное Собраніе (форма государственнаго устройства, управленіе Бѣлоруссіей, земельный вопросъ, рабочій вопросъ, образованіе и т. д.).

2) Организацію представительнаго органа по дѣламъ Бѣлорусскаго народа.

3) Разработку вопроса объ этнографическихъ и административныхъ границахъ Бѣлорусскаго края.

4) Разработку матеріаловъ по земельной реформѣ въ Бѣлоруссіи.

5) Заслушаніе отчетовъ о 1-мъ Бѣлорусскомъ Съѣздѣ въ Москвѣ и о работѣ Бѣлорусскихъ организацій и партій.

6) Разрѣшеніе текущихъ дѣлъ.

Въ виду столь важныхъ задачъ, стоящихъ передъ Съѣздомъ, Бѣлорусская Народная Громада проситъ Васъ: 1) делегировать на его засѣданіе 1-3-хъ своихъ представителей, 2) передать имъ письменный наказъ своей организаціи по затронутымъ въ программѣ Съѣзда вопросамъ; 3) привезти на Съѣздъ всѣ тѣ матеріалы, которые находятся въ распоряженіи организаціи и имѣютъ непосредственное отношеніе къ задачамъ Съѣзда, (какъ то статьи, доклады, постановленія, печатные труды, отчеты, карты и т. п. Вмѣстѣ съ тѣмъ, согласно постановленіямъ 1-го Съѣзда просимъ т. т. делегатовъ привезти съ собою справки о погибшихъ за свободу борцахъ-бѣлоруссахъ, въ случаѣ если таковыя справки на мѣстахъ имѣются. Бѣлорусская Народная Громада предоставляетъ всѣмъ делегатамъ безплатное помѣщеніе и дешевое продовольствіе; делегатамъ отъ бѣженцевъ будутъ выданы безплатные билеты на проѣздъ обратно. Всѣ делегаты ѣдущіе на Съѣздъ, должны имѣть при себѣ соотвѣтствующія удостовѣренія.

За всѣми справками по поводу Съѣзда обращаться по адресу: Садовая-Самотечная, Большой Спасскій пер. д. 22, телефонъ 2-74-72 и 1-84-12.

Предсѣдатель Правленія **І. Василевичъ.**

Секретарь **Н. Перевой.**

List Białoruskiej Ludowej Hromady, skierowany w październiku 1917 r. do Józefa Dyło; podpis sekretarza Nestora Pierewoja

а яго жонка Марыся яшчэ жыве разам з сынам Андрэем Крышпінюком. Працуюць на сельскай гаспадарцы.

На адлегласці каля 2 кіламетраў ёсць вёска Зубава. Тутака таксама было некалькі грамадоўцаў, як напрыклад Карп Герасімавіч Зенюк, які доўгі час працаваў настаўнікам у школе ў Гродне. Калі захварэў, была яму зроблена аперацыя на так званы апендыцыт, аднак потым памёр і быў пахаваны на могілках у Гродне. Можа таму і памёр, што быў вельмі дзельным грамадзянінам. Тутака ж у Зубаве быў Фама Іванавіч Карпюк, які і цяпер яшчэ жыве ў Гродне, Кірыла Ефімавіч Лісоўскі, якога не так даўно забіў гром у хаце падчас слухання радыя, і Дмітрук, які загінуў у час апошняй вайны, а яго сын Аляксей скончыў навуку ў Корпусе Кадэтаў і цяпер жыве і працуе як капітан польскага лётніцтва. Аляксей быў маім вучнем у школе ў Зубаве. (...)

Грамадоўцы з Кнаразоў працавалі супольна з грамадоўцамі з Зубава. Дырэктыву ў напрамку працы атрымлівалі з Бельска ад Мартына Такарэвіча, які жыў на вуліцы Касцюшкі, і Карыцкага, які жыў на вуліцы Замковай каля так званай Лысай Горкі, а таксама Каржанеўскага, які жыў у пазнейшы час у Беластоку. Усе яны ўжо памерлі. Дачка Мартына, па мужу Фрэйман, і цяпер жыве ва ўласным доме ў Бельску і ёсць „Terenowy Opiekun Społeczny”. Такая табліца вісіць на яе доме.

Да мяне асабіста часта прыязджала па некалькі паліцыянтаў, акружалі маю хату і рабілі вобыскі. Адзін раз я быў арыштаваны, пяхотай загналі да Орлі, там пратрымалі 3 дні, а пасля разам з Каржанеўскім таксама пехатой загналі да Бельска. З Бельска я пайшоў дамоў. Мая жонка добра памятае ўсё гэта.

Ад 1915 да 1921 года я жыў у Маскве. Бачыў і перажываў скуткі бежанства першай яшчэ царскай вайны. Быў сведкам першай рэвалюцыі, а найбольш мог бы расказаць як праходзіла Вялікая кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя 1917 года. Жыў я тады на Малочным правулку пад № 2 каля Зачаціеўскага манастыра. Тут жа на вуліцы Прэчыстенка быў галоўны штаб белагвардзейцаў, а ў другі бок па простай лініі цэраз наш дом над ракой Масквой была вялікая 4-ярусная фабрыка „Эйнэм”. Тут быў галоўны штаб рэвалюцыянераў. Адсюль было першае выступленне рабочых. Усе снарады і з аднаго і з другога боку пераляталі панад домам, але ні адзін не пашкодзіў маёй кватэры.

Прыблізна цераз год пас-

ля Кастрычніцкай Рэвалюцыі на арганізацыйным з'ездзе, які быў скліканы ў Маскве паўстала Беларуская Грамада ў Маскве [Беларуская Грамада ўзнікла ў маю 1917 г. – рэд.]. Ініцыятарамі гэтага з’езда былі прадстаўнікі Беларускай сацыялістычнай грамады ў Мінску, паколькі памятаю, Язэп Дыла, Аляксандр Бурбіс, які пасля быў міністрам фінансаў у Мінску, сябра Жылуновіч і некалькі іншых. З Масквы былі Язэп Ігнатавіч Васілевіч, які пасля быў дырэктарам Мінскага педагагічнага тэхнікума №2, далей быў адвакат Аляксандр Цвікевіч, сябра Багдановіч, Граматовіч і некалькі іншых, а разам было каля 40 чалавек. Мала, бо гэта быў толькі пачатак беларускага руху. На гэтым з 'ездзе быў я і быў мой швагер Януш Якаўлевіч Кунаховіч, каб арганізавацца вярнуцца на свае родныя сялібы. З гэтай мэтай былі арганізаваны Першы і другі бежанскія з’езды ў Маскве. На гэтым з'ездзе Васілевіч быў выбраны старшынёй, а я сакратаром. Задачай Грамады было аб'яднаць як найбольш беларусаў пераважна бежанцаў, агульнае ўсведамленне аб беларускім народзе, яго гісторыі, літаратуры, а галоўнае – дапамога бежанцам.

У працэсе гэтай працы да Грамады далучаліся пастаянныя маскоўскія жыхары беларускага паходжання, як Усевалад Нікіцюк, дырэктар музея, які з уласнай службовай кватэры адпусціў вялікі пакой пад бюро Грамады, як прафесар Пічэта, прафесар Турук і іншыя.

Пасля па маёй ініцыятыве была арганізавана Беларуская жалезнадарожная грамада, якая супольна працавала і якая брала масавы ўдзел у працах Першага ўсебеларускага з’езда ў стычні 1921 года ў Мінску, на якім быў пакліканы першы



Васіль Федорук сын Мірона (стаіць у першым радку, другі з левай) ў войску, фатаграфія з 15. 10. 1925 г.; са збораў Ольгі Федорук



ўрад Беларускай Рэспублікі [з'езд праходзіў 14-18 снежня 1917 г. – рэд.]. Тут быў я, сябра Васілевіч, сябра Цвікевіч, пісьменнікі Янка Купала, Якуб Колас, Аляксандр Прушынскі, генерал Бонч-Осмолоўскі ці можа Бонч-Бруевіч, добра не памятаю. Тутака галоўную ролю арганізацыі ўзяла Беларуская Грамада ў Мінску. Тут, як памятаю, мелі прамовы Дыла, Бурбіс, Васілевіч, Цвікевіч, Якуб Колас, Янка Купала, Бонч-Бруевіч, Шантыр і шмат іншых. З'езд адбываўся ў Беларускім Тэатры.

Лёс сусветнай вайны закінуў мяне з Варшавы ў Маскву. Пасля працаваў я ў Мінску. Пасля другой вайны 14 гадоў працаваў загадчыкам школы ў Зубаве. Маю Сярэбраны Крыж Заслугі, Медаль 10-годдзя Польскі Людовай і Ганаровую адзнаку за экспанаты на Павятовай ральнічай выставе ў Бельску, шмат дыпломаў. Цяпер мне 79 гадоў, атрымліваю 706 злотых старчай рэнты і ганарова працую як „Terenowy Opiekun Społeczny" ў Бельску, а жыву на вуліцы Ганкі Савіцкай № 4.

Другая сусветная вайна

Першая сусветная вайна прынясла людзям непамерныя страты. Але пачыналася яна так, як пачыналіся ўсе войны, якія памятае гісторыя. Гэта значыць, калі немагчыма было ўрэгуляваць спор мірным шляхам, то з кожнага боку была аб'яўлена, што ад такога то дня, ці нават гадзіны пачынаем ваяваць. Былі аб'яўлены дні мабілізацыі для ўсіх апалчэнцаў. На граніцы сканцэнтроўвалі аграмадныя арміі і адсюль пачыналася як бы ігра ў шахматы, хто каго. Калі немцы націснуць, то рускія адступяць, то зноў як рускія можа ў другім месцы націснуць, то немцы адступалі. Гэтакая забаўка галоўнакамандуючых каштавала дзесяткі ці сотні тысяч людскіх істот.

А колькі было тут мукі, цярпення, слёз, стогнаў паміраючых маладых людзей, якія чакалі на паратунак сваіх мацярэй ці бацькоў. Колькі праклёнаў, як ад салдат, так і ад пацярпеўшых сірот, жонак і дзяцей. А колькі было калек-інвалідаў? Але гэтага ўсяго камандзіры не бачылі і не чулі, бо яны былі далёка ад фронта вайны.

У другой сусветнай гітлераўскай вайне абыйшлі ўсе звычаі і законы міжнароднага права. Гітлер са сваёй арміяй як каршун сярод цёмнай ночы наляцеў на тэрыторыю Польшчы і Беларусі і адразу ўзяў напрамак на Маскву. Самалёты, артылерыя, кавалерыя, матарызаваная пяхота, ўсё не стрымлівалася на якім-небудзь аб'екце. Не было тут якога-небудзь фронту вайны. Гітлер выдумаў сваю асабістую тактыку. Ён думаў, што яму ўдасца ў кароткі час знішчыць цэлую Польшчу, Беларусь, Украіну і цэлы Савецкі Саюз. Але не тут то было. Рускі народ устаяў і не ўдалося Гітлеру, так як Напалеону пабываць у Маскве. Але Гітлер пайшоў далей. Голадам марыў цэлы акружаны Ленінград. Па дарозе знішчажаў усё, што пападалася пад руку. На занятай тэрыторыі забіраў усю хатнюю жывіну. Забіраў цывільную моладзь да прымусовай працы ў самой Германіі, на карысць вайны. Знішчажаў калхозы і саўгасы. Забіваў усіх, хаця б толькі западазроных камуністаў. Вынішчаў усіх жыдоў і цыганоў. Пазамыкаў усе школы і тэатры. Паліў вёскі і іншыя будоўлі публічнай ужытковасці, а пад канец выдумаў і выдаў загад, каб усё насельніцтва вывезці з Пушчы Белавежскай, каб савецкія партызаны, якіх тут было немала, не маглі мець хаця б якой-небудзь падтрымкі. Трэба сказаць, праваслаўная беларуская большасць насельніцтва ў Белавежскай пушчы была прыхільная да рускіх партызан.

Я таксама меў гаспадарку ў Пушчы. Не памятаю дакладнай даты ў 1941 г., але якраз мелі пачынаць жніво жыта. Я ўстаў



Ольга Федорук і Ніна Іванюк з Кнаразоў; здымак зроблены ў Плютычах у 1943 г., перад выездам на прымусовыя работы; фота са збораў Ольгі Федорук

рана і глянуў у вакно. Бачу, на мой панадворак едзе двух немцаў на матацыклях і за імі галопам прэ селянін з вёскі Добраволя, бо знаў яго асабіста. Я выйшаў з хаты на спатканне. Мне далі немцы прачытаць паперку, у якой аж у трох мовах – рускай, польскай і нямецкай было напісана: *Ваша весь высядляецца, тэрмін 2 гадзіны.* Далей было сказана, што можна ўзяць з сабою і чаго пад карай смерці нельга было браць. Выразна было сказана, што забараняецца браць сякеру, касу, пілу, рыдлёўку, вілы да гною ці нават сярпа ці нажа. Чалавек як бы стаў непрытомны, ашаломлены. Ніяк не мог зразумець, ці то сон, ці праўдзівая пастанова гітлераўскай улады.

Зразумеўшы ў чым справа, трэба было за гэтыя дзве гадзіны сабраць найбольш патрэбныя рэчы і ўлажыць на тую фурманку, якая прыбыла разам з немцамі. Адзін з найстарэйшых жыхароў вёскі Масева II прозвішчам Дулька сказаў: *Я тут нарадзіўся, я тут і памру* і не хацеў ехаць. Немцы яго адразу застрэлілі. З жывіны дазвалялася ўзяць на сям'ю адну карову, а вось апошні жывы інвентар, як коні, каровы, свінні, авечкі ці куры – усё гэта аставалася на панадворку. Катоў і сабак немцы казалі тут жа ўласнаручна зарубаць сякерай. Я сам і цэлая сямья проста разгубілася і сталі як бы непрытомныя. Напрыклад, жонка ўзяла адну пару ботаў з халявамі, прынясла і палажыла ў мяшок. А калі прыехалі на новае месца, то аказалася, што оба боты з правай нагі і ніяк не можна было іх выкарыстаць.

Я жыў на хутары. Не прайшло і двух гадзін, як 200 ці 300 фурманак з суседніх вёсак ужо ехалі пад акорд войска. Да гэтага абозу далучылі і мяне. Я з дарослым сынам ішлі каля фурманкі, а жонку, сынавую і двух дочак узялі на вялікі ценжаровы самаход і павезлі невядома ў якім напрамку. Не далі нават развітацца з сям'ёю.

Я думаў, што ўжо больш ніколі не пабачу сваёй жонкі і дзяцей. Гэта было каля шостай гадзіны раніцы. Ад'ехалі мы можа восемь кіламетраў і на вялікай паляне ўсе фурманкі былі устаноўлены, як найцясней радамі і акружаны з ўсіх бакоў войскам. Тут мы і начавалі.

На другі дзень немцы рукамі савецкіх палонных паспелі вывезці ўсё, што ім было патрэбна: коні, вазы, каровы, свінні ці куры, запасы свежаскошанага сена, а ўсе будоўлі падпалілі. Усе бачылі, як полымя языкамі падымалася на значную вышыню, каб паказаць якую вялікую крыўду немцы зрабілі зусім не вінаватым жыхарам 28 вёсак: Масева I, Масева II, Чола, Тушэмля, Доўгі Барок, Ціхаволя, Броўск, Язвіны, Рудня, Буды, Тэрэміскі, Скупава, Альхоўка, Свінарой, Міклашэва, Капітаншчына, Ахрымы, Семяноўка, Лука, Тарнопаль, Баб'я Гара, Крыніца, Ляўкова і шмат іншых..

Раніцаю было дазволена, хто меў, зварыць каву, і паехаць далей да мястэчка Поразава. Тут таксама бівакавалі паўтары сутак, а пасля паехалі далей убок мястэчка Лыскова. Частку фурманак згрузілі ў вёсцы Кулевічы, Навасады, Лескі, а частку ў Кавалях і іншых вёсках. Высядленне было заплянавана раней, бо калі мы згрузіліся, то тут жа пабачылі свае сем'і, якія ўжо былі размешчаны ў кожнай хаце. Са мною разам ехаў мой брат Феадосій і Пракофій Ваўрэнюк.

А ў самых Кнаразах, калі ў 1941 г. праходзіў фронт, то артылерыйскі снарад папаў у бункер на прагуменні Янкі Нікіцюка. Забіў жонку Сафрона Андрэюка, фельдшарку Зіну і шмат каго параніў. Пахаронныя хаўтуры ўрачыста адбыліся на могілках у Кнаразах на Плоскай Гары.

Хіба ніхто больш за мяне не пацярпеў падчас другой сусветнай вайны. Першым няшчасцем была страта цэлай гаспадаркі.



Здымак з нямецкага пашпарту Зінаіды Красоўскай; са збораў Ольгі Федорук

Другое няшчасце гэта адзіны мой сын Мікалай, забіты на вайне ў 1945 годзе, каля Берліна. Засталася яго жонка Кацярына і сын Уладзімір Пераевой, які і цяпер жыве разам з маці ў вёсцы Тушэмля каля Свіслачы. Трэцяе няшчасце гэта пажар у маёй кватэры падчас маёй адсутнасці, калі ўсё як ёсць што удалося забраць падчас высядлення згарэла. Не засталося нават кашулі на змену. Чацвёртым няшчасцем было арыштаванне мяне ў 1943 годзе пад закідам "стары польскі камуніст". Прасядзеў я ў лагеры для ваеннапалонных у Ваўкавыску больш за тры тыдні ў бараку, які быў толькі з адным вакном у столі, без ложак, без ніякай пасцелі, нават без саломы. Дзевяноста працэнтаў вязняў з 300 асабовага бараку ішло кожны дзень на расстрэл. Я быў пэўны, што і мяне той самы лёс чакае. Ад страху пасівелі адразу валасы на галаве. Але я меў *Благаславенную Грамату* ад Архіепіскапа Аляксея з Грод-



Аляксей Красоўскі загінуў у час вайны; са збораў Ольгі Федорук

на. У гэтай грамаце было сказана, што яна выдаецца мне за асаблівыя заслугі на карысць Праваслаўнай Царквы і была тут выява Хрыста, які нёс на сабе вялікі крыж на Галгофу. Яшчэ у міжваенны час, я, як старшыня Школьнага Дазору з выбару ад гміны, меў грамадскія грошы. Па просьбе парафіян, я закупіў жалеза на агароджу царквы ў Пасынках бельскага павета. За гэта і атрымаў Грамату, якая ўратавала мяне ад смерці.

Як з гэтага відаць, шмат няшчасця прынясла вайна мне і маёй сям'і. Не абмінула яна шмат каго іншага. Усе яе памятаюць. Ці ж можна пералічыць усе матэрыяльныя шкоды і смерць міліёнаў людзей, якія загінулі ў гэтай вайне.Але гітлераўцаў спаткала першая няўдача пад Сталінградам. Савецкая Армія ішла па слядам. Не давала перадышкі, пакуль не дайшла да самога Берліна і біла немцаў аж да поўнай капітуляцыі. Сам Гітлер быў хітры і жадны людской крыві, але ён не спасцярог як сам папаў у пастку, падрыхтаваную на яго. Калі хто цікавіўся як пачыналася вайна, то мог заўважыць, што вялікія дзяржавы, як Амерыка ці Англія, сталі адчуваць пагрозу збоку Германіі. Дзяржавы гэтыя спачатку цькавалі Гітлера на Савецкі Саюз, а калі пачалася вайна, то дзяржавы гэтыя далучыліся да Савецкага Саюза і супольна ваявалі. Гітлерызм знішчаны. Сам Гітлер не вядома дзе падзеўся, а немцы хацелі, як Напалеон заваяваць цэлы свет, а як аказалася то мусілі аддаць тыя землі, якія калісь належылі да Польшчы. Цяпер канцлеры Адэнаўэр ці Эдгард кажуць, што яны яшчэ знойдуць Гітлера, калі Польшча дабравольна не аддасць тэрыторыі па Одры і Нісы і не будзе устаноўлена граніца там, дзе яна была ў 1937 г.

Але увесь свет ведае недобрасуседскасць і шчырасць заходніх немцаў. Ніхто не схоча дапамагаць ім. А калі амерыканцы ізноў цацкаюцца з гітлераўцамі, то толькі таму, што хочуць мець свае ўплывы і матэрыяльныя карысці.

Сельскагаспадарчы прагрэс

Першыя конкурсовыя буракі Еккендорфы і Маммуты ў вёсцы Кнаразы

Ад 1915 і па 1921 год я пражываў у Маскве. Быў сведкам Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай Рэвалюцыі 1917 г. Асабіста бачыў тагды яшчэ жывога Леніна. У 1922 г. прыехаў на сваю бацькаўшчыну ў Кнаразы, думаючы, што буду працаваць настаўнікам у школе, як і раней. Але Санацыйная Польшча не давала працы настаўнікам-беларусам і я астаўся на гаспадарцы свайго бацькі. У маладых гадах я зімою вучыўся, а летам памагаў бацькам. У Маскве хадзіў на вечаровы агратэхнічны

курс пры Пятроўска-Разумоўскай Акадэміі. Першапачаткова праца на раллі без каня, без прыладаў, без насення, без мінеральнага навозу была вельмі цяжкая, але тэарэтычная падрыхтоўка на курсах дапоўніла мае практычныя веды і праца на раллі хутка стала даваць задавальняючыя рэзультаты.

З Бельска прыязджаў да Кнаразоў аграном Эльяш Віцэнтовіч, брат таго Віцэнтовіча, які і цяпер яшчэ жыве на вуліцы Міцкевіча ў Бельску. Я запісаўся на конкурс управы кармавых буракоў, бо тады яшчэ тут не зналі цукровых буракоў. Для дасведчання я пасеяў два сарты: Эккендорфы і Маммуты. Увосень трэба было ехаць з экспанатамі да Бельска. Не памятаю па якой прычыне я сам не мог паехаць і выслаў з буракамі сваю жонку. Амаль цэлы дзень падаў халодны дождж. Жонка змерзла як след, але буракі былі такія вялікія, што занялі першае месца на выставе, а ва ўзнагароду прызнана была вялікая дзевяцізубовая конная спрэнжыноўка. Калі жонка вярнулася, то суседкі з усмешкай казалі: *О то Тобе Паравоіха выстава*, але калі даведаліся, што прывязла спрэнжыновую барану і калі пабачылі як яна працуе, то ўжо не было падставы да смеху. Бараны такія тады яшчэ не былі знаныя, але хутка пайшлі, бо ўсе разумнейшыя гаспадары, штораз больш іх купляді. З таго часу як бы ў дадатак да плуга ці драўлянай бараны ўсё часцей сталі сяляне ўжываць спрэнжыновак, якія і цяпер займаюць амаль першае месца ва ўправе глебы. Адносна таго, якія буракі былі лепшыя, цяпер магу сказаць, што вялікай разніцы ў плёне не было. Можа толькі такая, што Маммуты мелі колер чырвоны, былі тонкія і доўгія, а Эккендорфы жоўтыя, збанкаватыя і тоўстыя.

Гэта было ў 1924 г. З таго часу прайшло 44 гады. Не адразу буракі занялі такое месца, якое яны займаюць цяпер, але пачатак быў зроблены... Амаль тады ж была ўведзена сцярнісковая рэпа Турніпс.

Каб сад добра рос

Калі добра прыглядзецца, якія былі сады калісьці і якія сарты пладоў былі ў гэтых садах, дык ясна кожнаму стане, што культура садоў была вельмі прымітыўная. Людзі не ўмелі шчапіць дрэў. Не ведалі, з якіх матэрыялаў груша ці яблыня радзіла плады. Не ведалі, чым і як трэба дапамагаць дрэўцу стварыць так смачныя і патрэбныя для арганізма чалавека плады. Цяпер навука даволі дакладна ўстанавіла, што трэба ў гэтым напрамку зрабіць. Вялікае значэнне мае своечасовая падрыхтоўка пладавых дрэў яблыні ці грушы да зімы. Калі не зробім гэтага, дык не чакайма добрых ураджаяў летам, а можа нават стацца так, што дрэвы змерзнуць і тады прапала шматгадовая праца. Перад усім да зімы пад дрэўцы трэба даць натуральны навоз і разам суперфасфат і соль патасовую (калійную) у памеры па 300 кг на гектар. Перакапаць зямлю, а тым самым змяшаць навозы з зямлёю на такой адлегласці ад пня, як сягаюць галінкі кроны. Якая б восень не была сухая, ці мокрая трэба вакол пня на адлегласці даўжыні галінак выкапаць баразну на адзін штых рыдлёўкі і ў гэты ровік як найбольш наліць чыстай вады са студні, а яшчэ лепш разбаўленай вадою гнаёўкі з хлявоў.

Нам здаецца, што зімою дрэвы не растуць, не даюць пладоў, няма на іх лісця і як бы не трэба аб іх памятаць. Але трэба ведаць, што яны жывуць, яны толькі спяць, адпачываюць ад працы пасля летняга высілку. У дрэве жыццё не замірае. Рух сокаў адбываецца так як і летам. Вада паруе, высыхаець так, як высыхаець напрыклад вада з мокрай бялізны, калі мы яе зімою развесім на марозе. Пра галінку на дрэве мы кажам, што яна замерзла.



У Кнаразах к. 1965 г., злевай: Ольга Скепко, Марыя Федорук, Ніна Семенюк; са збораў Ольгі Федорук

Лепш было б сказаць, што яна засохла. Каб гэтага не было, мы павінны ўвосень прыблізна ў лістападзе кожнае дрэўца моцна падліць і забяспечыць патрэбнаю вільгацццю на цэлую зіму. Чым суроўшая зіма, чым большыя завываюць маразы, тым хутчэй вымерзаець вада. Безпасрэдна каля пня вады ліць не трэба. Яна не дасць вялікай карысці, а можа нават зашкодзіць, бо карэнне якое бярэ ваду і карысныя для ўзросту сокі знаходзяцца не каля самога пня, а больш-менш дзе канчаецца крона галінак дрэў.

Калі ўсё гэта зроблена, то застаецца яшчэ адна важная работа. Восенню абавязкова трэба ўсе ствалы дрэва і грубыя разгаліны пабяліць вапнам змешаным са звычайнай глінай і каравячымі адходамі. Без гэтых дамешак вапна абмываецца дажджамі. Там, дзе сад не агароджаны трэба пні дрэў забяспечыць ад зайцаў і абвязаць саломай або хоць ядлоўцам. Для чаго патрэбна пабелка? Людзі лічаць, што пабелкай зніштажаем розныя шкоднікі. Фактычна пабелка павінна быць зроблена ўвосень. Сонечныя праменні моцна награваюць чорны колер у дзень, тут жа ўначы моцныя бываюць маразы. Раптоўная перамена тэмпературы некарысна ўплываець на дрэвы. Трэскаецца кара і дрэвы могуць нават засохнуць. На вядро вады для пабелкі бяруць 2 кг вапна, 1 кг гліны, 2 кг кароўніка і 200-300 гр купароса, г.ё. сіняга каменя. Перад пабелкай ачышчаюць пні дратавай шчоткай на разасланы мяшок. Адумершыя часткі кары і яечкі зародышаў шкоднікаў абсыпаюцца на мяшок. Усё гэта трэба сабраць, вынесці з саду і спаліць. Не шкадуйце працы каля дрэў у восень, то сад вам заплаціць летам.

Першая сэрадэля на полі ў Кнаразах

Да 1924 года ў Кнаразах зусім невядомая была сэрадэля. Я і пакойны былы настаўнік Карп Герасімавіч Зенюк з вёскі Зубова прачыталі ў літаратуры па сельскай гаспадарцы, што сэрадэля гэта вельмі карысная пашавая расліна, што расце яна на пясчыстых палях, якіх у нас вельмі многа і што не патрабуе яна надта многа ўгнаенняў, а наадварот – сама па сабе пакідае пасляжніўныя рэшткі і карэнні, а апрача таго на карэннях нарастаюць пэўныя нейкія барадаўкі, якія даюць гатовы азот для наступных раслін. Памеркавалі мы, што і на сам рэч гэта можа быць карысная сельскагаспадарчая расліна. Склікалі агульны сход цэлай грамады Кнаразоў і запрапанавалі супольна закупіць насенне сэрадэлі і пасеяць ранняй вясною ў жыта без баранавання. Тады была яшчэ ў Кнаразах цераспалосіца. Поле з жытам было на *Воўчум* і ў *Глінным*. Цяжка было правесці гэтае сабранне, але якось удалося пераканаць тых апорных, хто быў супраць такой пастановы. Ухвалілі засеяць кожны на сваёй палосцы ад *Воўчай Дорогі*

да Гаёў. Засеялі. Год быў вельмі добры для сэрадэлі. Урадзіла як на дзіва. Зжалі сярпамі жыта, а ўвосень яшчэ накасілі хто фуру, а хто меў шырэйшую паласу то і дзве. Былі вельмі задаволеныя, бо гэта як кажуць: *Лішні грыб у боршч.* Некаторыя ці не мелі грошы на насенне, ці проста не хацелі і не засеялі. Якое ж было здзіўленне, калі наступнай вясной была тут ярына і на тых палосках, дзе была сэрадэля, збожжа было нашмат прыгажэйшае, чым на тых, дзе яе не было.

З таго часу і да тых пор канюшына расце на мацнейшых глебах, а сэрадэля на пясчыстых. У Кнаразах цяпер няма гаспадара, які не сеяў бы сэрадэлі. Але адкуль яна ўзялася – не ўсе ведаюць, бо прайшло ўжо 44 гады.

Першы лубін

Калі мне было сем ці восем гадоў, прыблізна ў 1895 г. бацька мой прынёс з вёскі Ржэпнева адзін корч лубіну, на якім было можа з 50 струкоў, а ў кожным струку па 4-5 вялікіх зярнят шарабураватага колеру, крыху падобных да бурага гароху. Памятаю добра як бацька казаў, што з гэтых зярнят нібы мелюць і вараць каву. Пачалі каштаваць на смак, але ён быў такі горкі як перац. Аднак бацька пасеяў яго на сваім полі. Вырас добра і ад той пары сталі сеяць яго на зялёнае ўгнаенне. Да таго часу лубін як карысная расліна не быў вядомы ў Кнаразах. Дзе Ржэпнева дастала насенне лубіну, таго не ведаю. Насенне лубіну надаецца на пашу толькі пасля адгарычэння ў рачной вадзе. Цяпер сеюць лубін пастэўны.

Першая падарыўка поля

Да 1924 г. ў вёсцы Кнаразы ніхто не ведаў тых карысцяў, якія давала неглыбокая падарыўка поля адразу пасля зжатага сярпамі жыта ці пшаніцы. Тады была яшчэ так званая цэраспалосіца. Мала было палёў. Яшчэ не звезены снапы, а ўжо пускалі хатнюю жывіну, каб выядала пустазелле ў высокай пожні. На пожні пасвілі жывіну аж да зімы. Спачатку пускалі каровы, пасля коні, авечкі і свінні. Пры гэтым лічылі, што лепшага спосабу няма. Калі на агульным сходзе вёскі Кнаразы паўстала прапанова, каб рабіць падарыўку, то па просту закрычалі і паднялі такі гармідар, хоць з вёскі ўцякай. Але я быў заўзяты, запрог коні ў плуг, бо тады ўжо аралі плугамі і праз цэлую ноч араў сваю палоску, якая была здаля ад вёскі ва ўрочышчы Малыняўка. Якія толькі праклёны не падалі на маю галаву. Хацелі не пусціць майго статку на пожню, бо я нібы прыараў траву. Але за маім прыкладам пайшоў яшчэ Вінцэнты Капітанюк. Памалу справа ўціхла.

На забаранаванай падарыўцы хутка паўсходзіла ўсялякае пустазелле. А калі ўвосень я рабіў глыбокую орку на зіму, то шмат сходзілася людзей і здзіўлялася, як за гэтыя тры месяцы перагніла поле і якая мягкая была зямля. З тых пор сталі рабіць падарыўкі што раз больш. Цяпер тых называюць дрэннымі гаспадарамі, якія не робяць падарывак.

Віка яровая як другі плён

На агародзе Аляксейчыка Клімюка ў Кнаразах у 1925 г. я пасеяў ранняй вясною двухрадны ячмень. Вясна была надта сырая і халодная і ячмень па просту скіс. Рэдка паўсходзіў і плён даў не задавальняючы. Калі ячмень быў зжаты і звезены, я зрабіў падарыўку і засеяў даволі густа ярую віку. Зямля была сырая, але ў чэрвені цяпло спрыяла хуткаму прарасту насення і да восені віка так вырасла, што цяжка было касіць. Позняй восенню ўжо няма таго сонца, каб высушыць на пашу, а спосабу сіласавання тады яшчэ ніхто не ведаў. Я трымаў яе і касіў на зялёны корм для свіней, кароў і авец. Якось доўга не



было снегу і марозу і я меў добрую зялёную пашу да позняй восені. Устыд казаць, але адзін з найбагацейшых гаспадароў А. Вязоўскі выпускаў украдкам ноччу цэлае стада свіней у маю віку.

Меліярацыя

Як я ўжо пісаў, асушка напрыклад *Балота*, *Гаюв* ці іншых забалочаных месц называецца меліярацыяй. Часта трэба не асушаць, а навадніць які нібудзь сухі малаўраджайны грунт. Для гэтага таксама капаюць глыбокія канавы і гэтымі канавамі наваднаюць тэрыторыю. Гэта таксама называецца меліярацыяй. Часам закладваюць на значнай глыбіні ў зямлі меліярацыйныя трубы і гэтым спосабам асушаюць. Добра памятаю, як у *Осэлянскім лузе* ці Подгорскім лавілі калыскамі або кломляй карасёў, а качкі там маглі жыць цэлае лета. Таксама на Загорскім лузе лён і каноплі мачылі. А як прыйшла камасацыя і меліярацыя, то палі і сенакосы сталі даваць зусім іншыя ўраджаі. Так што наогул камасацыя і меліярацыя маюць вялікае значэнне для ўсіх хлебаробаў.

Гадоўля хатняй жывёлы

Калі разглядзець добра агульны краявід вёскі Кнаразы, іх палі, калісь зарошшыя лясамі, лугі, балоты і сенажаці, якія заліваліся і арашаліся вадой невялікіх, амаль паралельна цякучых рэчак Арлянкі і Бялкі, то ясным становіцца, што нашыя дзяды і прадзеды абапіралі сваё жыццё спачатку на паляванні на звяроў, птушак і лоўлі рыбы, якіх тут было удосталь. Пасля штораз больш на гадоўлі хатняй жывіны, якая з вялікімі цяжкасцямі была прывучана і прызвычаена да новых умоваў жыцця пад апекай людзей. Значна пазней хатняя жывіна як коні, каровы, былі навучаныя сваёй уласнай сілай дапамагаць людзям у працы. Валоў ці кароў запрагалі ў драўляную саху, а каней у вазы, бараны, ці конна ехалі на вайну.

Яшчэ пазней людзі выпальвалі і карчавалі лясы і зараслі, як непатрэбныя і на працягу цэлых вякоў месца лясоў займалі палі. Тады сталі хоць прымітыўным спосабам займацца сельскай гаспадаркай на раллі. З-пад лясоў глеба была засобная у прухніцу і складнікі пакармовыя і без штучных угнаенняў ураджаі былі добрыя. Дзікай звярыны станавілася штораз менш. У пошуках лепшага жыцця галоўным спосабам здабывання прадуктаў харчавання стала праца на раллі. Тут ужо з'яўляецца патрэба ў першай гадоўлі не толькі кароў, каней, але таксама свіней, якія даюць смачнае мяса, шчаціну, скуру на абуўку і сала. Апрача таго трэба было развіваць гадоўлю авец, якія давалі мяса, воўну і скуры на шапкі і кажухі. Гэтыя віды звяроў і хатнія птушкі, такія як гусі, куры, качкі, індыкі, пэрлічкі, бажанты і іншыя і цяпер з'яўляюцца галоўнымі памочнікамі ў жыцці жыхароў вёскі Кнаразы і ўсяго насельніцтва нашага краю.

У даўнія гады ніякай прамысловасці не было. Не было і вялікіх гарадоў з шматміліённым насельніцтвам. Былі нізкія ўраджаі збожжа, але і не аплацальныя цэны на прадукты харчавання. Каб павялічыць заробкі некаторыя сяляне выконваюць дадатковыя працы ці то пры пляценні кошыкаў, калысак для дзяцей, вырабу з саломы кубляў на збожжа, вырабу прадуктаў да абробкі ільну, канапель і ткання палатна на самадзельных кроснах. Некаторыя адкрывалі кузьні, нпр.: Дміцёр Красоўскі, Карп Хілімонюк, Уладзімір Федарук. Іншыя працавалі як столяры: Андрэй Семенюк, Еўгеній Крышпінюк ці Антон Іванюк. Яшчэ іншыя выраблялі жорны і нагробныя памятнікі з камення – Аляксей Іванюк, Рыгор Перавой. Не-

каторыя качалі з авечай воўны валёнкі: Мікалай Ваўрэнюк, Сцяпан Данілюк, Юрко Іванюк, а Іван Ваўрэнюк і Павел Федарук выпляталі надта прыгожыя падстаноўкі пад вазоны, крэслы, кушэткі, этажэркі і іншыя рэчы хатняга умэбляванння. Былі і свае музыканты.

Усе гэтыя рэчы выраблялі людзі пад націскам патрэбы, паводле сваіх помыслаў, самавукамі, без навуковай падрыхтоўкі. А то з той простай прычыны, што агульнаадукацыйныя школы не апіралі праграмы і метадаў навучання на політэхнізацыі, а больш апіраліся на навуках рэлігіі. Кіраўнікі школ зусім не дбалі аб навучанні сельскай гаспадаркі. Лічылі яны, што дастаткова той практычнай навукі, якую пераймае сын ад бацькі ці дзеда. Адсюль аграмадная адсталасць. Калі мы будзем вясці гаспадарку на раллі старым спосабам, то нам пагражае галадоўка так, як галадаюць некаторыя неразвітыя краіны ўсяго света.

Каб не быць галаслоўным трэба ведаць, што напрыклад у Польшчы дзесяць гадоў таму назад была значна менш людзей, як цяпер, а сярэдні прырост дзяцей складаў тры працэнты ў год. А цяпер трэба адначасова сцвердзіць, што і ў сельскай гаспадарцы павінен быць кожны год прырост ураджаю не меншы як тры працэнты на кожнага новага члена сям'і, якому павінна быць накрыццё на стол і адпаведная луста хлеба, мяса, малака, цукру ці іншых прадуктаў харчавання. Калі да гэтага не дойдзем, дык пагражае нам голад. Але мы яшчэ хочам звольніцца ад імпарту збожжа з-за граніцы, хочам жыць у будучыні штораз лепш, як жывем цяпер. Таму трэба было б, каб маглі мы павялічыць ураджай, не на тры, а хаця б на чатыры працэнты. Самі сяляне без дапамогі ўсяго грамадства гэтага не ў сілах выпаўніць.

Паляпшэнне ўраджаю ў значнай меры залежыць ад пашырэння гадоўлі. Гэты прыкладны вывад можна апіраць не толькі на прыкладах заходніх дзяржаў, як Данія ці Галяндыя, але таксама на прыкладах добрых гаспадароў у Польшчы, якія маюць высокія ўраджаі. Трэба, каб у Польшчы збіралі вялікія ўраджаі не толькі перадавікі сельскай гаспадаркі, але і ўсе іншыя. Занядбаных гаспадарак не павінна быць, бо гэта наша хвароба.

Аб гадоўлі хатняй жывіны шмат можна даведацца з газет і кніжак, а таксама ад парады агранома ці зоотэхніка. Радыё і Тэлевізыя таксама не мала адводзяць увагі на навуку сельскай гаспадаркі і гадоўлі, а такога прагрэсу, якога трэба было б спадзявацца пакуль што няма. Бо няма яшчэ пераканання, што навука дапамагае рацыянальнай гаспадарцы мець больш збожжа, акаповых, сена, квашанкі ці іншай пашы для хатняй жывіны.

Шмат гаспадароў кажа, што напрыклад гадоўля свіней зусім не аплачваецца. Гэта зусім няпраўда. Бо каб свіней кармілі толькі збожжам, то паводле навукі на прадукцыю аднаго кілаграма прыросту жывой вагі трэба скарміць ад 4 да 6 кг збожжа без ніякіх дадаткаў. Возьмем сярэднюю лічбу 5 і палічым па 3,5 за 1 кг – 15 зл, а па кантрактацыі ГС плаціць па 20 зл і яшчэ дае права на куплі вугаллю і асыпкі на кожную штуку. Маем тут шмат вельмі вартаснага хлеўнага гною. Але ў сельскай гаспадарцы ніхто не корміць свіней толькі збожжам, а тут у рахунак уваходзяць усякія адпадкі, як плевы, вытлокі, выслодкі, пустазелле, буракі з прарыўкі, сыраватка, маслянка, канюшына, люцэрна, сэрадэля на зялёна, а перад усім квашана. Але найгалоўнейшую ролю тут адыгрывае высокі ўраджай картофлі, буракоў, бруквы, топінамбуру, пастэўнай дыні.

Чым большы ўраджай з кожнага гек-

тара, тым танней абыходзіцца прадукцыя мяса. Некаторыя гаспадары збіраюць напрыклад па 40 тон картафель з гектара. Калі палічыць, што на кожную штуку пойдзе па адной тоне, то можна выкарміць 40 штук. А калі мы палічым 40 штук па 120 кг. Тут атрымаем 4800 кг па 20 зл., значыць разам 96000 зл. А колькі застанецца яшчэ навозу, які як лякарства патрэбны на нашыя палі.

Некаторыя маладбайныя гаспадары кажуць, што пры гадоўлі свіней шмат працы і яна брудная і як бы ганьбіць гонар чалавека. Але калі хто без ніякіх кваліфікацыяў прыязджае ў горад, то ці там не чакае яго цяжкая і таксама брудная праца? Праца пры гадоўлі свіней добра арганізавана. Перад усім трэба зрабіць некаторыя выдаткі на парнік, на скрыню каля парніка, на гнятоўнік, на шарпач да буракоў, бруквы, дыняў, на сячкарню да зелля і зялёнак, такіх як кукуруза, сланечнік пастэўны ці бульва тапінамбур. Усе машыны на электрычнасць. Абавязкова блізка каля парніка павінна быць бочка з вадою або кран ці помпа. Добра было б, каб тут жа была піўніца на акаповыя пашы як картофлі, буракі. Адным словам ўсё павінна быць пад рукою.

Не малое значэнне мае добра зробленае карыта на пашу і на ваду для пiцця. Летам дастаткова мець шалаш для свіней з акульнікам, а зімою абавязкова цёплы хлеў. Значна выгадней арганізаваць масавую гадоўлю свіней летам, бо і цяпло, і не затрачваецца пашы на абаграванне арганізма і менш ідзе апалу і больш ёсць усякай зялёнай пашы, якая пры гадоўлі мае вялікае значэнне.

Добры гаспадар ніколі не павязе на рынак на прадажу збожжа, а тым больш іншай пашы, а скорміць яго дома, а тыя грошы з вялікім працэнтам атрымае ад Г.С. за прададзеную штуку. Ніколі і нікому не раю выпіць літра водкі, бо то толькі затрата здароў’я і ўбытак у гаспадарцы , нэндза і разлад у сям’і. Але гадоўлю свіней, авечак, а тым больш кароў ці хатніх птушак трэба падтрымліваць згодна з прынцыпам: больш, лепш і танней. Трэба яшчэ браць пад увагу, што збыт на экспарт ці на рынак тлустых штук свіней, авечак ці кароў заўсёды ёсць загварантаваным.

Кожны добры гаспадар павінен мець у сябе ў хаце падручную бібліятэчку аб гадоўлі і агратэхніцы, слухаць радыё і глядзець тэлевізар, а апрача таго выпісваць “Плён” ці якую іншую гаспадарскую газету.

Пажар на тарфавіску

Добра памятаю як шмат гадоў таму назад, калі было надта сухое лета, верхні пласт торфу ў Кнаразах быў перасохшы і тут пачаўся пажар. Падобныя пажары паўтараюцца часта. На першы погляд здавалася б, што агонь на балоце не страшны, тым больш не відаць тут высока ўзняўшыхся языкоў агню, пыхае толькі дымок, а ў самай справе гэта вельмі паважная падзея. Згарае верхні пласт аж да зусім мокрага торфу, так каля 50-60 см глыбіні. Шкоды ад пажару вялікія, бо гарыць агромністая маса торфу. Згарае зялёная трава разам з карэннямі і дарнінай і на гэтым месцы творыцца глыбокая ўпадзіна, да якой сплывае і доўга стаіць снегавая ці дажджавая вада і тут праз некалькі гадоў няма ані зялёнай пашы ані сена.

Не дае карысці і попел на пажарышчы. Угасіць пажар на торфе вельмі цяжка. Пажарнікі таксама не шмат могуць зрабіць. Адзіны спосаб гэта капанне хаця і вузкіх, але глыбокіх канаваў навокал цэлай занятай агнём плошчы. Найчасцей пажар патухае ад прадоўжанных дажджоў ці надыхода зімы і снегу.

Як вядома, агонь не знічтажае мокрых прадметаў, а калі гарыць торф, то гэта значыць ён высах можа да 80%. Такі торф надта лёгкі. Яго абавязкова трэба вазіць да загроды і сыпаць як падсцілку пад свінні, каровы, коні ці хатнія птушкі. Торф убірае ў сябе шмат мочы і не спрыяе затраце амоняку. Людзі павінны выкарыстаць сухі торф для падняцца ўраджайнасці, але ніколі не можна дапускаць да пажару.

Вятрак электроўня

Часта можна пачуць пагаворку *Дурны мужык*. Пагаворка гэта абапіраецца толькі на тым, што калісь не было школ. Да школы хадзілі толькі панскія дезці. А дзеці рабочых і сялян не мелі магчымасці вучыцца, бо за навуку трэба было плаціць шмат грошай. Апрача таго дзяцей мужыкоў не хацелі ўпускаць да школы, бо казалі што нібы ад іх пахла мужычай доляй. Панскія дзеці не хацелі з імі нават сядзець на адной лаўцы.

Праўда, што мужыкі былі непісьменныя. Але тутака можна прывясці іншую пагаворку: *Голь на выдумкі хітра*. Гэтым я хачу сказаць, што некаторыя мужыкі, хоць і непісьменныя былі, але прыродны розум мелі не горшы ад паноў.

Напрыклад, ведаю такога селяніна на калёніі Кожына каля вёскі Зубава бельскага павета, Аркадзія Міхальчука. Жыве ён здаля ад вёскі. Да яго не праведзена сетка электрычнасці. Ён уласнаручна збудаваў на хаце вятрачок, які круціць крыллямі і робіць электрычную энергію. Сіла ветру яго нічога не каштавала. Да яго пакуль што не прыходзіць паборца, бо святло ў хаце мае дарэмнае. Ці ж не варта сказаць праўды, што мужык разумнейшы за пана. Яшчэ шмат людзей жыве здаля ад электрычнай сеткі. Можа варта было б прадукаваць масава такія ці падобныя вятракі і адпаведныя апараты радыя.

Гэты жа самы Міхальчук зрабіў сабе прыладу да вырабу розных шнуркоў з канапель ці горшых сартоў ільну. Ён зробіць такія лейцы, пастронкі да плуга ці прыпон да сена, што ніякая фабрыка не зробіць так чыста, гладка і моцна як ён.

Такарня па дрэве і металу

Трэба звярнуць увагу, што некаторыя маладыя людзі маюць надзычайныя здольнасці да канструкцыі і арганізацыі працы, ў той ці іншай прафесіі. Маю на мыслі маладога хлапца Аляксея Паўлючука, сына Пятра з вёскі Зубава. Хлапец гэты жыў на калёніі здаля ад вёскі. Не было тут электрычнага святла. Ён прыдумаў і ўласанаручна зрабіў сабе такарны станок на дрэва і на металы. Усе часткі да гэтага станка ён выкаваў у сваёй маленькай кузьні.

Спачатку станок трэба было парушаць рукамі. Пасля ён дапасаваў да керата, але нехта даведаўся аб здольнасцях гэтага хлапца і запрапанаваў яму ўзяць працу ў нейкім паважным прадпрыемстве ў Беластоку. Падобна яму ў вёсцы Кожына жыве Уладзімір Міхальчук, які таксама і цяпер працуе на такарным станку.

Добры помысл

На невялічкай рэчцы Локніца, зараз каля вёскі Мякішы бельскага павета тэхнік Марон выбраў месца, дзе рэчка была як бы сціснута з абодвух бакоў высокімі берагамі. На адным беразе рэчкі выбудаваў сабе хату і іншыя гаспадарчыя будоўлі. На самай рэчцы збудаваў запору, уставіў вадзяную турбіну, купіў вальцы і іншыя машыны да вырабу розных каш і пусціў водны млын. Малоў пшаніцу на пытлёвую муку, а ў жорнах хлебную муку і асыпку для хат-



Млін на Локніцы каля Мякішаў, 1960 г.; фота Мікалая Якубюка

няй жывіны, а таксама розныя кашы. Работы меў пад дастаткам.

Рэчка была не вялікая. Таму падчас даўжэйшай сушы яму не хапала вады. Ён і ў гэтым выпадку знайшоў выхад. Пабудаваў з бетановых пустакоў высокую вежу. На вярху яе збудаваў шасцікрылы вятрак. Калі быў вецер, то ён пускаў млын-вятрак, а рабіў як найбольшы запас вады. Гэта значыць выкарыстоўваў безплатную сілу вады і ветру. Працу выконваў вельмі сумленна. З кожным быў вельмі ветлівым, а часта нават навучаў сялян, як і што рабіць, каб мець добры ўраджай пшаніцы, жыта, ячменю, грэчкі ці проса. Да яго млына прывозілі збожжа нават з аддаленых вёсак.

Часам было мала вады і ветру не было. Былі прастоі. Разумны мельнік і тут знайшоў спосаб. Уставіў ён матор спаліновы на ропу і выкарыстоўваў яго толькі тады, як не было ні вады, ні ветру. Але цяпер ён мог ужо працаваць без прыпынку. Шмат гадоў папрацаваў ён на гэтым млыне, а пасля аддаў яго як пасаг для свайго зяця. Сам купіў у Бельску пляц на Беластоцкай вуліцы, пабудаваў пентровы дом і асобна млын, з найнавейшай канструкцыяй электрычных рухавікоў і машын. Быў гэта найлепшы млын у Бельску. Пасля прадаў дом і іншыя будоўлі і купіў дом каля Варшавы. Мае сваю ўласную кватэру. Цяпер гэта ўжо стары чалавек. Атрымлівае рэнту і шчасліва дажывае свой век.

Варта звярнуць увагу, як гэты чалавек сваёй уласнай працай прабіваў сабе дарогу ў жыццё. Не стараніўся ён і ад працы спалэчнай на карысць сялян.

Маладое пакаленне павінна браць прыклад з таго чалавека і ў складаных сітуацыях знаходзіць разумны выхад з палажэння.

Музей

У кожнай дзяржаве шмат грошай укладаецца на арганізацыю музеяў. Музей, гэта збор старадаўніх рэчаў. На першы погляд рэчы гэтыя, устарэлыя, як бы не надаюцца для цяперашняга ўжытку і нічога не варты. Але вельмі вялікае маюць значэнне, калі мы хочам даведацца, як жылі нашыя продкі, якімі паслугоўваліся прыладамі ў працы і ў штадзённым жыцці. Якая іх была культура, звычаі, абрады. Якую насілі вопратку і абуўку, якія чыталі кніжкі і ці ўмелі чытаць і пісаць, і г.д. Усё гэта ясна гаворыць аб тым, як было калісь, які поступ быў у напрамку да лепшага, выгаднейшага жыцця, як ад найпрымітыўнейшых рэчаў пераходзілі людзі да дасканальшых спосабаў жыцця, да новых фабрычных кератаў, саламарэзак, сьрутоўнікаў, шарпачоў для акаповых раслін, парнікаў, гнятачоў да варанай бульбы, гумовых вазоў, малацілак, веялак, сеўнікаў, трыяроў, камбайнаў, трактароў з капачкамі бульбы, машын да вырабу будаўляных матэрыялаў, і г.д.

Яшчэ за нашай памяці не было матацыклаў, самаходаў, трамваяў, самалётаў. Не было радыя, тэлевізараў, ракетаў, не было электрычнага святла. Добра памятаю, як у цэлай Варшаве не было ані адной электрычнай лямпачкі. На гуліцах гарэлі газавыя фанары, а ў кватэрах толькі керасінавыя лямпы, якія так нядаўна выдумаў Лукасевіч.

П'янства

Ой, пьяна, я пьяна
На парозі ўпала
Подвядзі міленькі
Бо я пянюсенька

або:

Упілася я
Не за Вашае я
Мая курка неслася
Я за яйца ўпілася.

Гэтыя словы песні гавораць аб тым, што з даўна ёсць звычай піцця не толькі мужчынамі, але і жанчынамі, ды дзяцьмі і падросткамі.

Нічога дзіўнага, што звычай гэты пераходзіць з пакалення на пакаленне і што раз у большых размерах, а цэлая Польшча заняла першае месца ў свеце.

Вядома, што піццё дарагой водкі даводзіць гаспадарку да ўпадку, да страты здароў'я, а нават да наглых згонаў, пераважна мужчын у сярэднім ўзросце веку. Мы хочам жыць што раз лепш, замажней, культурней.

Нам трэба зрабіць добры пачатак у Новым 1968 годзе. Трэба закінуць звычай угашчэння водкай на вяселлях, урадзінах, хрысцінах, іменінах, а нават на памінкавых хаўтурах нябожчыкаў. Гэтую ідэю павінна ўзяць на сябе моладзь, бо на старыкоў слабая надзея. Як гаворыцца ў прыказцы: *Горбатого могіла выпростує.* Калі моладзь гэтага не зробіць, то п'янства і ў далейшым будзе на перашкодзе да лепшага жыцця. Старыя людзі кажуць, што п'янства прыносіць ім найбольш прыемнасці і радасці ў тым, каб напіцца да ўпадку, паваляцца пад лаўкай, выбляваца, а можа і пахварэць на рака, а добрае харчаванне цэлай сям'і іх не цікавіць. Яны не чытаюць кніжак, не вучацца жыць культурней, на кожным кроку ў іх найвульгарнейшыя словы, пабоі жонкі і дзяцей, задзіркі і бойкі з людзьмі цьвярозымі і ўсё ў іх накіравана супраць чагось лепшага, супроць культуры, супроць усяго таго, што прызнаецца ўсімі цвярозымі людзьмі найпрыгажэйшым у свеце.

Найбольш ганьбіць нашу вёску слова: ...*бу тваю маць.* Кот перавярнуў ладышку з малаком – яго лаюць ...*бу твою маць.* Сабака заеў курку, яго частуюць гэтым жа словам. Муж на жонку ці сына таксама лаецца гэтым як жа паскудным словам. З вялікай пагардай адносяцца разумныя людзі ў публічных месцах да аматараў так званай лаціны, і то не толькі да яго, але і да таго горада ці вёскі, адкуль выходзіць гэты хуліган. Школа, духавенства, літаратура, радыё, тэлевізыя і бацькі забараняюць ужываць безкультурных слоў, але самі бацькі не могуць пакінуць гэтага слова і дрэннае прызвычаенне пераходзіць з пакалення на пакаленне.

Каханая маладзёж, дзяўчаты і хлопцы, на найбліжэйшым сходзе пагаварыце аб гэтай справе і з пагардай адносцеся да тых, хто яшчэ не дарос да культурнага жыцця і далей ужывае гэтага ганебнага слова.

Прачытайце на самым пачатку так пенкны верш *Мая вёска.*

Калі б былі якія здарэнні ў вёсцы Кнаразы, то ўпісвайце ў гэтую кніжку, як найстаранней перахоўвайце яе, а праз некалькі дзесяткаў ці соцен гадоў яна набярэцца свайго значэння.

Надзвычайнае здарэнне

Я ўжо як бы закончыў сваю працу аб вёсцы Кнаразы і хацеў перадаць кніжку для вёскі, як запіскі даўніх часоў, аж тут здарылася новае няшчасце, якое зацікавіць у будучыні новае пакаленне.



Ото ж жыхар гэтай вёскі Аляксей Стэпанюк, сын Мефодыя ў дзень 12 смудзеня 1968 г. павёз на пункт скупу да Бельска аж тры кармнікі. У касе СОП была вялікая чарга і атрымаў заплату даволі позна. Быў тады сільны, да 30 градусаў мароз. А да вёскі Кнаразы трэба было ехаць ноччу каля 15 км. Для разгрэўкі ў далёкай дарозе на такім марозе Стэпанюк выпіў добрую порцыю водкі. З непрывычкі моцна апьянеў. Так сталася, што ў дарозе ўпаў з саней. Замерзшы на марозе конь пайшоў без аглядкі да хаты без гаспадара. Бяздрадны Стэпанюк дабраўся па глыбокім снягу да найбліжэйшага дому на калёніі, у якім жыла толькі жанчына з дзяцьмі. Моцна стучаў у дзверы і акно і прасіўся ўпусціць дахаты, але перапалоханая сярод ночы жанчына не ўпусціла яго. Стэпанюк выбіў акно і параніў сабе руку акурат на жылах. Зышло шмат крыві, аслабеў і лёг спаць. Проста на снягу, пад вуглом дома. Хаця быў вельмі цёпла адзеты, бо ў баранi кажух, валянкі, цёплую шапку і цёплую бялізну, не вытрымаў і замёрз на косць.

14 студзеня, а па стараму стылю 1га студзеня (Новы Год) пахавалі Стэпанюка на Плоскай Гары. На гэтых пахаронных хаўтурах брала ўдзел цэлая вёска Кнаразы, як кажуць ад малога да старога, а колькі тут было выліта слёз і гора.

Стэпанюк не быў налаговым пяніцай. Наадварот. Выбудаваў ён як жа прыгожы новы дом і ўсе іншыя мураваныя гаспадарчыя будоўлі. Зрабіў нават сілёс на квашанку. Прыкладна вёў гаспадарку, а доказам таго ёсць факт, што за адзін раз здаў ён аж тры штукі і то паўтараў неаднойчы.

Пакінуў ён маладую жонку з малалетнімі дзяцьмі. Пакінуў цэлую гаспадарку, а сам ён быў надта прыгожы і мілы, заўсёды ўсміхаючыйся чалавек. Смерць як бы зумысля выбрала яго як бы на паказ, для прыкладу для ўсіх пьяніц, а нават не п'яніц працуючых у сельскай гаспадарцы.

Стэпанюк, калі здаў вяпрукі, то мусіў паставіць каня і сані дзесці ў гаспадара на панадворку ў Бельску, а сам пайшоў да касы па грошы. Калі вярнуўся, то выпіў на дарогу і магчыма, што за яго здароў'е яшчэ нехта выпіў, бо як вядома аматараў на чужое не трэба доўга шукаць. Простая логіка павінна была падказаць "прыяцелям" запекавацца чалавекам, а не пускаць яго сярод ночы ў далёкую дарогу на так сільным марозе. Грэх гэты павінен лягчы цяжкім каменем на сэрцы тых людзей, якія памятаюць толькі аб сябе. А хто цяпер паможа жонцы і дзецям вясці гаспадарку? Няхай гэты выпадак будзе перасцярогай для ўсіх і па ўсе часы.

Агульны агляд жыцця сялян вёскі Кнаразы

пры ўкладанні нінейшай кніжкі мімаволі насоўваюцца пытанні, чаму жыхары вёскі Кнаразы не жывуць так заможна, як павінны жыць людзі так цяжка працуючыя на сельскай гаспадарцы?

Каб адказаць на гэткія пытанні, трэба сцвердзіць, што прычына гэтага ў тым, што амаль усе маладыя сілы з большай ці з меншай адукацыяй пакінулі на гаспадарцы старых бацькоў, а самі пайшлі ў горад. Не скажу, што яны зусім парвалі добрыя адносіны да вёскі. Наадварот, кожны водпуск ці пры іншай нагодзе яны бываюць у бацькоў. Тут маці, як для госця рыхтуе што лепшае харчаванне. Не запрашае да працы, бо сын ці дачка прыехалі на адпачынак. Не патрабуе ніякай заплаты за малако, масла, сыр, смятану, яйкі ці каўбасу, бо яны як бы свае ў гаспадарцы. За іх маці не плаціць грошы ў склепе, то як жа можна браць якую заплату ад свайго ўласнага дзіцяці? А калі канчаецца месячны водпуск, то на ад'езд маці вышуквае яшчэ што

лепшае на дарогу. Наб'е поўную таболку ўсялякіх прадуктаў харчавання, ды яшчэ на развітанне ўроніць не адну слязінку.

А маладзёж? Як та маладзёж, не перажывала непасрэдна тых чорных, кашмарных дзён падчас вайны. Не працавала на гаспадарцы і не ведае, якія фінансавыя абавязкі гаспадар мусіць рэгуляваць і колькі мяса, збожжа і бульбы трэба аддаць гасударству. Не ведае, як цяжка звязаць канцы з канцамі, каб не папасць ў задоўжанасць. Не ведае маладзёж, ці то цяжкая ці лёгкая праца на раллі, бо да сямі гадоў яшчэ дзіця, а там цэлыя каля 20 гадоў вучыцца ў школах, дзе толькі бачыць разумовую працу.

А калі прыедзе ў горад на працу, то толькі тады памятае аб бацьку, калі патрабуе грошай, а то хутка забывае, аж да наступнага за год водпуску.

А што гэта так, то відна хаця бы з таго, што ні адзін сын ці дачка не запранумеравала для бацькі „Plon”, ці якую іншую газету па сельскай гаспадарцы, або для маці „Poradnik Wiejskiej Gospodyni”. Гэтыя часопісы з прыемнасцю і пажыткам былі б прачытаны як падарункі ад дочкі ці сына з далёкага горада. Праўда, што тут на перашкодзе не зусім разумнае распараджэнне, што напрыклад сын ці дачка, якія жывуць у Варшаве не можа падпісацца на газет на імя бацькі ці маці, якія жыць у вёсцы, бо пошта не прыймае грошы і не хоча падпісвацца на адлегласць. Ці не можна гэтае распараджэнне перарабіць? Міністэрства Пошты павінна змяніць свае нерэальнае распараджэнне, а ўсе газеты, радыё і тэлевізыя, як найшырэй распаўсюджваць прапаганду, каб кожны жыхар горада, які мае сувязь з вёскай, падпісаў для бацькі ці маці газеты ці купіў кніжку за 100 зл. ў год. Гэтым самым як найлепш зрэалізуюцца пастулята распаўсюджвання чытальніцтва сярод сялян.



Кнаразоўцы, злевай: Валянціна і Мікалай Ніколаюкі і Зінаіда Кірылюк, 1965 г.

Бо калі бліжэй прыглядзецца да жыцця, то лёгка зразумець і заўважыць, што вельмі мала ў вёсцы людзі чытаюць. Да тых часоў няма ў Кнаразах святліцы. Няма тэлевізара – таго як жа шчырага прапагатара навукі сельскай гаспадаракі. Але ўстыд прызнацца, што ў маёй роднай вёсцы да тых часоў няма кулка ральнічага. На сто гаспадароў можа 2-3 маюць сілосныя ямы. Не закладаюць кампостаў з торфам, якога тут ёсць пад дастаткам. Ні адзін гаспадара не мае гнаёўкі і што самае галоўнае – няма нават той марнай будкі (устэмп), куды можна было б схавацца для залатвення фізіялагічных патрэб. А ўсё гэта таму, што людзі не чытаюць, не вучацца, бо вясковыя бібліятэчныя пункты не дапасаваныя зместам да ўзроўню сялян. Грамадзкі агра-



ном жыве ў павятовым горадзе Бельску Падляшскім за 15 вёрст ад Кнаразоў.

Далей калі будзем вышукваць яшчэ іншых прычын таго не найлепшага жыцця, то з вялікай прыкрасцю трэба сказаць праўду, што тут надта многа пьюць гарэлкі на вяселлі, на хрысцінах, на забавах, пры розных гандлёвых транзакцыях, пры закладзінах будоўлі, пры іх заканчэнні. Адным словам пьюць па прычыне і пьюць без усялякіх прычын.

Калі бы кожны гаспадар пусціў гэтыя грошы на штучныя ўгнаенні на ўляпшэнне, што цяпер пускае на водку, то рэзультаты былі б лепшыя. Больш рацыянальна вялася б гаспадарка. Былі б лепшыя ўраджаі, большыя даходы. Не трэба было б пазычаць грошы на водку, бо сваіх бы хапала і не было б уцечкі з вёскі ў горад. У вёсцы застаюцца пераважна старыя бабкі і дзядкі. Стрэмежанныя векам і цяжкай працай, яны не маюць той працаздольнасці, якую мелі ў маладых гадах. Вёска старэе, а горад маладзее. Горад ахвотна прыймае маладых да працы. Для маладых у горадзе кіно, тэатр, радыё, тэлевізыя, розныя разрыўкі, загварантаваны васьмігадзінны дзень працы, месячны адпачынак, а для жанчын трохмесячны мацярынскі водпуск. У памяшканні ёсць вада з крана, электрычнае святло, ванна, пралька, адкурач, лядоўка, нават убікацыя ў хаце, а ў вёсцы нават на дварэ яе няма, бо няма дошчак ці цьвікоў, каб яе зрабіць. Не рэалізуецца лозунг фронтам да вёскі. Але ўсе мы добра ведаем, што вёска дае нам найбольш патрэбныя і нічым не замянімыя на кожны дзень харчовыя прадукты.

Шукаючы далейшых прычын дрэннага жыцця на вёсцы, трэба сказаць, што празмерна многа ідзе грошай і часу на суды, на кары, на апеляцыйныя перасуды, на адвакатаў, якія вельмі часта несумленна абараняюць інтарэсы селяніна, які плаціць можа апошнія залатоўкі. Можа на зумысля разцягваюць судовыя працэсы на этапы і за кожны выступ патрабуюць дадатковых даплат. Ці то абарона селяніна? Не. Васні судовыя і працэсы – гэта руйнацыя гаспадарства.

Нямалаважную пазіцыю ў бюджэце селяніна займаюць выдаткі на лячэнне. Сяляне кормяць горад, а самі сабе не маюць магчымасці арганізаваць рацыянальнага харчавання. Не ў кожным доме можна знайсці бочку квашанай капусты, салёных агурцоў, ці запасаў канфітур, або кампотаў. Заўсёды на перашкодзе брак бочкі, або не хапае грошы на цукар ці на слоікі вэка, а можа за цяжкай працай няма часу на падрыхтоўку запасаў на зіму. Недастатковае харчаванне заўсёды з'яўляецца прычынай хваробы, за лячэнне якой непамерна высокія ганарары бяруць дохтары, напрыклад 100-150 зл. За візіт без гваранцыі выздараўлення. Яшчэ шмат іншых прычын можна было б прывясці, але гэта нічога не паможа. Адно толькі трэба сказаць і зразумець, што ўсім нам патрэбны хлеб і прадметы харчавання, што хлеб гэты дае селянін, а значыцца гэтага хлебадаўца-селяніна не трэба эксплаатаваць, трэба памагаць яму ўсемерна.

Адсюль слава і чэсць ды паважанне для хлебароба.

O kadrach na wsi

Jako przedstawiciel starszego pokolenia (mam już 81 lat) dobrze pamiętam czasy, kiedy na wsi wcale nie było szkoły i nie było nauczyciela. Wynikiem tego był prawie stuprocentowy analfabetyzm. Wyjątek stanowili nieliczni mężczyźni, którzy odbywali służbę wojskową w carskiej armii w przeciągu 25 lat. Tu nauczyli się czytać i pisać. Nie było mowy o jakiejkolwiek kulturze. W prymitywny sposób toczyło się życie na wsi. Dopiero

w roku 1897 w mojej rodzinnej wsi Knorozy na Białostocczyźnie wybudowano drewnianą szkołę z jedną salą szkolną i jednym nauczycielem. Początkowe nauki otrzymałem w tej właśnie nowej szkole.

Ale to było dawno. Teraz już zupełnie zlikwidowano analfabetyzm, jako taki, pozostały tylko dawne przyzwyczajenia i tradycje. Niełatwo tu wprowadzić lepsze metody gospodarowania. Kiedy mówi się o ulepszaniu gospodarki, to często można słyszeć argument, że dziad i pradziad przeżyli życie, to i my jakoś przeżyjemy. Ale młode pokolenie już nie chce chodzić w łapciach łykowych, a chce nosić co raz ładniejsze i wygodniejsze obuwie skórzane i w dodatku modne. Ludzie teraz nie chcą mieszkać w kurnych chatach, a budują coraz ładniejsze i obszerniejsze domy mieszkalne z odpowiednim umeblowaniem. Nie chcą uprawiać roli ręczną motyką lub drewnianą sochą, a chcą mieć jak najwięcej traktorów, kosiarek, żniwiarek, ziemniaczanych koparek czy młockarni do omłotów zboża, chcą mieć dużo kombajnów, samochodów, autobusów, motocykli, rowerów, nawozów sztucznych itd.

Wszystkie te rzeczy nie rosną na roli, trzeba je wytwarzać w fabrykach. To wszystko robią ludzie. Stąd powstaje tak zwane uprzemysłowienie. Ale tych ludzi, nauczycieli, lekarzy, dentystów, weterynarzy, agronomów, techników, mechaników, inżynierów – wszystkich robotników w przemyśle trzeba wyżywić i to nie byle jak, bo przy ciężkiej pracy, czy to na roli, czy w przemyśle człowiek musi odżywiać się lepiej. Więc odczuwa się coraz większy brak produktów spożywczych, które musi wyprodukować nasze rolnictwo, przy pomocy maszyn i narzędzi rolniczych.

Słowami p. L. Wolskiego z Komorowa w „Gromadzie” nr 11 chcę powiedzieć: „Dobry gospodarz na słotę i mróz przygotuje psu przytulną budę, a przypatrzmy się, jak w wielu kółkach maszyny milionowej wartości stoją wrośnięte w błoto bez dachu nad głową”. Co robić? Słowa te przytaczam chociażby dlatego, że w wielu wsiach stoją puste ciężkie budynki gospodarcze, murowane, byłych spółdzielni produkcyjnych, wykorzystywane za niewielką opłatą dla chowu brojlerów. Budynki te mogłyby być wykorzystane na ważniejsze potrzeby w rolnictwie. Bo na przykład brojlery można trzymać na poddaszach, a na dole różne przedsiębiorstwa, jak: kuźnia, piekarnia, masarnia, szwalnia, sklep spożywczy, a reszta na schowek maszyn i narzędzi rolniczych kółka rolniczego. Ale właśnie brak inicjatywy i przedsiębiorczości.

Z racji tradycyjnego przywiązania do rodzinnej wsi bywam tam często i pilnie przyglądam się życiu mieszkańców. Otóż, co właśnie tam można zrobić, aby podnieść wydajność płodów rolnych z każdego hektara?

Wiadomym jest, że państwo przydziela miliardowe sumy na inwestycje, związane z rozwojem rolnictwa. Zgoda. Tam, gdzie trzeba, należy budować. W Knorozach stoi kilka obszernych, niewykorzystanych pospółdzielczych budynków jak: obora, stajnia, chlewnia, owczarnia, spichlerz piętrowy, studnia głębinowa i dwa silosy. Oprócz tego na terenie gruntów tej wsi jest ogromna żwirownia na tak zwanej *Kniażej Górze*. Mieszkańcy skwapliwie wykorzystywali żwirownię i tani cement i wybudowali sobie obszerne budynki gospodarcze z pustaków betonowych. Możliwości dalszego budownictwa też są nieograniczone. Ale same budynki nie dają produkcji. Tu niewykorzystane są rezerwy i inicjatywa ludzi pracy. Mało zrobiono w kierunku intensyfikacji produkcji rolnej. A warunki rozwojowe są tu aż nadto dobre, tylko nie ma komu zrobić dobry początek. Jeśli tu są nienajgorsze grunty i ogromne zasoby pierwszorzędnego torfu, to można byłoby wykorzystać go nie tylko na opał, ściółkę, komposty, ale też balony miału torfowego wykorzystać na ogrody warzywne i sady.

Jest tu aż trzech kowali, w tym swój mechanik ze średnim wykształceniem. Jest kilka osób, które skończyły ogólniaki, kilku nauczycieli, a jedna dziewczyna ma tytuł inżyniera magistra. Więc są ludzie, tylko pracy nie ma.

Agronom gromadzki p. Goworko mieszka w powiatowym mieście Bielsku Podlaskim w odległości 15 km od wsi i tu buduje sobie willę. Czy można oczekiwać od niego jakiejś porady czy pomocy agrotechnicznej? Pracownicy GRN Chraboły bywają tu tylko w takich wypadkach, kiedy powstaje pytanie o uregulowanie należności wobec państwa. Młodzież nie widzi tu perspektywy rozwoju, nie ma pomocy i ucieka do miasta, skąd z tęsknotą wspomina spędzone dzieciństwo i pozostawionych często samotnych i bezradnych rodziców.

Tu powtarzam pytanie: Co robić? I jednocześnie odpowiadam. We wsi trzeba pobyć co najmniej tydzień czasu. Zaznajomić się, co można zrobić, aby ruszyć z miejsca do lepszego życia.

Według mnie całą wieś trzeba podzielić na grupy. Do pierwszej grupy zaliczyć trzeba tych gospodarzy, którzy mają najlepsze warunki do produkcji mleka. Grupa ta będzie liczna, bo jest tu na miejscu punkt skupu mleka, dużo użytków zielonych, to znaczy łąk i pastwisk, jest pod dostatkiem budynków gospodarczych. Przy zastosowaniu torfu na komposty zwiększy się zapas obornika naturalnego, a przy obfitym nawożeniu roli i zastosowaniu wysokich dawek nawozów sztucznych można uzyskać wielkie urodzaje własnej paszy dla krów, jak z pola, tak i z łąki co jest warunkiem opłacalności hodowli bydła. W niektórych wypadkach trzeba by było przeprowadzić drobne usprawnienia w oborach, np.: powiększyć otwory okienne, zrobić wentylację powietrza, stałe praktyczne przegródki wewnątrz, zrobić dobre żłoby i drabiny dla zakładki paszy objętościowej, wybielić, a może także urządzić gnojownie. Chętnych do zrealizowania tych postulatów nie powinno zabraknąć, bo naród tu pracowity.

Do drugiej i może najliczniejszej grupy należy zaliczyć grupy należy zaliczyć tych gospodarzy, którzy mają najlepsze warunki rozwojowe dla hodowli trzody chlewnej. Jest tu cała połać żytnio-kartoflanych gruntów, gdzie łatwo przy obfitym nawożeniu i odpowiedniej pielęgnacji uzyskać bardzo wysokie plony ziemniaków, buraków, dyni, lucerny, koniczyny, łubinu pastewnego, bobiki, brukwi, bulwy topinamburu i innych pasz, bo tylko przy użyciu własnych zasobów paszowych hodowla świń jest wysoko opłacalna. Jako konieczny warunek racjonalnej hodowli świń jest urządzenie letniej kuchni. Tu koniecznie musi być dobry parnik, koło niego gniatacz parowanych ziemniaków i na wymieszanie paszy, praktyczne koryta, wiadra, szufla, czerpak i wózek do rozwożenia paszy dwa razy dziennie. Obie te największe grupy powinny stworzyć związki branżowe.

Do trzeciej grupy zaliczyć te gospodarstwa, które nie mają zdrowych sił męskich i rodzina których składa się przeważnie z kobiet, starców lub niepełnoletnich podrostków. Najodpowiedniejszym zajęciem dla takich rodzin byłaby hodowla kur, kaczek, indyków, gęsi, bażantów czy brojlerów w zależności od upodobania lub warunków gospodarczych.

Do czwartej grupy należy zaliczyć betoniarzy, kowali, stolarzy, murarzy, piekarzy, wędliniarzy, blacharzy, mechaników, powroźników i inne drobne zawody, które wykonują niezbędne usługi. Szczególnie szeroko tu może być organizowana produkcja materiałów budowlanych, np. pustaków, dachówek, kręgów studziennych, płyt chodnikowych, słupów ogrodzeniowych i t.p.

Kiedy dałoby się ruszyć z miejsca i puścić w ruch wszystkie odcinki życia gospodarczego, to nie byłoby ucieczki do miasta, bo takie rzeczy, jak kino, kiosk Ruchu, ka-



wiarnia, sklep masarski, piekarnie, łaźnie, sale potańcówek, czy inne udogodnienia można by mieć na miejscu u siebie.

Choć jest wielki postęp w życiu wsi w porównaniu jak było dawniej, ale jeszcze dużo pozostało do odrobienia.

Do każdej grupy pracy powinna być dobrana i dopracowana odpowiednia literatura fachowa. Wszystko to będzie możliwe do zrealizowania, jeżeli sami sobie będziemy wzajemnie pomagali, jeżeli GS włączy się do współpracy i bekoniaki, tuczniki, czy warchlaki będzie zabierać własnym transportem, a do wsi dostarczy wapno, nawozy sztuczne, pasze i inne towary przemysłowe.

Dziwny człowiek

Że ja dziwny człowiek, to prawda. Żyję bowiem 82 rok od dnia, może niepożądanego narodzenia w najbiedniejszej rodzinie chłopskiej i przez całe życie nie byłem ani w domu poprawczym, ani w szpitalu dla umysłowo chorych, ani nawet w izbie wytrzeźwień.

Trafiłem tylko podczas okupacji do lagrów dla *wojennoplennych* w Wołkowysku, barak nr 3, pod zarzutem stary polski komunista. Przebyłem tam aż trzy tygodnie, ale cudem wyrwałem się i żyję dalej, chociaż 90% mieszkańców tego baraku szło na ubój. A byli tam nauczyciele, doktorzy, kupcy, aptekarze, chłopi, robotnicy i wiele innych, przeważnie pochodzenia żydowskiego, a razem 300 osób tylko w jednym baraku. Było tu tylko jedno okno w suficie. Nie było żadnego posłania, jak również i ogrzewania. Była tylko samoobsługowa ubikacja. Przeżyłem tam straszne chwile, posiwiały mi od razu włosy na głowie. Ale widocznie jeszcze nie wszystkie klepki pogubiłem z głowy, bo jako nauczyciel rencista mam trochę wolnego czasu i ułożyłem i własnoręcznie długopisem napisałem na 400 stronach książkę-pamiętnik-kronikę o życiu, zwyczajach i tradycjach rodzinnej wsi Knorozy powiatu Bielsk Podlaski na Białostocczyźnie. Jeszcze dobrze widzę, bo w książce tej szczegółowo opisałem jak ubogo żyli ludzie dawniej, jakie pozostawili pamiętniki po sobie, jak cierpiały biedę i poniewierki, jak sierpami żęli żyto, owies, jęczmień, proso, grykę czy pszenicę, jak własnoręcznie wyplatali sobie i dla domowników z lipowego łyka obuwie, albo jak wyrabiali tak zwane samodziały ubraniowe i pościelowe. Pisałem również jak odbywali pańszczyźniane obowiązki na korzyść feudałów-obszarników, a nawet wielkich duchownych.

Jeszcze niezupełnie nastąpił zanik pamięci, bo pamiętam dobrze, jak to przegrano wojnę z Japonią w roku 1904-1905 i jak stłumiono pierwszą rewolucję. Byłem naocznym świadkiem Wielkiej Socjalistycznej Rewolucji Październikowej, a jako krasnoarmiejec 3 Moskiewskiego Pułku Zapasowego widziałem w Moskwie na Placu Czerwonym żywego tow. Lenina, który przyjmował defiladę w dniu 1go maja i słyszałem jego żywe słowa, którymi zachęcał uczestników defilady do pracy na korzyść socjalizmu. Widziałem taksamo żywego tow. Dzierżyńskiego, jak szedł pieszo na ulicy Bolszaja Łubianka w Moskwie w zwyczajnej żołnierskiej szarej szyneli, bez żadnych odznak, w asyście tylko 2 kozaków w wysokich papachach kubańskich, którzy kroczyli za nim z tyłu w odległości około 5 metrów.

Pisałem także, jak powstawała pierwsza szkoła w Knorozach i jak posuwała się kultura ogólna i rolna, zmierzająca do osiągania coraz wyższych plonów z każdego hektara pola czy łąki. Jak rozwijało się budownictwo domów mieszkalnych zamiast kurnych chat z glinianą podłogą i zabudowań gospodarczych, jak teraz żyje młodzież, jak korzysta z radia, telewizora, telefonów, jak uprawia sport na rowerach, motrocyklach, taksówkach i jak korzysta z autobusów pasażerskich. Nie ominąłem i problemów nadmiernego



korzystania z napojów alkoholowych i jakie to bywają skutki pijaństwa – objawy raka, coraz to częstsze nagłe zgony młodych ludzi. Tego wpierw ludzie wcale nie znali i chyba że niespodziewanie nagły piorun trzaśnie i już tu nie było ratunku, a teraz od pioruna są piorunochronne odgromniki, a od pijaństwa nie ma ratunku.

Chcę tu jeszcze powiedzieć, że dzięki jakiejś sile nadzwyczajnej bardzo dobrze słyszę, ale słyszę tylko to, jak mnie za pracę chwalą, a udaję, że nie słyszę, kiedy nie chwalą lub krytykują. Nawiasem tylko powiem, że mam 12 dyplomów uznania, mam Srebrny Krzyż Zasługi, Medal 10-lecia oraz honorową odznakę za eksponaty na wystawie rolniczej w Bielsku Podlaskim.

Celem napisania mojej książki było z jednej strony zachęcenie, przeważnie młodzieży do czytania książek w rękopisach, bo z czytaniem słowa drukowanego w mojej wsi nie jest najlepiej, a z drugiej zaś strony zapoczątkowałem kronikę-pamiętnik, który może dopełnią w przyszlości następne pokolenia, nadzwyczajnymi wydarzeniami z życia wsi i państwa.

„ „ geografji Polski i nauki o Polsce współczesnej	—
„ „ historji powszechnej i Żydów	—
„ „ historji Polski	—
„ „ o żydostwie współczesnem	—
„ „ rysunków	bardzo dobry
„ „ robót ręcznych	bardzo dobry
„ „ śpiewu	bardzo dobry
„ „ ćwiczeń cielesnych	bardzo dobry
„ „ robót kobiecych	—
kaligrafji	bardzo dobry

Liczba opuszczonych godzin szkolnych 194, z czego nie usprawiedliwiono —
Liczba spóźnień —, z czego nie usprawiedliwiono —.
Wynik ogólny bardzo dobry
Bielsk-Podlaski, dnia 14. VI. 1933
Opiekun ucznia | pieczęć | Kierownik szkoły
SKALA STOPNI:

Świadectwo szkolne Yony Sternberg z 1933 r.; ze zbiorów Yony Sternberg

ścił, ale w ten sposób przetrwało jedno jego zdjęcie, jedyne, jakie mieliśmy. Gdy niemiecki komendant powiedział: „Daję ci wszystko, ale daj zdjęcie”, dziadek odrzekł:

Nie należało myśleć źle o Żydzie. Proszę spojrzeć, jaki zaszczyt trafił się temu fotografowi, proroctwo padło z jego ust i oto dziś mogę spełnić prośbę komendanta i uratować miasto przed dwiema ciężkimi przeszkodami: granicy szabatowej i mykwy.

Cwi Ben-Daat (Bendas)


*

Ojciec był wrażliwy, rozmawiał ze wszystkimi ludźmi w delikatny sposób. Była u nas rodzina, którą nazywali „cesarzami”. Byli to ludzie, którzy stale potrzebowali wsparcia instytucji charytatywnych. W końcu jeden z nich został krawcem i zarabiał na chleb w godny sposób, z tym że w piątki pozwalał sobie na grę w karty. Gdy tata dowiedział się o tym, poszedł do niego, zaczął z nim rozmawiać i wpłynął na niego, by ten nie grał. Rozmawiał z nim z taką delikatnością i tak podniósł jego prestiż, że ten sam zaczął w to wierzyć.

Była u nas uboga wdowa, wdowa po Jochananie, zegarmistrzu. Zwykle wyczekiwała ona na mojego śp. ojca pod synagogą, gdy ten szedł do domu, i zaczynała opowiadać mu o swych zmartwieniach. Wszyscy mówili: „Rabi, to nie przystoi twojej pozycji. Stoisz z nią na zewnątrz i czekasz aż ona skończy swoje opowieści”. A on odpowiadał: „Jeśli ja jej nie wysłucham, to kto wysłucha?”.

Pewnego razu w Jom Kipur, w czasie poprzedniej wojny, doniesiono tacie, że złapali dwóch chłopaków z Bielska w Puszczy Białowieskiej – był to dziewiczy las. Znaleźli przy nich różne waluty i podejrzewano, że są szpiegami. Gdy tata o tym usłyszał, pojechał w Jom Kipur, by ich uwolnić. Drugi, który z nim pojechał, to był właściciel apteki, Alterman. Ojciec nie wahał się przed podróżą w Jom Kipur, chociaż był pobożnym rabinem. Udali się do lasu, aby spotkać się z władzami, poręczyli za tych ludzi i wypuszczono ich. Było to dwóch mieszkańców miasta. Jeden z nich: Mordechaj Abramowicz, drugi – możliwe, że Malin.

Były u nas sądy Tory; ludzie przychodzili się procesować, sporne pieniądze deponowali u rabina, i bywali handlarze, drobni i ci więksi, którzy czekali, aż u rabina będzie jakiś depozyt i będą mogli skorzystać z tych pieniędzy przez tydzień–dwa. Rabin je pożyczał i rabinowi je zwracano. Ale zdarzały się też przypadki, że ludzie przychodzili i żalili się – nie mają teraz, ale już niedługo, kiedy sytuacja się poprawi itd. Słyszałam raz, że mój świętej pamięci ojciec, słysząc narzekania


RABIN
Gminy Wyznaniowej Żydowskiej
M. A. BENDAS
W BIELSKU PODLASKIM.

הרב
משה אהרן בן־דעת
אב״ד ור״מ בילסק.

List Rabina Mosze Aroona Bendasa z 16 czerwca 1939 r.; ze zbiorów Yony Sternberg

człowieka, powiedział: „Skoro tak, nie będę mu dokładał trosk" – i udzielił mu pożyczki z własnych pieniędzy i sam szukał sposobu, by te pieniądze zwrócić.

Tata nie władał dobrze ani rosyjskim, ani polskim, lecz Polacy, którzy potrzebowali zaufanego tłumacza, od razu go zapraszali; raz poszłam z nim do sędziego pomóc mu w tłumaczeniu i byłam pod wrażeniem tego, jakie niuanse językowe dostrzegał, nie znając dobrze języka.

Polacy odnosili się do ojca z szacunkiem, zapraszali go trzeciego maja na święto konstytucji. On z tego powodu cierpiał. Ustawiali go między księdzem prawosławnym a katolickim, wtedy on brał sobie przynajmniej kogoś z gminy, żeby przy nim stał. To, co oni uznawali za zaszczyt, dla niego było nieprzyjemne.

W czasie pierwszej wojny światowej zdarzyło się, że jeden handlarz, Josef Epsztajn, został schwytany przez polskie wojsko, które chciało zabrać jego towar, i powiedział:

Dlaczego zabieracie tylko mnie? Rabin zebrał pieniądze dla Kozaków, zbierze także i dla was.

Stali gotowi do zadania ciosu miastu. W tym czasie ojciec siedział w synagodze nad Gemarą. Gdy przyszli powiedzieć mu, że z powodu kłamliwego oszczerstwa Epsztajna armia żąda wydania w ich ręce rabina – co zrobił tata? Poszedł i sam wydał się Polakom. W międzyczasie dr Kagen i inni czynili starania i został uwolniony. Ja z siostrą pobiegłyśmy do doktora Kagena i do Rosjan z rady miejskiej, którzy z nim poszli.

Mój mąż emigrował do Palestyny mniej więcej rok wcześniej, a ja zostałam, mieszkając z rodzicami. Mieszkanie było przestronne. Mieszkałam tam z moją małą córeczką. W okolicy byli i zasymilowani Żydzi, i Polacy, a ich dzieci gromadziły się u nas. W szabat jadało się u nas, moja córka także odwiedzała sąsiadów i panowały stosunki dobrosąsiedzkie. Ojciec, który odnosił się do dzieci z czułością, był tym zaniepokojony i mówił: „Stworzycielu świata, jeśli jakieś ich dziecko zaginie, co powiedzą? Krew na macę!". Mimo wszystko przyjmował je czule. Wśród dzieci byli także: syn i córka mieszkającego nieopodal księdza prawosławnego, który posłał informację, że jeśli jego dzieci przychodzą z wizytami do nas, to on chce, by również moja córka odwiedzała jego dom. Bez namysłu sprzeciwiłam się, po prostu miałam wewnętrzny sprzeciw, a gdy raz złapaliśmy ją, jak szła z dziećmi do kościoła, pomyślałam, jak wiele racji miał tata. Relacje między dziećmi z różnych narodów są nie mniej skomplikowane niż relacje różnych narodów i warto zachować pewną ostrożność.

Ojciec liczył się z dziadkiem i nieraz rezygnował ze swojego zdania, by go uszanować. Myśleliśmy, że to ładnie z jego strony, iż tak bardzo liczy się ze swym teściem. Tata odnosił się do dziadka z respektem i zwracał się do niego z różnymi sprawami. Gdy spierano się o interpretację Tory, dziadek był arbitrem.

Relacje między tatą i mamą były u nas


ПОЧТОВАЯ КАРТОЧКА
CARTE POSTALE

Куда Палестина
Наименование места, где находится почта, и области или края, а для станций—наименование железной дороги.
Jerusalem
Район, село или деревня.
Hebrew University
Улица, № дома и квартиры.
Кому Dr Bendac
Подробное наименование адресата.

Адрес отправителя. Adresse de l'expéditeur.
М. А. Бендас
Западная Белоруссия
Пионерская № 11

W 1940 r. rabin Bendas wysłał z Bielska do Palestyny kartkę pocztową do syna Hilela; ze zbiorów Yony Sternberg

piękne. Mama była kulturalna i sprytna i zawsze dochodzili do porozumienia. Mama ingerowała w sprawy rabina i, broń Boże, nie dało się tego odczuć. Miała wyjątkowy takt. Nauczyciel Jungerman, syn, zawsze mawiał: „Unzer rebecin iz zer taktisz" („Nasza rabinowa jest bardzo taktowna"). Mało mówiła, a stosunki w domu były bardzo dobre.

Spośród pomocnic, które u nas pracowały, dwie wyjechały do Ameryki; tata świętej pamięci pomagał im i udzielał im ślubu. Wszystkie dziewczęta, które u nas pracowały, wyszły za mąż i były szczęśliwe. Tylko ostatnia została z nimi i wygląda na to, że razem poszli do gazu. Zdarzało się, że byłe pomocnice zdobywały wysoką pozycję i przysyłały na Pesach pieniądze na mace i na drzewo, żeby rabin je rozdysponował.

Pewnego razu poczęstowano moją córkę rakami, wróciła do domu, a ja bałam się, że to dotrze do taty, więc powiedziałam jej: „Twój brzuch będzie trefny. Nie wolno jeść raków". Przestraszyła się i przez długi czas była bardzo cicha, i nie słyszało się od niej kolejnych próśb o jedzenie raków. Potem zauważyła, że nic nie stało się z jej brzuchem, więc podeszła do taty i spytała go: „Dziadku, Żydom wolno jeść raki?". Wtedy on powiedział:

Raki? Wszyscy rabini jedzą raki.

Poszła więc do innego sąsiada i zjadła raka. Naprawdę myślała, że może je jeść. Była sześcio-, siedmioletnią dziewczynką. Gdy wróciła, opowiedziała, jakie to dobre. Ojciec rzekł wtedy: „Widzicie, nie wolno żartować, nawet z maluchami".

Sara Simner

Tłumaczenie z jęz. hebrajskiego:
Małgorzata Lipska



Konsul Bielska w Izraelu

Mosze Alpert (1899-1991) wyemigrował z rodzinnego Bielska do Palestyny jeszcze w latach 20-tych. Szybko stał się jednym z najbardziej aktywnych organizatorów życia społecznego bielskich Żydów w nowym kraju. Powszechnie szanowany, nazywany był przez nich „konsulem Bielska w Izraelu”. Mosze Alpert był inicjatorem wydania „Księgi Pamięci Żydów z Bielska Podlaskiego” i już choćby z tego powodu jego postać zasługuje na uwagę.

Mosze Alperet urodził się w Bielsku w rodzinie Izraela Issy Alperta, pochodzącego z Szereszowa i jego drugiej żony Sory Perel Bertman z Orli. Jego ojciec był szamesem, czyli pomocnikiem rabina w sprawach administracyjnych przy synagodze Yafei Einaim („Piękne Oczy”) przy nieistniejącej dzisiaj ulicy Wąskiej (przebiegała równolegle do Mickiewicza). Izrael Issa Alpert przeprowadził się do Bielska po ślubie z pierwszą żoną Etel. Po tym jak zmarła na gruźlicę, pozostawiając go z sześciorgiem małych dzieci, zdecydował o ponownym ożenku. Jego wybór padł na Sorę Perel Bertman, która z kolei była wcześniej zamężna przez dziesięć lat, ale nie doczekała się dzieci. W końcu jej pierwszy mąż rozwiódł się z nią. Ktoś doprowadził do wyswatania Sory Perel ze świeżo owdowiałym Izraelem Issą Alpertem. Okazało się, że para doczekała się siedmiorga dzieci (dwójka zmarła w wieku niemowlęcym).

Mosze Alpert uczył się w jesziwie w Białymstoku. Był członkiem bielskiego oddziału syjonistyczno-ortodoksyjnej organizacji Mizrachi, która postulowała budowę religijnego państwa żydowskiego w Palestynie, a w Polsce równouprawnienie Żydów i ich lojalność wobec państwa polskiego. Kiedy ojciec Moszego chorował zastępował go na stanowisku szamesa bielskiej synagogi. Ożenił się z Gitel Suraską rodem z Bielska, z którą miał dwóch synów Meira i Icchaka.

Emigracja

W 1925 roku Mosze Alpert wraz z rodziną zdecydował o emigracji do Palestyny. Osiedlili się w Tel Awiwie przy ulicy 7 Rabbi Israel Negara, gdzie Mosze z żoną mieszkał do późnej starości. Wyjazd Moszego Alperta z Polski nie była wyjątkiem w rodzinie. W latach 20-tych i 30-tych wyjechały również wszystkie jego siostry i bracia, za wyjątkiem Chanego, który zdecydował się pozostać w rodzinnym Bielsku. Wraz z żoną Leą miał czterech synów. Cała rodzina została zamordowana przez Niemców w trakcie drugiej wojny światowej. Inny brat Moszego, Leibel, w czasie I wojny światowej służył w polskiej armii i został przypadkiem zabity przez kolegę w trakcie zabawy bronią. Dzieci Izraela emigrowały do Palestyny, Stanów Zjednoczonych i Kanady. Matka Moszego, Sorel Perel Alpert, po śmierci męża i jeszcze przed wybuchem II wojny światowej również zdecydowała o emigracji do Palestyny.

Mimo emigracji w wieku młodzieńczym Mosze na zawsze zachował miłość do rodzinnego miasta i swoich ziomków, którzy po nim przyjechali do Palestyny. Stał się znany z tego, że pomagał wielu bielskim (i nie tylko) Żydom osiedlić się w nowym kraju. Znajdywał im mieszkanie i prace. Zdarzało się również, że wielu emigrantów pierwszy okres spędzało u niego w domu. Mimo że sam z rodziną zajmował skromne mieszkanie w Tel Awiwie. Przykładem była Fania



Dzieci Chanego i Lei Alpertów – Icchak, Ruwen, Mosze; Bielsk Podlaski, ok. 1930 r.



Mosze Alpert w Palestynie ok. 1925 r., siedzi na ośle z synem Meierem, po lewej stoi Szalom Min

Grinberg, wykształcona bielszczanka, która przybyła do Palestyny w latach 30-tych i do czasu jak stanęła na nogi w nowym miejscu spała, obok innych osadników, na podłodze w jadalni rodziny Alpertów. Fania Grinberg w swoich wspomnieniach opublikowanych w „Księdze Pamięci Żydów z Bielska Podlaskiego" zapisała: „…dotarłam do Ziemi Izraela w 1927. Nie myślałam wówczas o szukaniu tam bielszczan. Pewnego słonecznego dnia pojawił się u mnie przystojny, wysoki, rosły Żyd ze wspaniałą brodą, podobny do Jezusa, w kapeluszu z szerokim rondem. Przyszedł a ja nie wiedziałam, kim on jest. Spytał: „Nie znasz mnie?". Bardzo źle się poczułam. Więc powiedział: „Jestem Moszke od Isera, szamesa. Uważaj, bo znów ukradnę jabłka z sadu". Ten żart przypomniał mi sielankowy bielski krajobraz. To był Mosze Alpert, nasz przyjaciel z Bielska, i przywiózł tę woń Bielska ze sobą do Izraela. Zaprosił mnie na bar-micwę swego syna, Icchaka, gdzie znów spotkałam się z bielszczanami i romans z Bielskiem rozpoczął się na nowo. Moja przyjaciółka spytała: „Co ty widzisz w tych bielszczanach?". Powiedziałam: „Chodź ze mną zjeść czulent u Moszke – i będziesz wiedziała". Przyszłyśmy, a dom się nie zamykał. Każdy przyszedł mnie zobaczyć. Na koniec Mosze podniósł kieliszek i powiedział: „Wypijmy za zdrowie twojej mamy. Proszę, byś napisała do swojej mamy, że jadłaś czulent u Moszke, syna Isera, szamesa". Moja przyjaciółka bardzo się wzruszyła i powiedziała, że teraz już rozumie, dlaczego tam biegam."

Pomoc Żydom z Bielska

Lila Lowell, mieszkająca w Izraelu siostrzenica Mosze Alperta, wspomina: „Mój wujek był dobrotliwie nazywany „konsulem bielskim", jak gdyby prowadził ambasadę swojego rodzinnego miasta. Nazywano go również „Mosze Gabaj", ze względu na jego pozycję w synagodze. Prowadził bowiem modły, czytał Torę, dbał o modlących się i rozdzielała pomoc humanitarną. Mówił, że jest szefem Bielskiego Funduszu Pomocy, ale taka instytucja nigdy w Izraelu nie istniała i wujek Mosze rozdzielał potrzebującym własne pieniądze. Udzielał nieoprocentowanych kredytów. Nikt nie wiedział, że to były jego własne środki. Nie mówił o tym



Syn Mosze Alperta, Icchak, przebrany w strój ze strąków, święto Purim, 1928 r.

nawet swoim dzieciom. Czasami wiedział, że pożyczki, których udzielał nigdy nie zostaną zwrócone. Jeden z przypadków, które pamiętam dotyczył krewnej jego żony Gitel, również pochodzących z Bielska. Jej mąż był handlarzem diamentami, ale niespodziewanie zmarł, nie zostawiając żadnych informacji o swoim biznesie. Wdowa została z dwójką dzieci bez grosza. Wujek Mosze dał jej zatem pieniądze, zapłacił nawet za lekcje gry na pianinie jej córek. Zapytałam go, dlaczego robi takie rzeczy, skoro sam żyje tak skromnie. Odpowiedziała, że Tora uczy nas, że jeśli ktoś potrzebuje wsparcia wówczas należy mu pomóc, aby utrzymał dotychczasowy poziom życia i nie dodawać mu cierpienia. Biedni ludzie są przyzwyczajeni do prostego życia, ale ci, którzy nagle stracili komfort dotychczasowego życia, mogą stać się życiowymi bankrutami."

Lila Lowell opowiada również, że przy jakiejś okazji, kiedy Mosze Alpert przyznał jej, że pieniądze funduszu, który prowadzi, faktycznie pochodzą z jego oszczędności. „Zapytałam go dlaczego przynajmniej nie kupi sobie nowego ubrania na dzień świąteczny. Roześmiał się i odpowiedział: „Nie potrzebuje nowego ubrania. Kiedy idę ulicą wszyscy mnie pozdrawiają. Nie patrzą na moje ubranie i buty." Innym razem zapytałam wujka, dlaczego nie kupi sobie nowych mebli. Odpowiedział cytatem z Talmudu: „Ten świat jest tylko korytarzem do innego świata. Mój pobyt tu jest wyłącznie tymczasowy. Dla tymczasowego pobytu to, co posiadam jest wystarczające."

Współtwórca „Księgi Pamięci"

Mosze Alpert był postacią znaną w całym środowisku bielskich Żydów i aktywnym działaczem Stowarzyszenie Imigrantów z Bielska w Izraelu. Brał udział we wszystkich ważnych uroczystościach w rodzinach pochodzących z jego rodzinnego miasta. Ludzie znający Moszego Alperta podkreślali jego wyjątkową inteligencję, poczucie humo-



Mosze Alpert na weselu Ben Cion Simnera, wnuka ostatniego rabina bielskiego Moszego Aarona Bendasa

ru i umiejętność ciężkiej pracy. W pierwszych latach po przybyciu do Izraela pracował jako piekarz, następnie był sprzedawcą na bazarze Carmel, największym w Tel Awiwie. Znany był również jego talent do przemawiania publicznego, zarówno podczas spotkań świeckich, jak i tych w synagodze.

Szacunek, jakim obdarzyli Moszego Alperta, wziął się z wyświadczanej im przez niego pomocy i wielkiego zaangażowania w sprawy bielskiego ziomkostwa. Dzięki jego staraniom doszło do wydania w 1975 roku w Tel Awiwie „Księgi Pamięci Żydów z Bielska Podlaskiego". Oficjalnym i „zawodowym" redaktorem „Księgi" był Chaim Rabin (1910-1990), który urodził się w Łanowcach (obwód tarnopolski na Ukrainie) i nie był rodzinnie związany z Bielskiem. Stowarzyszenie Imigrantów z Bielska w Izraelu zwróciło się do niego z pomocą w zredagowaniu „Księgi Pamięci" (Chaim Rabin był redaktorem ponad dziesięciu ksiąg pamięci, m.in. Wiśniowca, Szumska, Łanowców, Leżajska i Miechowa Lubelskiego). Jednak to Mosze Alpert był głównym inicjatorem powstania „Księgi Pamięci Bielska Podlaskiego" i to on zabiegał o to, aby bielszczanie spisywali swoje wspomnienia, aby pamięć o ich rodzinnym mieście przetrwała. Obok niego w komitecie redakcyjnym zasiedli jeszcze inni Żydzi pochodzący z Bielska: Aron Steinberg, Dawid Mełamiedowicz i Ruben Orzycki (Użycki?). W posłowiu do „Księgi Pamięci" zapisano: „Od roku 1925 bielszczanie znali dom Mosze Alperta jako siedzibę komitetu służącego przybyszom z Bielska; tutaj jednostki scalały się unią braterstwa i wzajemnej pomocy. I tutaj podniesiono potrzebę założenia zinstytucjonalizowanego ciała bielskiego, które będzie pierwszym adresem dla grupujących się i zmierzających do Kraju po Wielkiej Zagładzie; ciała, które zjednoczy ich unią wspólnej pamięci i wspominania imion ofiar Zagłady."

Po wojnie Mosze Alpert utwierdził się w przekonaniu, że Żydzi powinni emigrować do Palestyny i nigdy nie wracać do kraju swojego urodzenia. Po okrucieństwach wojny ani on, ani jego rodzeństwo nie myślało o odwiedzeniu miasta, w którym przyszli na świat i się wychowali. Miejsce, które było dla nich tak drogie przestało istnieć. Mosze Alpert tylko raz wyjechał z Izraela – w 1951 roku udał się na dwa miesiące do Stanów Zjednoczonych w odwiedziny do swoich sióstr.

Jak wspomina Lila Lowell, Mosze Alpert nie był w stanie mówić o Bielsku, szczególnie po tym, jak dowiedział się, co spotkało jego rodzinne miasto i jego żydowskich mieszkańców. „Było to dla niego bardzo bolesne. Podobnie jak moja mama miał poczucie winy, że jego życie zostało oszczędzone i nie oglądał horroru niemieckich egzekucji. Wujek Mosze miał do Bielska podobny sentyment jak moja mama, Chawa Alpert-Gelbart. Przy wielu okazjach opowiadała mi o Bielsku, w taki sposób, że sama się zakochałam w tym miasteczku z jej opowieści, choć nigdy w nim nie byłam. Mama mówiła, że Bielska był pięknym miasteczkiem zamieszkałym przez mniej niż 10 tys. mieszkańców. Miał brukowane ulice i chodniki, które były utrzymywane w wielkiej czystości. Bielsk otoczony był przez lasy, ludzie byli serdeczni. Mówiła też, że Bielsk, inaczej niż inne okoliczne miasteczka, był bardzo postępowy. Znajdowała się tam stacja kolejowa, wychodziła gazeta i były dobre szkoły. Mama często opisywała swoich bielskich przyjaciół, ale w pewnym momencie zatrzymywała się i mówiła: Bielsk już nie istnieje. Wszyscy, których znałam zostali zamordowani."

Wojciech Konończuk

Artykuł powstał głównie w oparciu o informacje uzyskane od Lili Lowell z Izraela oraz innych Żydów bielskich lub ich potomków, którzy znali Moszego Alperta.

З рукапіснай спадчыны

Куліг у Мокрэ, 6-7 лютага 1988 года

У час зімовых канікул удалося мне ўдзельнічаць у цікавым мерапрыемстве. Шостага і сёмага лютага „парнасаўская" маладзёж сарганізавала куліг. Хаця гэтая імпрэза трывала так коратка, варта аб ёй напісаць.

Смела можна зарызыкаваць сцвярджэнне, што была яна ўданая. Апрача нас, „старых парнасаўцаў" удзельнічала ў ёй дзесяціасабовая група вельмі вясёлых і энергічных вучняў з бельскай „тройкі" з іх настаўніцай беларускай мовы Марыляй Базылюк, а таксама дзве новыя асобы з белліцэя ў Бельску, якіх удалося зацягнуць.

Хаця надвор'е было ненайлепшае, дзе-недзе размок снег і кепска было ехаць, панавала вясёлая атмасфера. Зноў, як у час рэйдавых дзён, беларускія, родныя песні несліся па палях і лясах, выціскаючы слязінкі ў нашых вачах. На гітары прыгрывалі: Валодзя Сахарчук, Эля Бэзюк, а таксама Дарэк Фёнік. Іх заслугай гэта тое, што песні былі больш цудоўнейшымі, больш багатымі. Трэба ўспомніць пра вучняў беларускага ліцэя ў Гайнаўцы, без якіх куліг не быў бы кулігам. Сардэчнае ім дзякуй за тое.

Фініш нашай імпрэзы адбыўся ў Мокрым, вёсцы, якую ўжо мы маглі добра пазнаць у час першага рэйду. Там, у цёплай хатцы (бацькоў Славіка Філіпюка – рэд.) мы маглі больш пазнаёміцца з сабой, пагаварыць, а таксама супольна паспяваць. Адзін ад другога навучыліся мы многа песен. Гульні трывалі да позняй ночы. Змучаныя палажыліся мы спаць. На жаль на другі дзень удзельнікі кулігу паехалі дамоў.


А цяпер мае ўласныя рэфлексіі. Па-першае: такія мерапрыемствы як куліг ці рэйды пазваляюць пазнаць многа цікавых людзей, новыя песні, а таксама прыгожыя куткі нашай Беласточчыны, а ёсць іх вельмі многа.

Па-другое: у час падобных імпрэз можна супольна ці асобна задумацца над нашым беларускім рухам, яго магчымасцямі і перспектывамі.

Альжбета Томчук
(вучаніца беларускага ліцэя ў Бельску)



На кулігу ў лесе Мокрэншчыне; першы злева Юрка Ваппа, шостая злева Марыля Базылюк, 9 злева Маргарыта Дмітрук



18 сакавіка паміж Савецкай Расіяй і Польшчай была падпісаны Рыжскі мірны дагавор. Заходняя Беларусь апынулася ў складзе Польшчы. Паводле новага адміністрацыйнага падзелу Кобрын становіцца цэнтрам павета ў складзе Палесскага ваяводства. У Кобрынскі павет уваходзяць пазнейшыя раёны: Кобрынскі, Жабінкоўскі, Дзівінскі. Па дадзеных на 1930 – 1939 год насельніцтва горада складала каля 11000 жыхароў.

Эканамічны стан

У горадзе дзейнічалі наступныя аб’яднанні: Акружное таварыства земляробаў, Акружны звяз сельскагаспадарчых гурткоў, Звяз гандляроў, Звяз уладальнікаў магазінаў у гандлёвых радах, Таварыства рамеснікаў, Звяз краўцоў. Гандлёвымі днямі быў панядзелак і чацвер. Кірмашы традыцыйна ладзіліся 10 і 30 дня кожнага месяца.

Прыватнай практыкай займаліся: 6 лекараў, 1 фельдшар, 4 дантысты, 3 акушэркі, 2 ветэрынары. Была 1 аптэка і ў той жа час – 4 аптэкарскія склады. Інтарэсы гараджан абараняла 6 адвакатаў. Не гультайнічалі 7 бюро прашэнняў і перакладаў ды 3 экспедыцыйных бюро. Для культурнага баўлення часу было 2 кінатэатры. Мелася таксама невялічкая друкарня, якая друкавала газетку для прадпрымальнікаў „Кобрынер штымме” (Кобрынскі голас). Акрамя таго варта дадаць 4 фотамайстэрні і 7 цырульняў. Разам з трома рэстаранамі дзейнічалі 2 сталоўкі, 9 чайных, 6 кавярняў і столькі ж піўных. Продажам спіртных напояў і тытунёвых вырабаў займалася 7 гандлёвых пунктаў. Акрамя таго дзейнічала па адной спецыялізаванай краме проджаы алею, садавіны і малочных вырабаў. Найбольшую колькаць сярод крамаў займалі харчовыя – 120. На другім месцы быў галантарэйны гандаль – 25 крамаў. Кнігарняў было 5, крамаў з канцэлярскімі прыладамі і паперай – 1, кухоннай посудай – 9, тканінамі – 26, тэкстылем – 10. абуткамі – 3 і столькі ж абутковай фурнітуры. Былі па дзве крамы пашытага адзення, насення і хімічных угнаенняў, фарбаў, швейных машынак. Па адной краме – дрожжаў, мэблі, ювелірных вырабаў. Былі два аптовыя склады для зерня, 2 – для солі, 4 – для дрэва, 1 – для вапны.

Нягледзячы на малую колькасць працаўнікоў, прадпрыемствы горада мелі назву фабрык і заводаў. Сярод іх: 3 цагельні, 3 паравыя і маторныя млыны, 2 ветракі, 2 мылаварныя прадпрыемствы, 2 па вытворчасці газаванай вады, 1 свечны завод, 1 па вырабе вапны і фабрыка гільз. Сярод рамесніцкіх майстэрняў варта назваць наступныя: слесарная, па рамоце веласіпедаў, панчошная майстэрня і майстэрня па вырабе бялізны на заказ. Большасць рамеснікаў працавалі самастойна, ва ўласных кватэрах, кліентаў абслугоўвалі з дапамогай чальцоў уласнай сям’і. Толькі меншасць высокакваліфікаваных спецыялістаў дадзенай галіны выкарыстоўвалі наймітаў і тое ў колькасці да 10 чалавек. Першае месца па колькасці наймітаў належыць краўцам, пасля было 35 майстэрняў з наймітамі-шаўцамі, 9 – апрацоўшчыкаў футра і 8 – скуры, чапнікаў – 7, а дамскія каптуркі выраблялі 2 майстэрні. Было каля



Жанчына з Кобрыня, к. 1910 г., фота з атэліе Гольцмана; са збораў Гістарычнага музея ў Кобрыню

13 кузняў, а конскую вупраж выпрабляла ўсяго 7 майстэрняў. Было 6 майстраў па рамонце гадзіннікаў, 4 – калеснікаў, 2 столяры, 2 – майстроў па вырабе кошыкаў [1, с. 4].

Такім чынам можна заключыць, што ў горадзе па-ранейшаму не было буйных прадпрыемстваў. На дробных фабрычках былі заняты працай усяго 402 людзей. Галіны прамысловасці былі тыя самыя, што існавалі здавён: вытворчасць цэглы і чарапіцы, апрацоўка скуры, лесапілаванне. Дзейнічалі невялікія майстэрні па вырабе папіросных гільз, мыла, свечак, вяроўкі, па рамонце мэблі, веласіпедаў і швейных машынак, хлебапекарныя і кандытарскія ўстановы. У саматужных майстэрнях, як правіла, з адным работнікам было занята каля 300 чалавек. Нязначная колькасць чалавек займаліся рамізніцтвам, сезонна працавалі ў агароднікаў, на сплаве леса па Мухаўцы [2, с. 88-89].

Яўрэйскае мястэчка

У XIX ст. Кобрын уваходзіў у так званую „мяжу аседласці” – пражыванне яўрэяў у гарадах і мястэчках. Ім паводле закону забаранялася жыць у вёсках і займацца земляробствам. Акрамя таго – займаць дзяржаўныя пасады. Па дадзеных перапісу 1897 года ў Кобрыне пражывала 10365 асобаў, у тым ліку яўрэяў каля 6500, праваслаўных 2500, каталікоў 683. Усіх дамоў было 850. Па дадзеных з 1907 г. было 8751 жыхароў, у 1921 г. – 8200, у 1931 г. – 10277, а ў 1939 г. каля 11.000 жыхароў [3, с. 1].

У выніку надзвычайна цяжкіх эканамічных умоў і шматліках абмежаванняў вялікая колькацць яўрэйскага насельніцтва на пачатку XX ст. эміґравала за акіян, дзякуючы адсутнасці візавага рэжыму. У ЗША ўзнікла вялікая супольнасць кобрынскіх яўрэяў, якія пазней выдалі двухтомную гісторыю кобрынскага яўрэйства. Вось што піша Батцалел Шварц, адзін з аўтараў гэтай кнігі пра Кобрын і яўрэяў пачатка XX ст.: „Кобрын не быў мегаполісам, але гэта і не маленькі горад. У яго былі ўсе плюсы вялікага горада разам з цеплынёй і ўтульнасцю малога. Той факт, што ён знаходзіцца на памежжы трох дзяржаў таксама пайшло яму на карысць. Душэўныя выпраменьванні Літвы і блізкаць Валыні і Польшчы дапамаглі стварыць асаблівы кшталт яўрэя. Яўрэі Кобрына былі ўзорам для яўрэяў Вільні



Пячатка атэліе Фішэля Гольцмана, к. 1910 г.



Літаграфія кобрынскага фатографа Г. Эпельбаўма



Літаграфія атэліе Фішэля Гольцмана, к. 1910 г.

і Варшавы, што можна дадаць да культуры і характару. Асіміляцыя не была моцна распаўсюджана ў Кобрыне, як у іншых месцах, праўда распачалася" [4, с.7].

А. М. Мартынаў, вядомы ў Кобрыне гісторык, вызначае найбольш характэрнай рысай яўрэяў – паталагічнае памкненне да ўсеагульнай нацыянальнай адасобленасці. Панічны страх перед асіміляцыяй. Пагэтаму змешаныя шлюбы з'яўляліся вялікім выключэннем. Імкненне да самаізаляцыі даходзіла да ўтварэння нечага падобнага да самадзейнага гета [5, с. 2-3]. Спрадвеку яўрэйскія дамы складалі асобныя вуліцы ці значную частку вуліцы. Іссак Пінчак у сваіх успамінах каментуе гэты факт тым, што яўрэі былі вымушаны жыць на спецыяльных вуліцах па псіхалагічных прычынах. Так было прасцей даць супраціў у выпадку спробы ліквідаваць яўрэйскае этнічнае насельніцтва [4, с. 9].

Яўрэі Кобрына мелі сваё адміністратыўнае кіраванне – кагал. Свае школы з рэлігійным ухілам – хедэры, свае могілкі – кворыс, свой шпіталь, лазню, асобнае аддзяленне на разніцы жывёлы, што дапамагала выконваць кулінарныя прадпісанні Талмуда. Аграмадным маральным аўтарытэтам карысталіся духоўныя асобы: равіны, настаяцелі сінагогі і шматлікіх малітоўных дамоў. Духоўным цэнтрам была цэнтральная сінагога. Пабудаваная на месцы больш старой „школы жыдоўскай", якая знаходзілася на вул. Пінскай.

Без перабольшвання можна сказаць, што яўрэйская частка насельніцтва ўплывала на ўсе сферы эканомікі. Найперш яўрэі мелі манаполію на гандаль. Асноўная частка заселеных дамоў, пры-

чым цагляных, якія знаходзіліся ў цэнтры тагачаснага Кобрына належалі яўрэям. Штадзённы гандаль жа праходзіў у крамах, якія былі размешчаны на першых паверхах дамоў. Кірмашы на Гандлёвай плошчы праходзілі толькі двойчы на тыдзень.


Для разумення сутнасці яўрэйскай манаполіі дастаткова пералічыць прадпрыемствы, якія ім належалі: лесапілка (найбуйнейшае прадпрыемства па колькасці працоўных), тры паравыя млыны, тры цагельні, ўся гасцінічная справа, абедзьве друкарні, мылаварны, свечны заводы, фабрыка папіросных гільзаў і інш. Манаполіяй яўрэяў была ўсялякая дзейнасць як пасрэднікаў, асабліва скупленне і перапродаж прадуктаў рамеснай і сельскагаспадарчай вытворчасці.

„Валагуламі" ажыццяўляліся міжгароднія перевозкі на невялікія адлегласці. Па горадзе лёталі таратайкі з фурманамі-яўрэямі. Пачынаючы з краўцоў, шаўцоў ды гадзіншчыкаў, кавалёў, бляхароў, слесараў, рымароў – паўсюль пераважала яўрэйскае насельніцтва. Майстэрства іх было па за канкурэнцыяй. Яны ж фатаграфавалі, працавалі цырульнікамі, дэманстравалі фільмы, урэшце рэшт – лячылі. Лепшыя лекары таксама былі яўрэямі. Для поўнага адлюстравання стану варта дадаць, што ў горадзе функцыянавала некалькі яўрэйскіх банкаў, а чытачоў абслугоўвала бібліятэка імя Брэнера з кніжным фондам 1400 экзэмпляраў і 175 чытачамі [6. с. 3].

Мяшчанскае, хрысціянскаяе насельніцтва ў асноўным пражывала на перыферыйных вуліцах і мірна суіснавала разам з яўрэскімі сем'ямі. Нямала спрытных мешчанчукоў, якіх называлі „шабесгоі", выконвалі за ўзнагагароду дробныя даручэнні яўрэяў у дні Шабаса і іншыя святочныя дні і дастаткава добра маглі размаўляць на ідыш. У той жа



Марыя Крыцкая ў 1939 г.; фота з атэліэ Ф. Гольцмана; са збораў Марыі Крыцкай



час няяўрэйская частка насельніцтва добра ведала ўсе асноўныя яўрэйскія святы і ўлічвалі іх падчас гандлёвых і іншых стасункаў.

Гісторыя адной фотамайстэрні

Таццяна Уладзіміраўна Доўгая, супрацоўнік аддзела перспектыўнага праектавання ААА „Басфорская кампанія" гаворыць:

„На пачатку XX стагоддзя ў Кобрыне павінна было быць 6 фотамастакоў, бо пасля 1939 года, калі былі арганізаваны арцелі я сустракала ў дакументах, што фатаграфічную арцель складала 6 чалавек. Пакуль што знайшла імёны толькі чатырох з іх: Гольцман, Эльпібаум, Карульскі, Мілер. З літаграфіяй фотамайстэрні Гольцмана сустракаўся кожны, хто гартаў кнігу



Марыя Крыцкая сёння; фота аўтара

„Памяць. Кобрынскі раён”. На жаль, да ілюстрацыі гэтай літаграфіі няма ніякіх каментарыяў. З іншых крыніц магу сказаць, што літаграфію магла сабе дазволіць не ўсялякая майстэрня. Літаграфіі на той час выраблялісяя мала ў якіх гарадах. Сярод іх можна назваць Варшаву і Вільню. Калі не памыляюся, то на дадзенай літаграфіі ёсць подпіс „Вільня”. Такія літаграфіі былі на адваротным баку фатаздымка. Па тых выявах, што мы бачым на верхняй частцы малюнка, можам меркаваць, фатаграфіі якіх знакамітых людзей былі зроблены ў майстэрні. Якія ўзнагароды атрымалі працы фотамастака і ў якіх гарадах працы пабывалі на выставе. Так мы можам сцвярджаць, што фотаздымкі Гольцмана былі на выставе ў Парыжы. Гэта было дарагое, элітнае фота, дазволіць сабе якое мог не кожны гараджанін. Найбольш запатрабаваным было фота на дакументы, найбольш вядомым – салоннае фота. Для салоннага фота ў майстэрні меліся ўсе неабходныя атрыбуты: усялякія стойкі, канапы, дыванкі, рознага памеру крэслы, нават прыгожыя кошыкі для немаўлят. Асаблівасцю майстэрні было выязное фота, з мэтай захаваць для памяці родных апошнія моманты зямнога прыбыцця нябожчыкаў.

Майстэрня Гольцмана знаходзілася сярод забудовы левага берага р. Мухавец, ля маста цераз рэчку. На той час вуліца насіла імя Ю. Пілсудскага. Зараз гэта вуліца Леніна, але замест будынка – пустая пляцоўка.

Марыя Міхайлаўна Крыцкая, 87 год, жыхарка Кобрына з 1930 года.

„Я фатаграфавалася ў Гольцмана на дакументы пасля заканчэння семігодкі перад паступленнем у камерцыйную гімназію, што была на той час у Брэсце. У гімназію я так і не паступіла, але фотаздымак захаваўся да сённяшніх дзён. Мой бацька працаваў у яўрэя Гольдзіна. Займаўся перавозкай тавараў і зарабляў добрыя грошы, таму я магла сабе дазволіць фатаграфавацца там, дзе пажадаю”.

У Марыі Міхайлаўны засталіся вельмі прыемныя ўспаміны пра сам працэс фатаграфавання ў майстэрні Гольцмана:

„Фатаграфавала мяне маладая жанчына (хто яна было М. М., на жаль, не ведае. Па здагадках Т. У. – жонка Рыўка). Яна ўмела так пасадзіць, так навесці сваю апаратуру, што чалавек атрымліваўся на фота самым лепшым чынам. Пасля таго, як яна мяне пасадзіла, пачала варушыць фіранкі з тканіны, якія былі за мной. Яна так умела варушыць гэтыя фіранкі, што фотаздымак пасля атрымліваўся вельмі прыгожым.

Вясельны фотаздымак маёй матулі – таксама з фотамайстэрні Гольцмана. Толькі рэтушаваўся ён ужо ва Львове. Татаў вясельны фотаздымак быў зроблены ў іншай майстэрні”.

Марыя Міхайлаўна пацвердзіла месцазнаходжанне фотамайстэрні Гольцма-

на ля маста і дадала, што знішчаны быў гэты будынак у 1944 годзе падчас падрыва маста.

Павел Дзмітрыевіч Гілевіч, 88 год, карэнны жыхар Кобрына: „У Гольцмана я не фатаграфаваўся, таму што гэта было вельмі дорага для нас. А такі фатограф у Кобрыне сапраўды быў, вельмі вядомы".

Яго жонка Алена Гілевіч, 87 гадоў: „Я фатаграфавалася ў Гольцмана пасля заканчэння сямігодкі. Памятаю як зараз, як круціла валасы на коскі, каб крыху курчавыя атрымаліся. Фатаграфавала мяне жанчына. Пасадзіла, валасы мае так прыгожа паклала, каб бачна было, што яны крыху курчавыя. А пасля фіранкі туды-сюды варушыла. Фатаздымак той не захаваўся, згубіўся недзе".

Адкуль быў родам Гольцман, колькі год пражыў у Кобрыне, калі памёр, ніхто з апытаных не ведаў. Засталіся толькі здагадкі даследчыка, ўзгадка сям'і Гольцман у рэквіеме па кобрынскіх яўрэях у кнізе



Дзяўчына з 1936 г.; са збораў А. Гілевіч



Кобрынскія вучаніцы, фатаграфія з атэліе Ф. Гольцмана; са збораў Алены Гілевіч



Павел і Алена Гілевічы ў сваім доме; фота аўтара

“Адрэзак часу ад жыцця да знічтажэння” [4, с.] і некалькі фотаздымкаў у сямейных архівах…

P. S.

Пачатак канца звыклага ладу жыцця для кобрынскага яўрэйства надыйшоў у 1939, пасля далучэння Заходняй беларусі да БССР. Новая ўлада незамаруджальна знішчыла галоўны занятак яўрэяў – прыватны гандаль. Знішчаны ён быў хутка празмернымі падаткамі і іншымі рэпрэсіўнымі мерамі. Рамеснікаў-прыватнікаў аб’ядноўвалі ў арцелі. Так было зруйнаванае яўрэйскае рамесніцкае прадпрымальніцтва ў Кобрыне. Самыя ж яўрэі былі цалкам знічтожаны ўсяго праз некалькі год, падчас фашысцкай акупацыі.

У першыя дні акупацыі наўмысна быў падпалены яўрэйскі малітоўны дом. Загасіць вогнішча не дазвалялася, пакуль не ўзнікла небяспека для хрысціянскіх дамоў. Так знік цалкам цэлы квартал паміж вуліцай Кастрычніцкай і Інтэрнацыянальнай.

Масавае знічтажэнне яўрэйскага насельніцтва пачалося з ліпеня 1941 года, калі было расстраляла калі 200 чалавек ля в. Патрыкі. У чэрвені 1942 года ля станцыі Бронная Гара знішчана каля 2000 насельнікаў „гета-Б”, а ў лістападзе таго ж года іх лёс напаткаў вязняў „гета-А”, колькасць якіх перабольшвала 4000. Каля 100 яўрэяў змаглі збегчы з гета перад самым расстрэлам і далучыцца да партызанскіх атрадаў імя А. Суворава і К. Варашылава [7]. У снежні 1943 г. былі расстраляны апошнія яўрэі, 73 першакласных спецыялістаў, якіх адмыслова прытрымлівалі для выканання спецыяльных заданняў у кобрынскай турме.

Таццяна Некрашэвіч
фота: ***аўтара***

Спіс выкарыстанай літаратуры:
1. А.М. Мартынаў. - За сухімі лічбамі. - Кобрынскі Веснік. - №20-22, 1998.
2. Памяць. Кобрынскі раён. – Мн.: Беларуская энцыклапецыя. 2002
3. О Кобрине. 1939 год і прошлое. Дакументы составлены музеем им. Суворова в г. Кобрине. – зборнік документаў.
4. Адрэзак часу ад жыцця да знічтажэння – Сан-Францыска, 1991.
5. А. М. Мартынов. – Полонизация, русификация и прочие “зации”. История глазами современников. – Кобынскі веснік. – № 16, 1996.
6. А. М. Мартынов. Памяти кобринского еврейства Кобрынскі веснік. - №9, 1993
7. Яўрэйская электронная энцыклапедыя

Tekst powyższy Tatiana Niekraszewicz zreferowała na seminarium „Ziemia Bielska i Kobryńska – związki historyczno-kulturalne”, które odbyło się w Studziwodach 5 maja 2012 r. Postać fotografa Fiszela Golcmana jest właśnie jednym z przykładów tych związków. Fotograf praktykował w Bielsku w latach 1894-1898. Ale jego szkoła fotografii przetrwała znacznie dłużej. Przed przeniesieniem się do Kobrynia, bielskie atelier Golcman przekazał swemu uczniowi Dawidowi Botkowskiemu. Atelier Botkowskich funkcjonowało do I wojny światowej i należało do najlepszych w guberni grodzieńskiej.



Коровайі і вершы Марыі Кірылюк

В час фестывалю „Там по маёвуй росі”, два разы наш музей і Пудляшэ одвіе̇дала Марыя Кірылюк з Камэня Шляхэцкого на Кобрыншчыні. Педагог, деяч культуры, поэт і авторка нэповторных вэсіе̇льных і святочных короваюв. Одін з іх Марыя Кірылюк вручыла особісто нашому Владыці, мітрополіту Саві, в час юбілейных урочыстосці цэркві в Токарах.

Марыя Кірылюк роділасе в сэліе Бельск, которэ находіцце 25 кілёмэтрув на пувдэнь од Кобрыня. Любіт своіе руо̇днэ сэло, одкуль вынэсла мову, піе̇сні і народны обрады. Іх жэ прывэзла до Камэня Шляхецкого, дэ засновала фольклорну групу, выкорыстувала в школьнуй роботі. Бо была дырэктором тутэйшуй школы. І тэпэр, пэрэшовшы на эмэрытуру, далей актывно уділяецце в жыццю вёскі і тутэйшого православного, Покровского прыхода. Дэрэвянну цэркву побудовалі тут в міе̇ждувоенны час, колі настоятелём быв о. Фёдор Огіевіч, які раней служыв в нашуй Вуо̇рлі.

Любіті руо̇днэ Марыя Кірылюк научыла і своіх діті. Дочка Іна Сахарчук музыкант, кіруе Домом Культуры в Камэню Шляхецкім, вэдэ шкуо̇льны, дітячы колектыв. В роботі помагае юй брат Віталь. А дочка Іны – Юлія Сахарчук закунчыла Універсітэт Культуры в Мінскові і тэпэр працюе в пуодмінскім скансэнові в Строчыцах. Тые, хто лятось бывав на фестывалю „Там по маёвуй росі”, напэвно запомэталі ейі солёвы піе̇сні.

Марыя Кірылюк вэльмі таленовіты творца росказув, вершув, пісэнь і казок. Пішэ як на своюй, полескуй мові, так і на мові белорускуй. Ейі піе̇сні співае нэ туо̇лькі фольклорна група з Камэня, нэкоторы сталі вжэ народнымі.

В час жнівнуй візыты в Студзіводах пані Марыя подаровала мніе сшыток, які затытуловала „На добры ўспамін паважанаму пану Дарафею ад удзячнай Беларускі з в. Камень-Шляхецкі (ур. в. Бельск) Кірылюк Марыі Андрэеўны – мае рукапісныя творы”. Варто, коб нашы чытачы познакоміліся з ейі твуо̇рчосцю. В сіе̇тым нумэрові друкуем росказ про Бельск, пару вершув, пісэнь і казку.

Дорофей Фіонік

Запозненае прызнанне
(пра родны Бельск)

Любая мая прыгажуня, найцудоўнейшая мастачка, таленавітая і нястомная працаўніца, найлагаднейшая і пяшчотная маці! Даруй, што ў шчырай любові да цябе прызнаюся, калі скрані мае збяліла сівізна – няўмольны адбітак часу, жыццёвых нягод. Але гэтая вялікая, шчырая і моцная любоў, светлая, як дзіцячыя сны, заўсёды жыве ў маім маленькім сэрцы, якое баліць да цябе, хвалюецца і сумуе, калі табе гаротна і цяжка, радуецца тваімі поспехамі, здабыткамі і славай, любуецца тваім багаццем і хараством.

Ты – маё натхненне і сіла, мая невычэрпная жыватворная крыніца і сэнс майго жыцця.

Я лёгкакрылаю думкаю сваіх мар лячу

да цябе на спатканне, клічу цябе ў снах і наяву ў самы радасны і шчаслівы час і ў час адчаю, адзіноты і смутку. Веру, што і ты не абыякавая да мяне, спадзяюся на ўзаемнасць.

Лёс разлучыў нас. Але ніякі час не здолеў згасіць маіх пачуццяў да цябе, сцерці з памяці твой чароўны і таямнічы вобраз, заглушыць твой мілагучны голас і непаўторны асабісты пах, разарваць наша духоўнае адзінства. З табою звязана ўсё самае мілае і дарагое, светлае і чыстае, незабыўнае і святое, няхай сабе і нялёгкае, але ж навек маё. Я заўсёды адчуваю тваё прыемнае пяшчотнае дыханне, тваю чарадзейную сілу, тваю надзейную падтрымку, твой дакорлівы, патрабавальны і строгі позірк, бачу твой вясёлкавы колер і незабыўныя прасторы. 14 гадкоў мы былі неразлучнымі. А потым... расстані, часовыя сустрэчы. Кожная новая сустрэча з табой перапаўняла маё сэрца гордасцю да цябе, за тое, як ты мужаеш, расцеш, развіваешся, харашэеш і багацееш з года ў год. Ты цярпліва пераадольваеш усе цяжкасці жыццёвых складанасцяў, бо умееш разважаць, цярпець і спадзявацца.

З цягам часу сустрэчы выдаваліся ўсё радзей. Вось і загубілася так на доўга маё прызнанне. Але ж лепш позна, чым ніколі. Кланяюся табе нізка, малю за цябе ўсіх Святых і жадаю табе столькі шчасця, як на небе зор, здароўя, радасці, весялосці, мудрасці, празарлівасці і вечнасці, любоў майго жыцця, калыска майго дзяцінства, зямля маіх бацькоў, мая незабыўная любая і родная вёска Бельск. Гэта табе прысвечана маё запозненае прызнанне. Гэта ты – мая надзейная прыстань, невычэрпная крыніца мудрасці і прыцягальнай сілы.

Кожны дзень босаю памяццю крочу я тваімі роснымі сцяжынкамі. З першым сонечным праменьчыкам пасылаю табе сваё сардэчнае прывітанне і зычу светлага дня і лагоднага лёсу.

Будзь жа ты заўжды благаславёная людзьмі і небам..

Я нарадзілася ў в. Бельск на Кобрыншчыне. Вёску сваю вельмі люблю. Ёй прысвяціла сваё апавяданне „Запозненае прызнанне", якое сёння дарую польскаму г. Бельску. Веру, што такую любоў да свайго Бельска выношваюць і жыхары гэтага горада. Хай жа будзе маё прызнанне на добры ўспамін і ў знак маёй павагі да ўсіх палякаў, і няхай будуць пабрацімамі гэтыя два Бельскі.

18.05.2012 г.

Покров Богородіцы

Богородіцэ, Богородіцэ,
Ты надія моя і любов.
Ты возьмі мэнэ, Богородіцэ,
Под святый, благодатный покров.

І Жыровыцку і Владімырску,
І Казанскую в сэрцы ношу.
Я і Мінскую і Почаевску
За грыхы нас простыты прошу.

Мныго есць ікон, образів Твоіх
Чудотворных, святых, дорогых.
Благодатная ты одна на іх
І Господь найсвятейшій за всіх.

Мы поклон Тобі свій прыносымо
І молітвы своі знов і знов.
І всім міром мы тэбэ просымо
Взяты нас под зашчытный Покров.

Білорусы

За сарочкы нашы білы
І за косы світло-русы
Нас так мыло называють:
Працювыты білорусы.
А хыба ж ны працювыты?

Головы в платы завыты,
На сорочках вышыванне,
І мырэжка, й натыканне.
Хвартушкы і андаракы
Нашы бабкы – ныборакы
Так любовно выроблялы
І для нас йіх прыхавалы.
Мы йіх зараз одываем
І пісні для вас спываем
Ныхай знають й нашы діты
В шчо колысь булы одіты,
Як спывалы, танцювалы,
Про шчо думалы-гадалы,
Як дары зымлі цынылы
І дытэй своіх учылы:
Хочэш шчасце в жызні маты –
Ны лыныся працюваты.

Святый напомын (пісня)

Кудыб ты ны йшов,
У якую б ны йіхав дорогу
З собою на память
Святый напомын возьмы:
Запах рідного бору, молітву до нэба
І жмэньку свэі зэмлі.

На гэтуй зэмлі народывся
Колыся твій прадід,
На гэтуй зэмлыцы народылыся ты і я.
Хай жэ будэ выкамы вона бэрэжона
Гэта наша рідна зэмля.

І в сэрцы твоїм жыты надія на тое,
Шчо зможэм колыся
Вырнутыся знов туды,
Дэ твоїі корэні, і батькы, і родына,
Дубравы, поля і сады.

Дэ в дэнь і в ночі
Там про тэбэ усі спомынають
І молять святых,
Шчоб всюды хранылы тэбэ,
Часто бачать у снах
Воны тую стэжынку,
Шчо додому тэбэ прывэдэ.

За хліб на столі (пісня)

Задумайся сам і другых попытайся,
Послухай шчо скажуть тебі
В чым шчасце, в чым шчасце
В чым шчасце людэй на зэмлі.

Колы есць сымьіця, і батько, і маты,
Здоровы всі блізкы твоі
І свіжый, і свіжый, і свіжэнькый
Хліб на столі.

За лад в кожнуй хаты,
За тое, шчомаем,
Подякуем шчыро зэмлі
За шчасце, за шчасце,
За шчасце, за хліб на столі.

Дружнэнько наллем
І поднымэм высоко
Заздравні кубкы свойі
За шчасце, за шчасце,
За шчасце, за хліб на столі.

Выйшла я на тое полэ

Выйшла я на тое полэ
Дэ лёнок ростэ.
Запытала свэі долы:
Дэ мій мылый, дэ?

Дав мні лён на довгы літа
Свою красоту,
Чарамы сыпнув своемы
На мою косу.

Платом білым і шчаслывым
Голову накрыв
І мэнэ на добру долю
Він благословыв.

Там нашла я свое шчасце
І свою судьбу,
Бо за хлопця мылэнького
Замуж я іду.

Светлая мара

Я жыву на Палессі, дзе дубы векавыя,
Дзе купаецца сонца ў расе,
Дзе гамоняць таполі,
Нібы сведкі жывыя
Дзе крынічка аб шчасці пяе.

Дзе з глыбінь жыватворных
Даўніна выплывае
І ляціць на далонькі мае,
Запаветную мару ў маё сэрца ўсяляе
Захаваць для патомкаў яе.

Лёгкакрылая мара,
Ты ляці ў паднябессе,
Адшукай там падтрымку сабе,
А калі адшукаеш, тады напрадвесні
З добрай весткай вярніся да мяне.

Нашых продкаў багацці
Я па крохах збіраю
І ў скарбонку складаю сабе,
Старадаўнія песні любоўна спяваю
Мая мара, не здраджу табе!

Хата прадзеда

Слава Богу ўсім, хто ў хаце
І ў Чырвоны кут!
Так вучыла мяне маці,
Так вядзецца тут.
Некалі тут жыў мой прадзед,
Марыў, і любіў, і працаваў,
Аб сабе нязгаснае ў вяках
Добрае ўражанне складаў...
Хата з абразамі,
Вокны з ручнікамі,
Дзежка, цэбрык і малочны збан,
Печка з качаргою, шчарбаты саган...
Доўгія спадніцы, хусткі з кутасамі,
Фартушкі, сярмягі з лапцямі,
Вышыты сарочкі, поясы натканы,
Кажухі, латушкі, платы прыхаваны
Гэтыя здабыткі сэрцы зашчамляюць;
Не губляюць моцы і красы,
Бо яны сабою ўваскрашаюць
Нашых даўніх продкаў галасы.

Гусак (байка)

Выхваляўся раз гусак,
Што ён вельмі важны:
І прыгожы і дародны,
Дужы і адважны.
Шыю доўгую сагне,
Галавой пакруціць
Дзе ні з’явіцца, заўжды
Нешта каламуціць:
Верабей – зусім малы,
Грак занадта чорны,
Індзюк брыдкі і тупы,
Певень – не праворны.
Качачка не так ідзе,
Салавей – спявае
Усіх і ўсюды з важным відам
Гусак дакарае.
Так і ходзіць дзень пры дні,
Плёткі свае зводзіць,
То кагосці ўшчыпне,
То камусь пашкодзіць.
То за штосці дакарае
Бедную гусыню.
Выстаўляе на паказ
Ён сваю гардыню.
Ды тут рыжая ліса
З лесу выбягае,
І каго б тут прыхапіць
Думае – гадае.
Небарака – качачка
Блюхнулася ў рэчку.

Пеўнік скокнуў на масток
І закукарэкаў.
Верабейка паляцеў –
Памінай як звалі.
Ды і грак не зявака,
Каб яго кусалі.
А дародны той гусак,
Што так ганарыўся,
Перад рыжаю лісой
Раптам разгубіўся.
А, папаўся, галубок!
Знай, як выхваляцца!
Я табою, хвастуном,
Буду частавацца!
Трэба ведаць, гусачок,
Перш чым выхваляцца,
Незалішне навакол
Часам азірацца.
Людцы добрыя мае,
Прашу прабачэння,
Ды бывае й сярод нас
Гэткае стварэнне.

Мы булы на фестывалі

Мы булы на фестывалі
"По маёвуй росі"
І за гэто Дорофею
В Бога щасця просым
І сэмьі його, й родным
І пану Томашу
Выражаем благодарность
Белоруску нашу.
Щасця – долы всім жылаем
І любві, і згоды.
Ныхай завшы в дружбы будуть
Нашы два народы.

Марыя Андрэеўна Кірылюк



15 лістопада 2012 р. група поломнікув з Бельска Пудляшского побывала на юбілею 5-летія освяшчэнія св. Ілінскуй цэркві в Бельску кобрынскім, одкуль родом Марыя Кірылюк. Богослужбу служыв Владыка бэрэстейскі Іоанн. На рукі настоятеля бельского храма о. Міхаіла Зарубы нашы поломнікі вручылі копію іконы Бельскуй Богородіцы.